| 1 | 2 | 3 | 4 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 6103 | 8228 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 1717 | 762 |
| по налогам и сборам | 243 | 430 | 987 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 12 | 23 |
| разных дебиторов | 245 | 220 | 273 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | 0 |
| Расчеты с учредителями | 250 | 0 | 0 |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | |
| Денежные средства | 260 | 1278 | 2358 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | 251 | 796 |
| Финансовые вложения | 270 | 258 | 258 |
| Прочие оборотные активы | 280 | | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **22713** | **32937** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **31838** | **43271** |
| **ПАССИВ** | **Коды строк** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 198 | 198 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | 240 | 240 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 240 | 240 |
| Добавочный фонд | 430 | 6124 | 10044 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -121 | 8442 |
| Целевое финансирование | 460 | 1218 | 0 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 15 | 38 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **7674** | **18962** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 14848 | 18384 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | 4382 | 0 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **19230** | **18384** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | | 0 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 4556 | 5925 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 4062 | 4207 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 189 | 33 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 1 | 472 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | | |
| по налогам и сборам | 625 | 107 | 1107 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | | 50 |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 197 | 56 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | 477 | 0 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | 477 | 0 |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | -99 | 0 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | 0 | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **4934** | **5925** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **31838** | **43271** |
| Из строки 620: долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | на начало отчетного года | на конец отчетного года |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 4556 | 5925 |
| **АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ** | **Коды строк** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | 0 | |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | 1 | 1 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | | |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | 9 | 10 |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | 648 | 134 |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | -754 | -955 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | 0 | |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | 391 | 400 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
**с 1 января 2010 г. по 30 декабря 2010 г.**

| Наименование показателей | Коды строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 66088 | 38554 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 6278 | 3479 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 59810 | 35075 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | 133 | 194 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 43664 | 27302 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 16013 | 7579 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | 1089 | 450 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 15057 | 7323 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 23906 | 14106 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 081 | 208 | 139 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 23698 | 13967 |
| В том числе: проценты к получению | 091 | 132 | 18 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | 5 | 10 |
| доходы от операций с активами | 093 | 22647 | 13712 |
| прочие операционные доходы | 099 | 914 | 227 |
| Операционные расходы | 100 | 23964 | 13968 |
| В том числе: проценты к уплате | 101 | 136 | 339 |
| расходы от операций с активами | 102 | 23067 | 13629 |
| прочие операционные расходы | 109 | 761 | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | -266 | -1 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 2275 | 1250 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 15 | 0 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 2260 | 1250 |
| Внереализационные расходы | 150 | 3567 | 1873 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -1307 | -623 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160) | 200 | 13484 | 6699 |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 906 | -307 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 116 | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+210-220) | 240 | 14274 | 6392 |
| Налог на прибыль | 250 | 3411 |

# ЛЕПШЫЯ СЯБРЫ ГАЗЕТЫ — ПАДПІСЧЫКІ І СУВЯЗІСТЫ

Галіна ТКАЧУК.

**КАМПАНІЯ ўручэння звяздоўскіх прызоў працягваецца, як і ўвесь час працягваецца падпіска на газету. І мы заўсёды рады новым сябрам «Звязды», як і пастаянным яе прыхільнікам. Такім, напрыклад, як Святлана Андрэеўна Некраш з Брэста. Яна выйграла ў нашай гульні электрачайнік і зазірнула ў карпункт яго атрымаць, ну і, вядома, пазнаёміцца. Былая настаўніца хіміі, Святлана Андрэеўна аказалася чалавекам надзвычай сціплым. Яна сказала, што ў сям'ю газета прыходзіць больш за 20 гадоў. Раней выпісваў муж, выкладчык універсітэта. А калі яго не стала, яна выпісвае нават у памяць аб ім. Ды і сама прывыкла да выдання. А тут яшчэ цудоўная магчымасць дакрануцца да роднай мовы.**

Таксама ў нас ёсць традыцыя — адзначаць падарункамі рублівых паштальёнаў, тых, якія дабіваюцца найбольшай прыбаўкі ў тыражы газеты. Таму ў Драгічын я ехала на сустрэчу з Галінай Ткачук. Але Галіна Сцяпанаўна аказалася... не паштальёнам, а аператарам сувязі. Менавіта яна з усіх работнікаў свайго вузла паштовай сувязі падпісала найбольш людзей на «Звязду».

— Працую з кліентамі, — расказвае Галіна Ткачук, — выконваю розныя аперацыі, заадно газеты рэкламую, пра падпіску расказваю. А яшчэ пасля работы з суседзямі, знаёмымі ды і проста жыхарамі дамоў сваёй вуліцы вяду тлумачальную работу наконт таго, як добра, калі газета штодня прыходзіць дадому.

Галіна Ткачук — вопытны сувязіст. Пасля заканчэння Брэсцкага вучылішча сувязі ўжо 20 гадоў працуе на пошце. Працу сваю ведае, таму і дабіваецца поспеху.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Святлана НЕКРАШ.

# САЛАМЯНЫЯ КВЕТКІ ЦВІТУЦЬ У ГАЛЫНЦЫ

**ДОМ Лілії Амяльянчык у вёсцы Галынка Зэльвенскага раёна відаць здалёк. Прыгожы, вялікі, размаляваны разнастайнымі малюнкамі, ён заўсёды вабіць вяскоўцаў і гасцей.**

«Спачатку Дом рамёствaў у нас быў у Галынцы, а цяпер яго перанеслі ў суседнюю вёску Дзярэчын. Вось туды я дабіраюся кожны дзень. Працую там ужо 6 гадоў. Вяду гурток саломапляцення. Гурток наведваюць школьнікі. А ў сваёй вёсцы пры бібліятэцы кірую яшчэ адным гуртком. Мы займаемся бісерам. Прыходзяць і дарослыя, і дзеці. А да гэтага працавала і на ферме, і медсястрой, і на іншых работах, а вось па спецыяльнасці працу так і не знайшла, хоць у свой час скончыла Кобрынскае вучылішча выяўленчага мастацтва і народных мастацкіх промыслаў. Цяпер працую па спецыяльнасці і ад гэтага атрымліваю вялікае задавальненне», — прызналася Лілія Амяльянчык.

Сапраўды, ідучы па вясковай вуліцы, мы здалёк пазналі дом народнай майстрыхі. Сцены будынка былі размаляваны беларускімі бярозамі, яркімі птушкамі, а веранда — нібы акварыум: унутры яна квітнела залатымі рыбкамі. Зайшлі ў хату. У пакоях чысціня і парадак. Усё зроблена з густам, прыгожа. У вітальні вісіць вялікі саламяны «павук», зроблены гаспадыняй. «Гэтага «павука» я перад Калядамі мяняю штогод. Бо ён забірае злых духаў, а іх назапашваецца шмат за год, таму «павука» трэба мяняць...» — расказвае Лілія Амяльянчык.

У адным з пакояў мы ўбачылі вельмі шмат саламяных кветак, зробленых рукамі вяскоўай жанчыны. Вачэй ад іх немагчыма было адвесці. Лілія ўзяла адзін кошык з кветкамі і пачала распавядаць нам пра саломапляценне. «Больш на Зэльвеншчыне ніхто не займаецца сур'ёзна гэтым. Адна я. Хаця саломапляценне як рамяство ў нашай краіне ў апошнія два-тры дзесяцігоддзі шырока развіваецца. Ім займаюцца ў гуртках, дамах рамёстваў, школах. Раней прыёмы перадаваліся з вуснаў у вусны, з рук у рукі ў межах сям'і, ад старэйшага пакалення — малодшаму. Плялі сявенькі, каробкі для захоўвання збожжа, капелюшы і г.д. Рабілі лялькі, «павукі», жніўныя вянкі... Прыёмы пляцення з саломкі — спіральнае, плоскія і аб'ёмныя вітыя пляцёнкі, ромб на крыжавіне. Нідзе ў свеце не стваралі з саломкі манументальныя творы для царкоўных інтэр'ераў — Царскія брамы, якія выраблялі сялянскія майстры, напрыклад, у пачатку XIX стагоддзя на Заходнім Палессі», — захапілася расповедам пра саломку Лілія Амяльянчык.

У кожным пакоі дома Лілії Амяльянчык ёсць яе вырабы з саломкі. Гэта і анёлкі, і званочкі, і дрэўцы, але найбольш кветак з саломкі. «Калі я працую з саломкай — я адпачываю. І дзяцей вучу, як рабіць з саломкі кожны лісток, кожную дэталь. Ведаеце, і дзецям, і дарослым гэта падабаецца. Свае працы мы выстаўляем на ўсіх раённых конкурсах і святах, а таксама на абласных, на рэспубліканскіх «Дажынках» — усюды, куды нас запрашаюць», — расказала галынкаўская майстрыха.

Колькі ўсяго перапляла Лілія Амяльянчык, колькі саломы расходавала на гэтую прыгажосць, падлічыць немагчыма. Жытнёвая салома, зжатая, калі жыта каласіцца, мае ў такой справе асаблівую каштоўнасць. Сабраныя снапы жанчына перабірае, раскладвае саломінкі па таўшчыні і адценні — для кожнага вырабу патрабуецца свой матэрыял.

Лічыцца, што галоўнае ў такой працы — уседлівасць і цярпенне. Але калі да іх дабаўляюцца яшчэ фантазія і акуратнасць, то звычайная саломка, здаецца, пачынае ў руках іграць мелодыю. Паўтараў не бывае. Кожная рэч — як сапраўдны твор мастацтва.

**Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.**

# МІНГАНДАЛЬ БЕЛАРУСІ ІНІЦЫІРУЕ АДМЕНУ ГРАНІЧНЫХ АДПУСКНЫХ ЦЭН НА БУЛЬБУ І АГАРОДНІНУ СА СТАБФОНДАЎ

Мінгандаль Беларусі ініцыіруе адмену гранічных адпускных цэн на бульбу, капусту, моркву, буракі, цыбулю рэпчатую, якія рэалізуюцца са стабілізацыйных фондаў, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні арганізацыі спажывецкага рынку харчовымі таварамі Мінгандлю. На думку спецыялістаў, гэта дасць магчымасць стабілізаваць попыт насельніцтва на гэтыя віды прадукцыі.

Як лічаць у Мінгандлі, асноўнай прычынай павелічэння рэалізацыі бульбы і агародніны са стабілізацыйных запасаў з'яўляецца дыспарытэт цэн на аналагічную прадукцыю ў магазінах і на рынках. Аптова-адпускныя (рознічныя) цэны на бульбу і агародніну са стабілізацыйных фондаў устанаўліваюцца рашэннямі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Гэтыя цэны значна ніжэйшыя, чым на рынках у фізічных асоб.

Напрыклад, на 24 сакавіка гэтага года максімальныя рознічныя цэны на бульбу айчыннай вытворчасці ў магазінах склалі Br2970 за 1 кг, а на рынках яна прадавалася па Br4500 за 1 кг. Капуста ў магазінах прадавалася па Br3560, а на рынках — па Br4800, морква — адпаведна па Br2500 і Br4000, буракі — па Br1960 і Br3500. Рэпчатую цыбулю ў магазінах рэалізуюць па Br2970, на рынку — па Br4000 за 1 кг. «Між тым гандлёвыя арганізацыі на працягу зімы нясуць пэўныя затраты па захаванні бульбы і агародніны, закладзеных на перыяд міжсезоння, праводзяць пераборку, апрацоўку, нясуць страты, хоць і вымушаны прадаваць іх на ўзроўні гранічных адпускных цэн», — адзначылі ў Мінгандлі.

На 1 сакавіка гэтага года рэалізавана 37,3 тыс. т бульбы, 24,1 тыс. т капусты, 9,8 тыс. т моркві, 7 тыс. т буракоў, 9 тыс. т цыбулі, 9,8 тыс. т садавіны. Гэта складае больш за палавіну аб'ёму, закладзенага на перыяд міжсезоння, а па асобных пазіцыях — 60—70 працэнтаў. У параўнанні з аналагічнай датай папярэдняга міжсезоннага перыяду рэалізацыя бульбы павялічылася на 19 працэнтаў, капусты — на 33 працэнты, моркві — на 17 працэнтаў, буракоў — на 20 працэнтаў, цыбулі — на 21 працэнт, садавіны — на 24 працэнты. У папярэднім сезоне бульба і агародніна са стабілізацыйных фондаў расходаваліся не так інтэнсіўна, а да 1 чэрвеня назіраліся нават невялікія лішкі, адзначылі спецыялісты.

Як сцвярджаюць у Мінгандлі, існуючыя запасы дадуць магчымасць да канца сезона забяспечыць пакупніцкі попыт поўнасцю. Калі ў 2010 годзе, паводле даных статыстыкі, у сярэднім за месяц бульбы прадавалі па 8 тыс. т, то ў гэтым годзе яго астаткаў дастаткова для продажу каля 9,2 тыс. т у месяц.

Акрамя таго, паводле даных Мінсельгасхарча, у спецыялізаваных гаспадарках рэспублікі ёсць свабодныя рэсурсы агародніннай прадукцыі ўраджаю 2010 года. Сельгасарганізацыі ў выпадку неабходнасці могуць прапанаваць 800 т бульбы, 3,1 тыс. т агародніны, з іх 200 т капусты, 400 т буракоў і 2,1 тыс. т моркві, 200 т рэпчатай цыбулі.

Далейшаму насычэнню ўнутранага рынку агародніной будзе садзейнічаць нядаўні дазвол урада размяшчаць агародніннымагазіны на першых паверхах жылых дамоў.

Цяпер у гандлёвай сетцы рэспублікі рэалізуюцца бульба і агародніна як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Увесь імпарт — гэта ранняя прадукцыя ўраджаю гэтага года. Напрыклад, бульба з Марока (па цане Br4,8—6,5 тыс.), белакачанная капуста — з Расіі і Нідэрландаў, морква — з Польшчы. У пакупніцкай ёсць выбар, якія прадукты набываць. Стан спажывецкага рынку і насычэнне яго харчовымі таварамі ў цэлым стабільныя, падкрэслілі ў Мінгандлі.

# ДНЁМ РАМАНТАВАЛІ, НОЧЧУ КРАЛІ

**Крымінальны «дуэт» за паўгода ў сталіцы зняў з чужых аўтамабіляў 400 парктронікаў.**

Агульны ўрон, які нанеслі 21- і 22-гадовыя «свабольнікі» аўтаўладальнікам склаў каля 20 тысяч долараў ЗША. Як высветлілася, зламыснікі выходзілі «на справу» пасля таго, як заканчвалі працу ў аўтамайстэрні. За адну такую «вылазку» яны маглі выкрасці да 10 адзінак сучаснага аўтамабільнага абсталявання. Адметна, што кожны раз яны выкарыстоўвалі для паездак па горадзе ў пошуках здабычы новы аўтамабіль, які «арандавалі» ў сваіх кліентаў. Пачалі свае «ваяжы» зламыснікі з Партызанскага раёна сталіцы, а потым, калі набраліся «вопыту», калясілі па ўсім Мінску. Між іншым, пасля затрымання ўдзельнікі крымінальнага «дуэту» здзівілі следчага яшчэ і сваёй прастатой, пацікавіўшыся, як хутка іх адпусцяць дадому. Разам з тым, пагражае гэтым хлопцам да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# КІРАЎНІЦТВА ЕС «БАМБІЦЬ» БЕЛАРУСЬ МАРАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫМІ ДЗЕЯННЯМІ

**Прымаючы рашэнні аб увядзенні сакцый і абмежаванняў адносна Беларусі, кіраўніцтва Еўрасаюза «бамбіць» краіну маральна-палітычнымі дзеяннямі. Такое меркаванне БЕЛТА выказаў пісьменнік, журналіст, кінадраматург, старшыня Рэспубліканскага грамадскага савета па маральнасці Мікалай Чаргінец.**

Як старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец накіраваў зварот да прадстаўнікоў еўрапейскай садружнасці і еўрапейскай грамадскасці з пратэстам супраць прыняцця спісаў, якія забараняюць уезд у ЕС асобным грамадзянам Беларусі. Сам пісьменнік растлумачыў, што матывам для звароту стала «пачуццё зняважанага чалавека, які заўсёды верыў у ідэалы, што нярэдна агучвалі заходнія палітыкі».

Мікалай Чаргінец лічыць, што еўрачыноўнікі, абмежаваўшы права на ўезд, праігнаравалі палажэнні многіх міжнародных дакументаў, у тым ліку Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, дзе абвяшчаецца, што кожны чалавек мае права на свабоду думак, веравызнання, рэлігіі, а таксама на свабоду перакананняў і свабоднае іх выказванне. Забарону на ўезд для журналістаў і прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі пісьменнік расцэньвае як спробу пазбавіць іх права на свабоду слова і выказвання сваіх перакананняў.

На яго думку, такія спісы «прыніжаюць чалавечую годнасць не толькі тых, чые прозвішчы ў іх уключаны, але і саміх чыноўнікаў, якія прымаюць гэтыя зневажальныя рашэнні».

«Памылка Еўрасаюза ў тым, што яго кіраўнікі паверылі невялікай групе грамадзян Беларусі, якія спрабуюць узяць уладу не з дапамогай свайго таленту, працы, ведаў, актыўнага ўдзелу ў стваральнай працы народа, а шляхам шантажу, паклёпу на грамадства», -- падкрэсліў Мікалай Чаргінец, дадаўшы, што менавіта гэта група грамадзян займалася складаннем «чорных» спісаў, уключаючы ў іх «непажаданых» людзей, да якіх яны адчуваюць асабістыя непрыязныя пачуцці і хочуць звесці асабістыя рахункі.

У якасці найбольш дзейснага адказу з беларускага боку на рашэнні ЕС пісьменнік прапанаваў скласці аналагічныя спісы нашых грамадзян, якія садзейнічалі еўрачыноўнікам у выбары кандыдатур, і забараніць ім выезд з Беларусі. «Павінны ж яны быць неяк пакараны за паклёп у наш адрас і падман чыноўнікаў і парламентарыяў Еўропы!» -- адзначыў Мікалай Чаргінец.

Свой зварот ён накіраваў у міжнародныя міждзяржаўныя арганізацыі, у тым ліку ў Савет Еўропы, Еўрапарламент, Еўрапейскую камісію, ААН, а таксама ў міжнародныя няўрадавыя арганізацыі -- медыцынскую гуманітарную арганізацыю «Урачы без межаў», Упаўнаважанаму па правах чалавека Расіі, арганізацыю «Рэпарцёры без межаў» і Міжнароднае супольніцтва адукацыйных тэхналогій.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**4 красавіка 2011 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

# Віктарыя супраць Шарапавай

**Віктарыя Азаранка атрымала ўпэўненую перамогу ў паўфінале турніру ў Маямі над трэцяй ракеткай свету расіянкай Верай Звонаровай — 6:0, 6:3. Гэта другая ўпэўненая перамога беларускі.**

У фінале, які пройдзе сёння, Віктарыю чакае яшчэ адна расіянка, тэнісная зорка планетарнага маштабу Марыя Шарапава. Нагадаем, што Віктарыя ў сусветным рэйтынгу займае 8-е месца, а Марыя — 13-е. Паміж сабой тэнісісткі сустракаліся 4 разы — нічыя 2:2. Але апошні паядынак у Стэнфардзе-2010 выйграла Азаранка. Абедзве тэнісісткі ўжо зарабілі па 350 тысяч долараў, пераможца фінальнага матча атрымае 700 тысяч.

Тым часам наш Максім Мірны ў пары з Даніэлем Нестарам таксама выйшлі ў фінал парнага турніру. У паўфінале беларуска-канадскі дуэт абыграў з лікам 6:4, 6:1 у аўстрыйска-нямецкай пары — Юргена Мельцэра і Філіпа Пецшнера. У вырашальным матчы Мірны і Нестар будуць супернічаць з індыйцамі Махешам Бхупаці і Леандэрам Паесам.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПАТРАПІЎ СОМ У ПАЛОН... ЖАРТУ

Учора мы ўсе святкавалі Дзень смеху і жартаў. «Звязда» не засталася ў баку і арганізавала конкурс. Прыняць удзел мог кожны, а каб атрымаць звяздоўскі сувенір, дастаткова было назваць жартоўныя артыкулы першакрасавіцкага выпуска. Званкоў было каля пяцідзесяці. Але ж толькі тры удзельнікі далі правільны адказ. Нашымі пераможцамі сталі Шыбко Алена Сяргееўна з горада Узда, Ярмоліч Настасся Міхайлаўна і Дар'я Ліс. Толькі яны правільна вызначылі жартоўныя артыкулы і не дадалі да іх спіса праўдзівыя. Вось пажартавалі звяздоўцы толькі ў трох артыкулах. Першы — на пятай старонцы («ПАТРАПІЎ СОМ У ПАЛОН... У ВЯСКОВЫ СКЛЕП»). Другі і трэці — на апошняй старонцы — «ЯК ПІЛІП МАКІТРА СТАЎ ПОЛАМ МАКАРТНІ» і «У ЛІПЕНІ Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ВЫКЛЮЧНА СОНЕЧНАЕ НАДВОР'Е».

А вось што датычыць іншых артыкулаў, якім вы, паважаныя нашы чытачы, не паверылі, то гэта самая праўдзівая праўда.

Пераможцы атрымаюць фірмовыя звяздоўскія майкі.

**Таццяна ПРУС.**

Раздел публікацыі

# РАЗБОР СІТУАЦЫІ НЕМАГЧЫМЫ. АЛЕ ВІНАВАТЫЯ... ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЦІ

**Зараз, з надыходам вясны, гэта гучыць неактуальна. Але зімой, падчас моцных маразоў, людзям было не да жартаў... 16 лютага ў нашай газеце пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Прыгарадныя аўтобусы павінны ацяпляцца гэтак жа, як і гарадскія». Коратка нагадаем: да нас паступіла скарга ад пасажыркі прыгараднага маршрута «Аўтавакзал «Маскоўскі» — Сутокі» (праз Смалявічы) на халадэчу ў салоне аўтобуса. Яна казала, што пакуль даехала раніцай за паўтары гадзіны да горада, літаральна прамерзла — як і іншыя пасажыры. Дрэнны, а ў кабіне вадзіцеля было цёпла.**

Па «гарачых» слядах мы атрымалі каментар адказнай асобы філіяла «Аўтобусны парк №4», сутнасць якога зводзілася да аднаго: аўтобусы лідскай вытворчасці «Нёман» (а аўтапарк меў іх тады 29 адзінак і ўсе яны абслугоўвалі прыгарадныя маршруты) складана абагрэць у сілу іх канструктыўных, скажам так, асаблівасцяў. І ад такіх машын апошнім часам адмовіліся, аддаўшы перавагу больш надзейным у гэтым сэнсе «МАЗам». Але ж і «Нёманы», што засталіся, яшчэ нейкі час будуць эксплуатавацца... А ўвогуле за ацяпленнем салона ў аўтапарку сочаць і калі што — віноватых прыцягваюць да адказнасці.

Інфармацыя адносна працы ацяпляльнага абсталявання ў салонах аўтобусаў была разгледжана і ў камунальным транспартным унітарным прадпрыемстве «Мінсктранс». Што нам адказалі?

«Рухомы састаў прадпрыемства ўкамплектаваны ацяпляльным абсталяваннем. Пры выяўленні парушэнняў вызначанага рэжыму працы ацяпляльнага абсталявання вінаватыя асобы прыцягваюцца да адказнасці.

У сувязі з адсутнасцю інфармацыі пра дату ўказанай у артыкуле паездкі, правесці разбор па дадзеным выпадку не ўяўляецца магчымым. (Тут ад рэдакцыі лічым неабходным ўдакладніць: заяўніца дакладна назвала і дату, і час паездкі, і нумар аўтобуса. Пагадзіцеся, у супрацьлеглым выпадку скарга — з-за сваёй абагульненасці — губляла ўсялякі сэнс. Больш за тое, перад тым, як звярнуцца ў рэдакцыю, яна сама тэлефанавала з гэтымі звесткамі ў дыспетчарскую аўтобуснага парка №4. У публікацыі сапраўды інфармацыя пра дату, час і нумар аўтобуса адсутнічала. Аднак карэспандэнт газеты перад тым агучыў гэтыя звесткі адказнай асобе аўтапарка, якая паабяцала разабрацца ў сітуацыі. А недзе амаль праз месяц нам патэлефанавалі з прадпрыемства «Мінсктранс» (чый адказ мы і цытуем) — каб удакладніць вышэйназваную інфармацыю. На жаль, мы ўжо нічым не маглі дапамагчы, паколькі былі ўпэўненыя, што адказная асоба аўтапарка мае іх. Высветлілася ж, што не... Аднак чытаем далей адказ).

«Разам з тым за недахопы ў падрыхтоўцы рухомага саставу да працы на лініі, якія мелі месца, у лютым прыцягнуты да адказнасці шэраг адказных асобаў філіяла «Аўтобусны парк № 4», які абслугоўвае маршрут «Аўтавакзал «Маскоўскі» — Сутокі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Кватэрнае пытанне

# «НА ШТО РАЗЛІЧВАЦЬ ДАЧЦЫ І БАЦЬКУ?»

***Мы (я і дзве прыёмныя дачкі), жывём у прыватным доме (39 кв. м), дзе, апроч нас, прапісана мая родная дачка. Яна працуе па размеркаванні ў іншай вёсцы, але ў нашым сельсавеце стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў і хоча атрымаць кватэру ў Добрушы. Пытанне: ці можа разам з ёй палепшыць свае жыллёвыя умовы родны бацька дзяўчыны (яму 60 гадоў, ён вельмі хворы, жыве ў нашай жа вёсцы, але свайго жылля не мае)? На што яны могуць разлічваць? Ці мае права дачка атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва або набыццё жылля пад 1%?***

**В. АЛЕЙНІКАВА,** *Жлобінскі раён*

Найперш: жывучы і знаходзячыся на кватэрным уліку ў Жлобінскім раёне, дачка (разам з бацькам) можа прэтэндаваць на атрыманне жылля менавіта па гэтым месцы жыхарства.

Што датычыцца крэдытавання, то ў адпаведнасці з падпунктам 1.4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185, грамадзянам, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 50 тыс. чалавек, а таксама ў гарадах Кобрыне, Слуцку, Рэчыцы, Светлагорску, ашчадным банкам «Беларусбанк» могуць быць выдадзены ільготныя крэдыты на тэрмін да 40 гадоў і пад 1% гадавых.

Згодна з падпунктам 1.10 Указа № 185 грамадзяне, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў на месцы іх пражывання, уключаюцца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў адпаведнымі раённымі, гарадскімі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Грамадзяне, што пражываюць у сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу, гарадах раённага падпарадкавання, стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па іх пастаянным месцы жыхарства і хочуць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы шляхам будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў у іншых населеных пунктах у межах адпаведнага раёна, уключаюцца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў раённымі выканаўчымі і распарадчымі органамі з прытрымліваннем чарговасці грамадзян, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы будаўніцтва (набыцця) жылых памяшканняў.

Што датычыцца нармаваных памераў агульнай плошчы жылога памяшкання, якое будуецца, для вызначэння велічыні льготнага крэдыту, то яны вызначаюцца (з разліку на аднаго члена сям'і):

для грамадзян, якія будуюць жылыя памяшканні ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, а таксама ў шматкватэрных жылых дамах у сельскіх населеных пунктах, — 20 кв. метраў (пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры — 36 кв. метраў);

для грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у сельскіх населеных пунктах і будуюць у іх аднакватэрныя жылыя дамы, а таксама блакаваныя жылыя дамы, — 30 кв. метраў (пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры ў блакаваным жылым доме — 44 кв. метры).

Калі плошча кватэры, якая будуецца, перавышае названыя памеры, то так званая «лішняя плошча» фінансуецца за кошт уласных сродкаў грамадзян.

**Віктар САВІЦКІ.**

# ПА ЧУЖЫМ ПАШПАРЦЕ

**У Баранавічах шукаюць махінатара, які ў трох крамах атрымаў у растэрміноўку тавары па чужым пашпарце.**

У адной — ашуканец узяў тэлевізар, у другой — мэблю, а ў трэцяй — ноўтбук і прынтар. Калі настаў час унесці за тавар чарговы ўзнос, то ніхто грошы не перайшоў, і тады гаспадар адной крамы звярнуўся ў суд. Туды выклікалі чалавека, чыя звесткі былі спісаны з пашпарта. Перад судом з'явіўся зусім іншы чалавек, які растлумачыў, што два гады таму ён свой пашпарт згубіў і цяпер у яго новы. Махінатара шукаюць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Дыскусійная трыбуна

# СВАЯ КАШУЛЯ...

**У наш імклівы век многія краіны сутыкаюцца з фінансавымі праблемамі. Адных яны закранулі больш, а іншых менш, і тут самае важнае — наколькі эфектыўнымі былі прынятыя меры, каб стабілізаваць сітуацыю.**

Успомнім, як Еўрасаюз ратаваў Грэцыю: здаецца, для гэтай краіны было выдзелена 200 млрд еўра. А цяпер настала чарга Партугаліі, якой патрэбна 60 млрд. А да гэтага была Ісландыя. Так што нашы праблемы на фоне іншых краін не такія ўжо і маштабныя, але тым не менш вырашаць іх трэба, і неадкладна, бо фінансавую стабілізацыю неабходна, найперш, правесці ў галовах нашых людзей, — вярнуць давер да рубля. Чым далей сітуацыя з абменам валют будзе знаходзіцца ў падвешаным стане, тым цяжэй будзе вярнуць яе да нармальнага функцыянавання.

Выказаная віцэ-прэм'ерам Сяргеем Румасам трывога, як і надзея, што Нацыянальны банк Беларусі зробіць хуткія і неадкладныя захады для стабілізацыі беларускага рубля, магчыма, ужо і крыху запозненыя. Меры, на маю думку, неабходна было прымяняць месяц таму ці яшчэ раней.

Насельніцтва ўжо не верыць словам. Для яго сёння існуе адзіны аргумент — наяўнасць у абменных пунктах долараў і еўра. Калі іх няма, то няма і даверу.

Раптам аказалася, што ўсім патрэбна валюта. Тут размова ідзе не пра суб'екты гаспадарання, у якіх свой валютна-фінансавы расклад, а пра звычайных грамадзян, якія хочуць перавесці рублі ў долары.

Нам ніхто мільярдаў долараў ці еўра не падкіне, як той Партугаліі, і спадзявацца на расійскі крэдыт не трэба. Ён разыдзецца, як ранішні туман, і ўсё па-ранейшаму застанецца ў нашых руках. Таму ўсе разлікі трэба рабіць толькі ў беларускіх рублях.

Вось такі мой абывацельскі погляд на сітуацыю. Але калі мы не зменім сваю ўстаноўку на жыццё, калі не будзем лічыць кожны рубель, то будзем жыць ад дэвальвацыі да дэвальвацыі.

Будавалі аграгарадкі, у якіх дамы па дзясятку тысяч долараў раздавалі нярэдка людзям выпадковым. Узвялі аб'екты, якія «вісяць» на мясцовым бюджэце. Гэта свае грошы не муляюць, а дзяржаўныя не даюць спакою.

Многія з тых, хто атрымаў крэдыты, радуюцца і паўзучаму аслабленню рубля — і крэдыт стане лёгкім.

Сямейны бюджэт прынцыпова не адрозніваецца ад дзяржаўнага. Калі ёсць грошы толькі на канапу, то халадзільнік не купляем — можна зрабіць і наадварот. Калі ў Баранавічах узвялі лядовы палац, то ў мікраёне Бараўкі няма школы, дзіцячага садка і паліклінікі; калі, бадай, у кожным райцэнтры па ўніверсітэце, то не хапае мулярaў, жывёлаводаў, кіроўцаў...

Для мяне вялікімі краінамі з'яўляюцца тыя, дзе добра жывецца людзям.

У кожнай краіне ёсць нешта сваё, адметнае, але эканамічныя сістэмы розных краін у сённяшнім свеце ўніфікаваныя. І, напэўна, тут не трэба мудрыць, а вось пераняць жыццёвы вопыт не пашкодзіць.

Жыццё з размахам каштуе грошай, і ў гэтым наша праблема. Свая кашуля бліжэй да цела, але няхай яна будзе нашага памеру.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Жывая зямля

# НЕПАЖАДАНЫЯ?

**У Беларусі налічваецца 73 віды жывёл. Некаторым з іх ствараюцца самыя спрыяльныя ўмовы, іх ахоўваюць, заносяць у Чырвоную кнігу. Іншых ахоўваюць толькі некалькі месяцаў на год, каб потым пачаць на іх паляванне. На існаванне іншых відаў не звяртаецца вялікай увагі, бо яны распаўсюджаныя, яны — нашы звыклыя спадарожнікі. І толькі тры з гэтых сямі дзясяткаў істот сапраўдныя ізгоі — воўк, ліса і янотападобны сабака. Чалавек вынес ім бескампрамісны прысуд, вызначыўшы від і катэгорыю: непажаданыя. Што гэта азначае, здагадацца няцяжка. Кожны паляўнічы разумее сэнс гэтых слоў як лаканічную і аднасэнсоўную каманду: забіваць! Ніякай спагады і літасці. Мінуў час, калі іх называлі санітарамі лесу. Цяпер з імі ідзе неаб'яўленая вайна.**

«Непажаданыя» пазбягаюць сустрэчы з чалавекам, і зрабіць добры фотаздымак жывёл — сапраўдная ўдача. Здымак можа сказаць шмат пра што. І калі ён сапраўды ўдаецца, першае, што прыходзіць на думку, разглядваючы яго: няўжо сапраўды некаму гэтак карціць прыкласціся да прыцэлу і націснуць на курок?

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

# ДОМ БЕЗ ГВАЛТУ

Май на ўвазе!

## Як старым абараніцца ад дзяцей-скандалістаў?

**14 пажылых людзей загінулі сёлета ад рук блізкіх, прычым 12 з іх сталі ахвярамі ўласных дзяцей. За кожным такім бытавым забойствам — незлічоная колькасць выпадкаў абраз і адбірання грошай, скандалаў і збівання. Пажылыя і старыя людзі, якія ў сілу аб'ектыўных абставін трапляюць у залежнае ад сваіх дзяцей становішча, нярэдка церпяць ад іх. Пазіцыя кшталту «не варта выносіць смецце з хаты» і няведанне таго, якім чынам можна паўплываць на сітуацыю, толькі спрыяюць гвалту за зачыненымі дзвярыма. У межах красавіцкай рэспубліканскай акцыі «Дом без гвалту» Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі нагадвае, што пра факты сямейнай неўладкаванасці можна паведамляць па кругласутачным нумары 8 (017) 372 73 87.**

— Існуе цэлы шэраг мер, з дапамогай якіх можна і трэба ўплываць на гвалтаўнікоў, — кажа старшы інспектар па асабліваў даручэннях галоўнага ўпраўлення аховы парадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Вольга САКАЛОЎСКАЯ. — Можна, напрыклад, звярнуцца ў савет грамадскага пункта аховы парадку. Такія саветы ёсць ва ўсіх гарадах і нават дробных населеных пунктах. Пра іх працу можна даведацца ў выканкамах, школах, цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва... Прадстаўнікі розных прафесій, якія ўваходзяць у склад савета, пражываюць, што называецца, побач з праблемнай сям'ёй і здольныя дапамагчы (скажам, сабраць дакументы для адраснай дапамогі, заняцца працаўладкаваннем агрэсіўнага элемента). Могуць выклікаць яго на пасяджэнне гэтага савета і патлумачыць, якая адказнасць яму пагражае пры захаванні падобных паводзін. Існуе і другі шлях — зварот да ўчасткавага інспектара па месцы жыхарства. Усё ж такі найбольш эфектыўнымі мерамі папярэджвання гвалту ў сям'і з'яўляюцца меры прававога ўздзеяння...

● Бытавыя скандалісты ставяцца на прафілактычны ўлік у органах унутраных спраў (напрыклад, за паўторнае на працягу года наўмыснае адміністрацыйнае правапарушэнне ў дачыненні блізкіх (нанясенне цялесных пашкоджанняў, дробнае хуліганства).

● Бытавыя скандалісты, якія ставяць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча па прычыне злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, могуць быць часткова абмежаваны праз суд у дзеяздольнасці. Над такім грамадзянінам устанаўліваецца апека (калі ён, скажам, працуе, то губляе ў дадзеным выпадку магчымасць самастойна распараджацца сваім заробкам).

● Працаздольныя поўнагадовыя дзеці абавязаны ўтрымліваць сваіх непрацаздольных і маючых патрэбу ў матэрыяльнай падтрымцы бацькоў. Калі дзеці ўхіляюцца ад выканання гэтага абавязку, то па рашэнні суда іх можна прымусіць да выплаты своеасаблівых «аліментаў». Ухілісты прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

● Хворыя на алкагалізм ці наркаманію бытавыя скандалісты, якія на працягу года больш як тройчы прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, могуць накіроўвацца па рашэнні суда ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі.

● Бытавыя скандалісты могуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці за наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання, якое прывяло да кароткатэрміновага расстройства здароўя, за катаванне, пагрозу забойствам, прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэнне маёмасці.

● Састарэлыя асобы, вымушаныя пражываць з агрэсіўным сваяком, могуць падаць заяву ў органы сацыяльнай абароны выканкама з тым, каб іх размясцілі на пастаяннае пражыванне ва ўстанову інтэрнатнага тыпу, знаходжанне ў якой можа аплачвацца як за кошт уласнай пенсіі, так і за кошт сродкаў, спагнаных з дзяцей.

**P.S.** ***Летась кожны чацвёрты грамадзянін з ліку асобаў, якія загінулі ў выніку забойстваў, пазбаўлены жыцця сваімі блізкімі. Сёлета ўжо ўчынена 30 бытавых забойстваў.***

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**14 апреля 2011 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой»**
**Повестка дня:**

1. О решении, принятом на внеочередном общем собрании акционеров 27.07.2010 г. (Протокол № 20 от 27.07.2010 г.).

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30.

УНП 100008291

# КАЛІ АДКАЗНАСЦЬ — У «ГРАШОВЫМ ВЫМЯРЭННІ»

Твае правы

Сяргей ГРЫБ

**Аб тым, што работнік павінен выконваць свае працоўныя абавязкі і не парушаць працоўную дысцыпліну, ведае ці не кожны. Нашмат радзей узгадваецца аб іншым: работнік абавязаны ашчадна ставіцца да маёмасці сваёй арганізацыі. Бо ў адваротным выпадку з вялікай доляй верагоднасці давядзецца несці матэрыяльную адказнасць.**

### ХТО ЗБІРАЕ ДОКАЗЫ?

Для прыцягнення да матэрыяльнай адказнасці існуюць пэўныя ўмовы. Прычым усе гэтыя ўмовы павінны прысутнічаць адначасова.

— Зразумела, што для матэрыяльнай адказнасці павінен прысутнічаць сам факт урону, які быў нанесены наймальніку пры выкананні працоўных абавязкаў, — распавядае намеснік начальніка аддзела працы і зарплаты камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Яўген Казакевіч. — Па-другое, работнік павінен здзяйсняць супрацьпраўныя дзеянні ці бяздзеянне. Патрэціе, павінна быць вызначана непасрэдная сувязь паміж гэтымі супрацьпраўнымі дзеяннямі ці бяздзеяннем і ўронам наймальніку. І, нарэшце, работнік павінен быць вінаватым у гэтым уроне.

Даказаць, што ёсць усе пералічаныя ўмовы, і ў тым ліку віну работніка, паводле агульнага правіла мусіць наймальнік. Але тут неабходная агаворка: ёсць сітуацыі, калі даказваць сваю невінаватасць павінны самі работнікі. У прыватнасці, так будзе тады, калі паміж работнікам і наймальнікам заключаны пісьмовы дагавор аб поўнай матэрыяльнай адказнасці, калі работнік атрымаў пад справаздачу па аднаразовай даверанасці або па іншых аднаразовых дакументах маёмасць ці пэўныя матэрыяльныя каштоўнасці, калі работнік нанёс урон у стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, калі ўрон быў нанесены не пры выкананні працоўных абавязкаў.

### НЕАСЦЯРОЖНАСЦЬ ЦІ НАМЕР

Часта здараецца, што кіраўніцтва арганізацыі прапануе работніку заключыць індывідуальны пісьмовы дагавор аб поўнай матэрыяльнай адказнасці. Або, калі пры сумесным выкананні работ размежаваць асабістую адказнасць немагчыма, прапануецца падпісаць дагавор аб калектыўнай ці брыгаднай адказнасці — у прыватнасці, такая практыка часцей за ўсё выкарыстоўваецца ў гандлі, грамадскім харчаванні і будаўніцтве.

Аднак трэба мець на ўвазе, што падобныя дагаворы могуць заключацца толькі з работнікамі, якія займаюць пасады або выконваюць работы, непасрэдна звязаныя з захоўваннем, апрацоўкай, продажам, перавозкамі або выкарыстаннем у працэсе вытворчасці перададзеных ім каштоўнасцяў. І, да слова, прыкладны пералік такіх пасад і работ для магчымай індывідуальнай адказнасці вызначаны пастановай Савета Міністраў № 764 ад 26 мая 2000 года, а для адказнасці калектыўнай — пастановай Міністэрства працы № 54 ад 14 красавіка 2000 года.

Да таго ж заканадаўства вызначае: дагаворы аб поўнай матэрыяльнай адказнасці ў любым выпадку забараняецца заключаць з работнікамі, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

— Разам з тым, трэба мець на ўвазе: пры знішчэнні ці псаванні маёмасці наймальніка да матэрыяльнай адказнасці могуць быць прыцягнуты, па сутнасці, усе работнікі, — кажа Яўген Казакевіч. — Пры гэтым, як правіла, работнікі кампенсуюць менавіта поўны ўрон. Праўда, Працоўны кодэкс, калдагавор ці калектыўнае пагадненне могуць вызначаць і некаторыя выпадкі, калі матэрыяльная адказнасць будзе абмежаванай.

Дарэчы, Працоўны кодэкс вызначае, што работнікі нясуць абмежаваную матэрыяльную адказнасць (у памеры ўрону, але не вышэйшым

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

за памер свайго сярэдняга заробку) за псаванне ці знішчэнне па неахайнасці матэрыялаў, паўфабрыкатаў, гатовай прадукцыі, і ў тым ліку пры іх вытворчасці, а таксама за псаванне ці знішчэнне па неахайнасці інструментаў, вымяральных прыбораў, спецадзення і іншых прадметаў, што былі выдадзены наймальнікам для вытворчага працэсу.

Апроч таго, няпоўную матэрыяльную адказнасць (у памеры ўрону, але не вышэйшым за памер свайго трохмесячнага сярэдняга заробку) нясуць кіраўнікі арганізацый, іх намеснікі, кіраўнікі структурных падраздзяленняў і іх намеснікі ў выпадку, калі ўрон нанесены няправільнай пастаноўкай уліку і захоўвання матэрыяльных ці грашовых каштоўнасцяў, непрыняццем неабходных мер да папярэджвання прастояў ці вытворчасці недабраякаснай прадукцыі.

— Тут вельмі важна падзяляць прычыны віны: неасцярожнасць і намер, — падкрэслівае Яўген Казакевіч. — Бо ў першым выпадку можна весці гаворку пра абмежаваную матэрыяльную адказнасць, а ў другім — пра адказнасць поўную.

### МАТАДКАЗНАСЦЬ. МІНУС ПРЭМІЯ

Адзін адметны момант. Паводле Працоўнага кодэкса, кампенсацыя ўрону маёмасці наймальніка здзяйсняецца незалежна ад прыцягнення вінаватага работніка да дысцыплінарнай, адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці. Пры гэтым тут заканадаўства не абмяжоўвае наймальніка і ў магчымасці выкарыстання ў адносінах да работніка і дадатковых мер матэрыяльнага ўздзеяння — такіх, як пазбаўленне прэміі ці іншых стымулюючых выплат.

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ НЕ ЗГОДНЫ?

Непасрэдна памер урону вызначаецца судом. Прычым тут бяруцца пад увагу толькі фактычны кошт скрадзенай, сапсаванай ці знішчанай маёмасці. Памер так званай «страчанай выгады» ў разлік не прымаецца.

— Кампенсацыя работнікамі ўрону, які не перавышае сярэдні месячны заробак, можа здзяйсняцца па распараджэнні наймальніка шляхам вылікаў з зарплаты — зразумела, што да выдання такога загаду наймальнік павінен запатрабаваць ад работніка пісьмовае тлумачэнне, — зазначае Яўген Казакевіч. — Калі ж памер урону перавышае сярэдні месячны заробак, то кампенсацыя робіцца ў судовым парадку.

Неабходна падкрэсліць, што работнік мае магчымасць кампенсаваць урон добраахвотна, або, як варыянт, перадаць наймальніку раўназначную маёмасць ці адрамантаваць пашкоджаную — скажам, той жа аўтамабіль.

— Аднак калі работнік не згодзен з вылікам ці з яго памерам, то ён можа звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках, — заўважае Яўген Казакевіч. — Або ў таго ж работніка ёсць іншы шлях — звярнуцца ў суд.

Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении 13 апреля 2011 г. открытого аукциона (с условиями) по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием для размещения объектов общественного питания, функционирующих в весенне-осенний период в г. Минске**

| № предмета аукциона | Адрес открытой площадки | Целевое назначение | Требуемая к установке архитектурная форма объекта | Арендуемая площадь, кв.м. | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Заводской район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 295-77-81 отдел торговли и услуг тел. 296-40-92 | | | | |
| 1. | ул. Я. Райниса, д. 1д | объект общественного питания, исключая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| | **Ленинский район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 223-06-40 отдел торговли и услуг тел. 297-35-32 | | | | |
| 2. | ул. Чижевских, 27 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон со входом внутрь и устройством настила | 30 | 1050 |
| | **Московский район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 200-97-69 отдел торговли и услуг тел. 200-96-21 | | | | |
| 3. | Сквер по пр.газеты «Правда» | объект общественного питания, включая реализацию пива | мини-кафе | 20 | 700 |
| 4. | Сквер «Полянка» (между ул. К. Либкнехта и ул. Р. Люксембург) | объект общественного питания, включая реализацию пива | мини-кафе | 20 | 700 |
| | **Партизанский район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 294-70-94 отдел торговли и услуг тел. 294-61-44 | | | | |
| 5. | Степянка, зона отдыха | объект общественного питания, включая реализацию пива, мороженого | павильон | 50 | 1750 |
| 6. | ул. Ваупшасова, напротив жилого дома № 15 | объект общественного питания, включая реализацию пива, мороженого | павильон | 50 | 1750 |
| 7. | участок, примыкающий к административному зданию по ул. Долгобродская, д. 14, на пересечении с пер. Козлова | объект общественного питания, включая реализацию пива, мороженого | павильон | 50 | 1750 |
| 8. | ул. Карвата в районе д. 18 | объект общественного питания, включая реализацию мороженого и исключая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| | **Советский район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 292-13-93 отдел торговли и услуг тел. 292-20-22 | | | | |
| 9. | пляж № 4 Цнянского водохранилища (возле автостоянки) | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| 10. | пляж № 4 Цнянского водохранилища (возле туалетов) | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| | **Фрунзенский район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 204-31-06 отдел торговли и услуг тел. 204-40-76 | | | | |
| 11. | ул. Матусевича, д. 20 (парк им.60-летия Октября) | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| 12. | ул. Гаруна, напротив д. 12 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| | **Центральный район г. Минска** отдел архитектуры и градостроительства тел. 306-42-95 отдел торговли и услуг тел. 306-41-73 | | | | |
| 13. | ул. Сторожевская, набережная от Троицкого предместья до памятника А.С. Пушкину, площадка № 1 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 14. | ул.Сторожевская, набережная от Троицкого предместья до памятника А.С. Пушкину, площадка № 2 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 15. | ул. Сторожевская, набережная от Троицкого предместья до памятника А.С. Пушкину, площадка № 3 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 16. | ул. Каховская, 31 (территория, прилегающая к кинотеатру «Киев») | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 40 | 1400 |
| 17. | ул. Сторожевская, 15 (территория, прилегающая к гостинице «Беларусь») | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 400 | 14000 |
| 18. | Сквер им. Я. Купалы – набережная | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 150 | 5250 |
| 19. | пр. Победителей, набережная реки Свислочь (лодочная станция) | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 20. | территория, прилегающая к парку «Дрозды» (пляжная зона), площадка № 1 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 21. | территория, прилегающая к парку «Дрозды» (пляжная зона), площадка № 2 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 50 | 1750 |
| 22. | пр.Победителей, набережная водохранилища «Дрозды» (парковка), площадка № 1 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |
| 23. | пр.Победителей, набережная водохранилища «Дрозды» (парковка), площадка № 2 | объект общественного питания, включая реализацию пива | павильон | 100 | 3500 |

**Условия аукциона:**

Победитель аукциона за счет собственных средств обязан:

- установить объект требуемой архитектурной формы и обеспечить его функционирование в соответствии с указанным целевым назначением;
- обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии;
- установить контейнер и заключить договор со спецпредприятием на вывоз мусора;
- установить биотуалет (при необходимости);
- обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости);
- по завершении сезона произвести демонтаж объекта.

Согласование внешнего вида и оформления объекта осуществляется победителем аукциона в установленном Мингорисполкомом порядке.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 17 марта 2011 г. № 690 продолжительность сезона в 2011 г. установлена с 15 апреля по 15 ноября (при благоприятных погодных условиях).

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **13 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г.Минск, ул.К.Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 4 по 11 апреля 2011 г.** в рабочее время, (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

**Срок договора аренды – 5 лет.**

Победитель аукциона для заключения договора аренды обязан зарегистрироваться в качестве субъекта хозяйствования.

Со схемами размещения открытых площадок можно ознакомиться у организатора аукциона.

Адметна, што калегія прайшла ў сценах мінскай прыватнай галерэі мастацтва. Чыноўнікі агучвалі свае даклады на фоне экспазіцыі, якая месціцца зараз у «Ў»: вялікафарматныя здымкі фатографа Мікалая Бацвінніка, якія дэманструюць вядомых мужчын беларускай сучаснасці ў працэсе галення. Тут і Уладзімір Цэслер, і Уладзімір Пугач, і Аляксандр Некрашэвіч, і многія іншыя. **Міністр культуры Павел ЛАТУШКА** прызнаўся, што напярэдадні калегіі адзін з супрацоўнікаў міністэрства прапаноўваў яму зняць гэтыя здымкі на час афіцыйнага мерапрыемства. Але міністр катэгарычна адмовіўся, бо гэта супярэчыла б новым прынцыпам дзейнасці Мінкультуры: падтрымцы сучаснага беларускага мастацтва і таленавітай экстраардынарнай моладзі, выхаванне цярпімасці да «незразумелага» мастацтва.

— Пытанне дзяржаўна-прыватнага партнёрства, развіцця прыватнага сектара ў сферы культуры — стратэгічнае для паўнавартаснага развіцця культуры ў Беларусі, — растлумачыў Павел Латушка, — На жаль, мы павінны канстатаваць, што прыватная сфера ў культуры з'яўляецца даволі абмежаванай. Сёння, у адпаведнасці са статыстыкай Белстата, у Беларусі дзейнічае толькі 7 устаноў культуры прыватнай формы ўласнасці. І каля 400 устаноў, адным з відаў дзейнасці якіх з'яўляецца дзейнасць у сферы культуры. Зразумела, што гэта вельмі мала, калі ўлічваць, што ў нашай краіне каля 10 тысяч дзяржаўных устаноў культуры. Неабходнасць увядзення механізмаў узаемадзеяння дзяржаўных і недзяржаўных складнікаў у сферы культуры відавочная. Першы і галоўны крок у гэтай справе — стварэнне сістэмы шматканальнага фінансавання культуры: дзяржаўны бюджэт, прыватныя сродкі мецэнатаў, інвестараў.

Мецэнацтва для культуры павінна стаць адным з важных фактараў стымулявання новых ідэй і праектаў. Мецэнацтва для культуры ў нашай краіне павінна стаць прэстыжным заняткам. Дарэчы, традыцыі мецэнацтва заўсёды існавалі на нашай зямлі. Мы можам прывесці прыклады, пачынаючы з тэатра Уршулі Радзівіл у Нясвіжы. Другі важны крок — развіццё праектнай дзейнасці ў сферы культуры, увядзенне сістэмы грантаў на цэнтральным і рэгіянальным узроўнях. Гэта дазволіць стварыць умовы для развіцця новых ідэй і праектаў. Трэці крок — развіццё заканадаўчай базы. У апошні час былі распрацаваныя і прынятыя важныя заканадаўчыя дакументы, якія датычацца сферы культуры. Сёлета ў сакавіку быў падпісаны Указ Прэзідэнта № 77, які стварыў спрыяльныя ўмовы для прыцягнення спонсарскіх сродкаў у галіну культуры. Мы аблегчылі адміністрацыйныя працэдуры, звязаныя з прыцягненнем сродкаў інвестараў, спонсараў, мецэнатаў. 12 сакавіка была прынята пастанова Савета Міністраў № 308, паводле якой у арганізацыях культуры могуць стварацца апякунскія саветы. Апроч іншых задач, саветы павінны дапамагаць у пошуку партнёраў для супрацоўніцтва, прыцягненні пазабюджэтных і іншых дадатковых крыніц фінансавання, а таксама ажыццяўляць грамадскі кантроль за выдаткоўваннем і размеркаваннем грошай.

Міністэрствам распрацоўваецца праект закона аб дзейнасці ў галіне кінематаграфіі. Прадугледжваецца абмежаванне фінансавання з боку дзяржавы адной асобна ўзятай кінастужкі да 70% і неабходнасць пошуку дадатковых крыніц фінансавання ў памеры 30% на рынку — беларускім ці замежным. У праекце закона таксама закладваюцца гарантыі пакрыцця прадзюсарскай рызыкі для прыватных інвестараў, якія будуць укладваць грошы ў гэтую сферу. Цяпер дзяржаўная частка сродкаў на стварэнне мастацкіх стужак будзе выдаткоўвацца на конкурснай аснове. Гэта тычыцца не толькі сферы кіно. Конкурснасць будзе спрыяць здароваму спаборніцтву ў сферы культуры, і як вынік, з'яўленню больш якасных твораў мастацтва. Мінкультуры таксама працуе над заканадаўчым актам, які створыць дадатковыя льготы для кінавытворцаў і дзейнасці іншых устаноў культуры ў Беларусі, — больш прывабных з пункту гледжання падаткаабкладання.

Культура Беларусі імкнецца выйсці на абсалютна новы еўрапейскі ўзровень. Застаецца верыць, што планы не акажуцца фікцыяй і будуць спраўджаныя. Вельмі ўзрадавала заява **першага намесніка міністра культуры Уладзіміра КАРАЧЭЎСКАГА** пра тое, што ў бліжэйшы час плануецца ўдзел Беларусі ў Канскім кінафестывалі. Спонсарскую падтрымку абяцаюць аказаць Белтэлерадыёкампанія і гандлёвая марка «Бульбаш». «Пріорбанк» фінансуе ўдзел нашай краіны ў Венецыянскай біенале ў чэрвені гэтага года. Сумесна з латвійскім інвестарам, магчыма, нарэшце адбудзецца грунтоўная рэстаўрацыя палаца Тызенгаўзаў у Паставах, выдатнага помніка культуры і архітэктуры другой паловы XVIII стагоддзя.

Напрыканцы **Вольга КАНАНЮК, начальнік эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры**, адзначыла, што ў 2010 годзе даход ад экспарту музыкі ў Вялікабрытаніі перавысіў даходы ад машынабудавання. Выснова напрошваецца сама па сабе: у тэрытарыяльна невялікіх дзяржавах прыбытак ад культуры і мастацтва можа складаць асноўную частку даходу краіны. І ў гэтым кірунку Беларусь, калі захоча, зможа актыўна развівацца. Экспартаваць са сферы культуры нам ёсць што. Галоўнае — улучыць гэтаму патрэбную колькасць увагі.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Лельчыцкім раёне захаваўся звычай абвязваць садовыя дрэвы сенам, каб яблыні, вішні і слівы добра плоданасілі. Гаспадар з вёскі Мілашэвічы Васіль Лісіцкі (на фота), нягледзячы на малады ўзрост, таксама перакананы, што такое сена валодае дзівоснымі лекавымі і спрыяльнымі якасцямі.**

## ДЗІЦЯЧАЯ «ВЯСЁЛКА» НАД ЛІДАЙ

**На Лідчыне, дзе ў згодзе жывуць прадстаўнікі шасцідзесяці нацыянальнасцяў, склалася добрая традыцыя: прайшоў ужо трэці рэгіянальны фестываль нацыянальных суполак «Вясёлка». Яго арганізаваў цэнтр творчасці дзяцей і моладзі раённага ўпраўлення адукацыі.**

У фестывалі ўдзельнічалі дзіцячыя калектывы раённага аддзела Саюза палякаў Беларусі, грамадскага аб'яднання літоўцаў «Рута», рэгіянальна-мемарыяльнага культурнага аб'яднання, узорны цымбальны аркестр Лідскай музычнай школы, узорны ансамбль песні і танца «Катрынка» сярэдняй школы № 15. Прычым кожны кіраўнік грамадскага аб'яднання вітаў удзельнікаў свята (пад дэвізам «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся») на мове сваёй нацыянальнай суполкі.

А ў суботу 2 красавіка ў Лідзе — чарговая імпрэза для дзяцей і моладзі (ва ўзросце ад сямі да сямнаццаці гадоў). Раённы Палац культуры запрашае на рэгіянальны фестываль-конкурс дзіцячай аматарскай харэаграфічнай творчасці «Хрустальны чаравічак».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении 21 апреля 2011 г. открытого аукциона (с условиями) по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием для размещения объектов мелкорозничной торговли, функционирующих в весенне-осенний период в г. Минске**

| № предмета аукциона | Адрес открытой площадки | Целевое назначение | Требуемая к установке архитектурная форма объекта | Арендуемая площадь, кв.м. | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Заводской район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 295-77-81<br>отдел торговли и услуг тел. 296-40-92 | | | | |
| 1. | площадь Ванеева (пр.Партизанский, д. 28/1) | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого, попкорна, сахарной ваты, исключая реализацию пива | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| 2. | Автостанция «Шабаны» | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого, исключая реализацию пива | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| 3. | остановка общественного транспорта «Ст. метро «Могилевская» (со стороны МЗКТ) | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого, исключая реализацию пива | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| 4. | Сквер «Пионерский» | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого, исключая реализацию пива | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| | **Московский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 200-97-69<br>отдел торговли и услуг тел. 200-96-21 | | | | |
| 5. | Сквер по ул. Волоха (около озера) | торговый объект по реализации мороженого | лоток | 3 | 105 |
| 6. | Сквер по ул. Волоха (около озера) | торговый объект по реализации безалкогольных напитков, исключая реализацию пива | лоток | 3 | 105 |
| | **Октябрьский район г.Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 224-59-21<br>отдел торговли и услуг тел. 224-49-74 | | | | |
| 7. | ул. Кижеватова – ул. Серова | торговый объект по реализации мороженого | палатка | 10 | 350 |
| 8. | ул. Корженевского – ул. Кижеватова | торговый объект, исключая реализацию пива | павильон | 20 | 700 |
| 9. | ул. Московская, д. 17 | торговый объект по реализации мороженого | лоток | 6 | 210 |
| 10. | пл. Казинца (со стороны к/т «Электрон») | торговый объект, исключая реализацию пива | палатка | 30 | 1050 |
| 11. | ул. Слонимская | торговый объект, исключая реализацию пива | павильон | 70 | 2450 |
| 12. | ул. Жуковского, 10/1 | торговый объект, исключая реализацию пива | палатка | 20 | 700 |
| 13. | ул. Стебенева, 6 | торговый объект, исключая реализацию пива | палатка | 10 | 350 |
| 14. | ул. Воронянского-Володько | торговый объект, исключая реализацию пива | павильон | 20 | 700 |
| 15. | ул. Кижеватова (выезд на Слуцкое направление) | торговый объект, исключая реализацию пива | палатка | 15 | 525 |
| 16. | ул. Чкалова, 3а (остановка общественного транспорта) | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| 17. | ул. Осиповичская (остановка общественного транспорта) | торговый объект по реализации прохладительных напитков, мороженого | открытый прилавок с зонтиком | 7 | 245 |
| 18. | Бобруйский сквер | торговый объект, исключая реализацию пива | палатка | 30 | 1050 |
| | **Партизанский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 294-70-94<br>отдел торговли и услуг тел. 294-61-44 | | | | |
| 19. | ул. Захарова, д. 59 (остановка общественного транспорта) | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | палатка | 5 | 175 |
| 20. | ул. Радиальная, д. 40 (остановка общественного транспорта) | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | палатка | 5 | 175 |
| 21. | Микрорайон «Дражня», зона общежитий по пер. Солтыса | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | палатка | 5 | 175 |
| 22. | ул. Смоленская, д. 2а, ост. пункт «Восточная» | торговый объект по реализации мороженого | палатка | 5 | 175 |
| 23. | пер. Козлова, район источника | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | палатка | 5 | 175 |
| 24. | Микрорайон «Дражня», зона малоэтажной застройки (ост. пункт «Переходная» по ул. Радиальной) | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | палатка | 5 | 175 |
| | **Первомайский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 280-54-65<br>отдел торговли и услуг тел. 287-30-42 | | | | |
| 25. | ул. Героев 120-й дивизии, 15, остановка «Клуб» | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков, исключая реализацию пива | открытый прилавок с зонтиком | 5 | 175 |
| | **Советский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 292-13-93<br>отдел торговли и услуг тел. 292-20-22 | | | | |
| 26. | ул.Мирошниченко, д. 55 (за магазином «Соседи») | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков и сахарной ваты, исключая реализацию пива | лоток | 5 | 175 |
| 27. | пересечение ул. М. Богдановича – ул. Кульман (напротив магазина «Умные вещи») | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков и сахарной ваты, исключая реализацию пива | лоток | 5 | 175 |
| 28. | пересечение ул. М. Богдановича – ул. Измайловская (остановочный пункт) | торговый объект по реализации мороженого, прохладительных напитков и сахарной ваты, исключая реализацию пива | лоток | 5 | 175 |

**Условия аукциона:**

Победитель аукциона за счет собственных средств обязан:
- установить объект требуемой архитектурной формы и обеспечить его функционирование в соответствии с указанным целевым назначением;
- обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии;
- установить контейнер и заключить договор со спецпредприятием на вывоз мусора;
- установить биотуалет (при необходимости);
- обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости);
- по завершении сезона произвести демонтаж объекта.

Согласование внешнего вида и оформления объекта осуществляется победителем аукциона в установленном Мингорисполкомом порядке.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 17 марта 2011 г. № 690 продолжительность сезона в 2011 г. установлена с 15 апреля по 15 ноября (при благоприятных погодных условиях).

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **21 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г.Минск, ул.К.Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 4 по 19 апреля 2011 г.** в рабочее время, (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

**Срок договора аренды – 5 лет.**

Победитель аукциона для заключения договора аренды обязан зарегистрироваться в качестве субъекта хозяйствования.

Со схемами размещения открытых площадок можно ознакомиться у организатора аукциона.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о его результатах. В соответствии с решением Мингорисполкома от 24 марта 2011 г. № 805 размер арендной платы, согласованный Мингорисполкомом, составляет 20000 рублей за 1 квадратный метр арендуемой площади.

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г.Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Задаток для участия в аукционе должен быть внесен до 17 часов 30 минут 19 апреля 2011 г.;

**гражданином Республики Беларусь** – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства);

**индивидуальным предпринимателем - копия свидетельства** о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

**юридическим лицом** Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (копии свидетельства о государственной регистрации и устава), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (информационное письмо), документ о назначении руководителя;

**иностранным гражданином** – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

**представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя** - нотариально удостоверенная доверенность;

**представителем иностранного гражданина** - легализованная в установленном порядке доверенность;

**представителем иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

При отсутствии у физического лица расчетного (лицевого) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by**

Минский городской центр недвижимости

**Извещение о проведении 15 апреля 2011 г. открытого аукциона (с условиями) по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием для размещения объектов мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией, функционирующих в весенне-осенний период в г. Минске**

| № предмета аукциона | Адрес открытой площадки | Целевое назначение | Арендуемая площадь, кв.м. | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Ленинский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 223-06-40<br>отдел торговли и услуг тел. 297-35-32 | | | |
| 1. | ул.Я.Лучины, 22 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 2. | ул.Игуменский тракт, 47 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| | **Московский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 200-97-69<br>отдел торговли и услуг тел. 200-96-21 | | | |
| 3. | ул.Слободская, 135 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 4. | ул.Н.Орды, 25, место № 2 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| | **Партизанский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 294-70-94<br>отдел торговли и услуг тел. 294-61-44 | | | |
| 5. | ул.Карвата, 27 (остановочный пункт «д/с Степянка») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 6. | ул.Ваупшасова, 15/2 (остановочный пункт «Школа-интернат») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 7. | ул.Радиальная (остановочный пункт «Переходная») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| | **Первомайский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 280-54-65<br>отдел торговли и услуг тел. 287-30-42 | | | |
| 8. | ул.Седых, 58-64 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 9. | ул.Седых, 4, место № 1 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 10. | ул.Седых, 4, место № 2 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 11. | ул.Калиновского, 14 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 12. | ул.Я.Коласа, 32-34 (возле магазина обуви) | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 13. | ул.Я.Коласа, 48, место № 1 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 14. | ул.Я.Коласа, 48, место № 2 | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| | **Фрунзенский район г. Минска**<br>отдел архитектуры и градостроительства тел. 204-31-06<br>отдел торговли и услуг тел. 204-40-76 | | | |
| 15. | ул. Казимировская, 33 (остановочный пункт «Каменногорская») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 16. | ул.И.Жиновича, 4 (остановочный пункт «Гаражи») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 17. | ул.М.Лынькова, 95а (остановочный пункт) | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 18. | ул.Матусевича, 33 (остановочный пункт) | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |
| 19. | ул.Каменногорская, между д.10 и д.18 (остановочный пункт «Каменногорская, 14») | торговый объект по реализации плодоовощной продукции | 5 | 175 |

**Условия аукциона:**

Победитель аукциона за счет собственных средств обязан:
- установить объект и обеспечить его функционирование в соответствии с указанным целевым назначением;
- по завершении сезона произвести демонтаж объекта.

Согласование внешнего вида и оформления объекта осуществляется победителем аукциона в установленном Мингорисполкомом порядке.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 4 сентября 2003 г. № 1563 продолжительность сезона установлена с 1 марта по 1 декабря (при благоприятных погодных условиях).

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.**

Аукцион состоится **15 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г.Минск, ул.К.Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 4 по 13 апреля 2011 г.** в рабочее время, (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

**Срок договора аренды – 5 лет.**

Победитель аукциона для заключения договора аренды обязан зарегистрироваться в качестве субъекта хозяйствования.

Со схемами размещения открытых площадок можно ознакомиться у организатора аукциона.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о его результатах. В соответствии с решением Мингорисполкома от 24 марта 2011 г. № 805 размер арендной платы, согласованный Мингорисполкомом, составляет за 1 квадратный метр арендуемой площади:

за март – 3 базовые величины;
за апрель – сентябрь – 4 базовые величины;
за октябрь – ноябрь – 3 базовые величины.

Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г.Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Задаток для участия в аукционе должен быть внесен до 17 часов 30 минут 13 апреля 2011 г.;

**гражданином Республики Беларусь** – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства);

**индивидуальным предпринимателем - копия свидетельства** о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

**юридическим лицом** Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (копии свидетельства о государственной регистрации и устава), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (информационное письмо), документ о назначении руководителя;

**иностранным гражданином** – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

**представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность;

**представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность;

**представителем иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

При отсутствии у физического лица расчетного (лицевого) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by**

# Краіна здароўя

Выпуск № 16 (252)

Пытальнік

# «СЫДЗІ, ПРАШУ, БЯССОННІЦА...»

**Апошнім часам я падоўгу не магу заснуць. Пастаянныя стрэсы на працы перашкаджаюць нармалізаваць сон. Якія захады рабіць, каб спакойна спаць?**

**Надзея,** *г. Лагойск.*

Сёння практычна ўсе людзі звядваюць стрэс. Існуе так званы «феномен незакончанай справы» — мышцы напружаныя, гатовыя да дзеяння, але рух не адбываецца. Ці бывала з вамі такое: захацелі пачысціць зубы, але хто-небудзь або што-небудзь вас адцягнула... Мозг ужо аддаў сігнал да мышцы рукі. Мышца напружылася, а зубную шчотку вы не ўзялі. Дзеянне не адбылося. Або, напрыклад, вы прыйшлі ў пакой і раптам забылі навошта. А мозг паслаў сігнал перад гэтым. Вы ўжо ў пакоі і ўспамінаеце: «Што ж я хацела тут зрабіць?». Такіх міні-напружанняў за дзень назапашваецца дастаткова. Гэта і з'яўляецца адной з прычын, якія вядуць да стрэсу. Апошні ў часткі людзей насамрэч можа стаць прычынай бяссоння.

Пачынаць працэс нармалізацыі сну варта з найбольш простых і бяспечных спосабаў. Адзін з іх — «прагляд дня». Вечарам у спакойнай абстаноўцы, нібыта з боку прагледзьце падзеі, што адбыліся з вамі. Для пачатку ахапіце ўнутраным позіркам сваё цела. Пастарайцеся расслабіць яго: ногі, рукі...

Пачынайце прагляд падзей у зваротным парадку — з вечара да раніцы. Не варта затрымлівацца на асобных момантах, патрэбныя толькі факты. Напрыклад, павячэрала, прыгатавала вячэру, прыйшла з працы, працавала, адбыўся канфлікт з начальствам. Далей: кіравала машынай, паснедала наспех, праспала і г.д.

Пасля гэтага пачніце «прагляд дня з раніцы да вечара» так, як бы вам хацелася зрабіць. Пры гэтым вы павінны «выпраўляць» свае памылкі: устала своечасова, паснедала не спяшаючыся, на працы разам з начальнікам знайшлі кампраміс... Дзякуючы гэтаму спосабу вы не будзеце займацца самакатаваннем, а проста зменіце сваё стаўленне да таго, што адбылося з вамі, на пазітыўнае.

Па магчымасці пачынайце раніцу і падрыхтоўку да сну ў адзін і той жа час. Паспрабуйце «зарадзіцца» станоўчай энергіяй на будучы дзень з дапамогай ранішняга кантраснага душа. Такая водная працэдура добра праганяе рэшткі сну. У дадатак яна яшчэ і дабратворна ўплывае на нашу аўру, выраўноўваючы яе. Асабліва калі сон быў неспакойным. Таму, пахваляваўшыся або зведаўшы непрыемныя эмоцыі, дома абавязкова «супакойце» сябе кантрасным душам.

Слёзы — гэта яшчэ адна хітрасць прыроды для хуткага знятця адмоўных эмоцый. Са слязамі выводзяцца непатрэбныя гармоны. У першую чаргу гармоны стрэсу. Нездарма лічыцца, што, паплакаўшы, чалавек супакойваецца.

Вечарам перад сном абавязкова знайдзіце паўгадзінкі, каб расслабіцца. Добра спраўляецца з гэтай задачай духмяная ванна. У цёплую ваду, тэмпература якой 38—39 градусаў, дадайце эфірных алеяў у наступнай колькасці: 4 кроплі хвоі, 3 кроплі мяты, 3 кроплі лімона. Працягласць прыёму ванны павінна складаць 15—30 хвілін. Але перш трэба пераканацца, ці няма ў вас алергіі на гэтыя сродкі. Падчас прыёму ванны паслухайце лёгкую мелодыю. Урачы рэкамендуюць для знятця стрэсу слухаць музыку Моцарта.

Нядрэнна адмовіцца ад прагляду штовячэрніх тэленавін. Асабліва падчас вячэры. Інакш разам з ежай вы «з'ясце» і выбухі, і навадненні...

Ноччу закрыйце вокны шторамі са шчыльнай тканіны, спаць лепш без святла. Святло вулічнага ліхтара і фар машын, у суседнім пакоі можа ўскладніць праблему засынання.

Адключыце на ноч тэлефон, адчыніце фортачку. У халаднаватым пакоі і пад цёплай коўдрай значна лягчэй заснуць.

Калі эфекту ўсё-такі няма, паспрабуйце ўжываць розныя прэпараты на аснове зёлак. Як вядома, заспакаяльнае дзеянне маюць адвары і настоі хмелю, мацярдушкі, календулы, рамонку. Калі ў вас няма жадання гатаваць настоі, можна проста напоўніць сваю падушку лісцем мацярдушкі. Альбо завараваць ужо гатовыя гарбаты. Напрыклад, рамонкавую.

Старайцеся планаваць свой дзень так, каб у вячэрні час вам не трэба было вырашаць тэрміновыя і важныя справы. І па магчымасці скараціце да мінімуму колькасць паездак і сустрэч, без якіх можна абысціся.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# ПРАЦЯГЛАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАМЕНЫ СУСТАВА

**На пытанні чытачоў адказаў загадчык кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук Алег КЕЗЛЯ.**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 30, 31 сакавіка, 1 красавіка.)**

***☎— Нясвіж, Галіна Іванаўна, 60 гадоў. Мне шмат непрыемнасцяў прыносяць косці, якія разрасліся ля вялікіх пальцаў ступняў. Як можна аблегчыць хаду і зняць боль?***

— Гэта хутчэй за ўсё папярочная плоскаступнёвасць з адхіленнем першага пальца. Калі гэта так, то таблеткамі тут дапамагчы цяжка. Існуюць спецыяльныя сцелькі для такой паталогіі, укладышы паміж пальцамі, якія ў пэўнай ступені прыносяць палёгку. Але поўнасцю зняць праблему яны не могуць.

***☎— Ваўкавыск, Міхаіл. Ці паказана эндапратэзаванне пры лячэнні дэфармуючага артрозу каленнага сустава?***

— Калі ў вас дэфармуючы артроз 3—4-й ступені, то кансерватыўнае лячэнне эфекту не дасць. Або ён будзе, але часовы. Для пастаяннага эфекту трэба зрабіць замену сустава.

***☎— Крупкі, Яўгенія Аляксандраўна, 77 гадоў. У мяне артроз левага тазасцегнавога сустава 3-й ступені. Болі ўзмацняюцца. Медыкаментозныя прэпараты амаль не дапамагаюць. Параілі набыць уколы дыпрастан. Але яны вельмі дарагія. Ці варта мне скарыстацца гэтымі ўколамі, ці будзе ад іх эфект?***

— Не, я думаю дыпрастанам вам карыстацца не трэба. Пры артрозе 3-й ступені такое лячэнне носіць часовы характар. Вам трэба рабіць эндапратэзаванне.

***☎— Мінск, Алена. Чула, што пры артрозе рэкамендуецца выпіваць у дзень 1,5—2 літры халоднай вады. Ці так гэта і ці можна замест халоднай піць цёплую ваду? Якое лячэнне, акрамя як медыкаментознымі прэпаратамі, выкарыстоўваецца для прафілактыкі прагрэсавання артрозу. Ці варта захоўваць дыету?***

— Лічыцца, што ўжыванне 1,5—2 л вады ў дзень, незалежна халоднай ці цёплай, і пэўная дыета садзейнічаюць страце вагі. А калі мы губляем вагу, то нашым суставам лягчэй. Зыходзячы з такіх пазіцый, гэта мера можа дапамагчы. Але ж лячыць суставы толькі вадой не атрымаецца. Для таго, каб спыніць працэс, трэба прымяняць медыкаментознае лячэнне, падключаць фізіятэрапію. Што датычыцца дыеты, то трэба абмяжоўваць тлустую, вострую ежу, больш ужываць раслінай ежы, садавіны і гародніны.

***☎— Гродна, Алена Вітальеўна. Маці 72 гады. У яе коксартроз чацвёртай стадыі. Стаіць у чарзе на замену сустава ў Мінскай абласной бальніцы. Амаль ужо не ходзіць, а чарга прасоўваецца надта павольна... Калі нарэшце падыдзе гэта чарга і ёй памяняюць адзін сустаў, ці вырашыць гэта праблему, ці зможа яна хадзіць?***

— Вашай маці можна дапамагчы. Ёсць шанц, што праблема сустава будзе вырашана.

***— У прынцыпе, у яе пакутуюць абодва суставы.***

— Калі падыдзе чарга, неабходна мяняць спачатку адзін сустаў, а праз 4-6 месяцаў, калі ўзнікне неабходнасць, яна будзе аперыравацца на другой назе па-за чаргой. Чарга на замену суставаў, сапраўды, на жаль, вельмі вялікая. Таму існуе і пазабюджэтная форма работы, калі на падставе платнага дагавора хворы аперыруецца па-за чаргой.

***— Наколькі высокая верагоднасць развіцця ўскладненняў пасля такой аперацыі?***

— Аперацыя, пра якую мы гаворым, сёння добра вядомая, сацыяльна адаптаваная. Канструкцыі выраблены, якія прымяняюцца, таксама добрыя, прычым як айчынныя, так і замежныя. Іншая справа, мы ставім пратэз, свайго роду «стрэмку» вагой каля 800 грамаў, і якім чынам арганізм адрэагуе на чужароднае цела, ніхто дакладна вам не скажа. Колькі часу будзе выкарыстоўвацца гэты выраб, як сябе будзе адчуваць пры гэтым пацыент, залежыць ад шэрагу ўмоў, напрыклад, ад стану касцявой структуры. Чым больш трывалыя косці, тым, зразумела, лепш. Важнае значэнне мае і імунітэт, узрост. Ні ў нас, ні за мяжой ніхто вам не скажа, што самы дарагі выраб гарантавана адпрацуе сто гадоў.

***— Мідакалм, як вядома, здымае боль, але адпускаецца толькі па рэцэпце... Ці варта нам яго выпісваць, ці можна прымяняць у нашым выпадку?***

— Калі ў вашай маці 3-4 ступень коксартрозу, то прымяняць мідакалм можна, але трэба дакладна разумець, што ён не лечыць, а толькі здымае мускульнае напружанне, болевыя адчуванні.

***— Але горш не будзе?***

— Не будзе. Хоць і цяжка сказаць, наколькі менавіта стане лепш...

***☎— Мінск, Сяргей Рыгоравіч. Мне 86 гадоў. На вайне перанёс кулявое раненне з пашкоджаннем абедзвюх сцегнавых касцей. Лячыўся ў шпіталі, аднак праходзіць літаральна пару месяцаў, і стан суставаў пагаршаецца. Хірург накіроўвае ў цэнтр траўматалогіі на замену сустава. Мне, здаецца, узрост ужо надта вялікі для аперацыі... Ці мае гэта значэнне?***

— Узрост не з'яўляецца супрацьпаказаннем да лячэння. Пацыенту можа быць колькі заўгодна гадоў, але калі ён будзе ў добрай фізічнай кандыцыі, яму выканаюць аперацыю. А можа быць і так, што 50-гадоваму пацыенту адмовяць у аперацыі, паколькі яго фізічны стан пакідае жадаць лепшага. Таму калі ў вас няма супрацьпаказанняў, аператыўнае ўмяшанне можна выконваць. Сёння прымяняецца добры анастэзіялагічны дапаможнік, ёсць і добрая рэабілітацыя. Цэнтр траўматалогіі і артапедыі мае вельмі вялікі вопыт выканання падобных аперацый, так што трэба думаць пра поспех у гэтай справе. Галоўнае — настроіцца, паколькі любая аперацыя ўсё роўна з'яўляецца пэўным выпрабаваннем для арганізма.

***☎— Віцебская вобласць, Ала Іванаўна. Ці можна зрабіць аперацыю па замене тазасцегнавога сустава ў Мінску?***

— Платна, вядома ж, можна. Можаце пазваніць на нашу кафедру, і мы вырашым гэтае пытанне.

***— Кажуць, што гадоў праз дзесяць заменены сустаў трэба зноў мяняць. Ці ёсць такія, што служаць пажыццёва?***

— Вытворцы штучных суставаў даюць на сваю прадукцыю гарантыю ад 20 да 50 гадоў. Але ж ніхто не можа даць гарантыю на тое, як выраб будзе паводзіць сябе ў вашым арганізме, якім чынам будзе функцыянаваць.

***☎— Бешанковічы, Людміла Іванаўна. Мне 55 гадоў. Дыягназ — астэаартроз каленных, тазасцегнавых, галёнкаступнёвых суставаў другой стадыі. Якім павінна быць лячэнне? Ці можна неяк аднавіць храсткі?***

— Вы працуеце?

***— З-за хваробы ўжо не...***

— У вас генералізаваная форма астэаартрозу, і аднавіць храсткі так, каб яны былі, як гадоў дваццаць назад, не ўяўляецца магчымым. Дапамагчы ж вам, вядома, можна. Вам будзе паказана перыядычнае санаторна-курортнае лячэнне — ванны, гразелячэнне, парафіналячэнне і іншыя працэдуры, а таксама прымяненне прэпаратаў з хандрапратэктарным дзеянне, якія дапамагаюць аднавіць храсток — структум, тэрафлекс. Такое комплекснае лячэнне не вылечыць, але адназначна палегчыць ваш стан і будзе затрымліваць развіццё паталогіі.

***— А колькі піць структум, хандразамін?***

— Мінімум тры месяцы, пасля чаго — перапынак да двух месяцаў, і вы зноў паўтараеце курс гэтай тэрапіі.

***— А што не рэкамендуецца з харчавання?***

— Для такіх суставаў не рэкамендуецца тлустая ежа, лепей трымацца міжземнаморскай дыеты — паболей гародніны, садавіны, а таксама морапрадукты, малочныя прадукты, аліўкавы алей.

***— Чула, што для храсткоў карысны адвар з курыных ножак...***

— Народная медыцына хоць і існуе, але не з'яўляецца доказнай. Асабіста я не магу вам сказаць: ужывайце курыныя ножкі, і храсткі стануць як новыя.

***— Куды ў Мінску можна звярнуцца па кансультацыю?***

— У Мінску ёсць Рэспубліканскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння. На базе гэтага цэнтра працуе Прафесарска-кансультацыйны цэнтр Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Па нумары 8 (017) 265 06 25 можна запісацца да любых спецыялістаў, у тым ліку да рэўматолага, траўматолага, і атрымаць належную кансультацыю.

***☎— Кіраўскі раён, Irap Васільевіч. Мне 45 гадоў. Дыягназ — астэаартроз. Прымаў тэрафлекс, цяпер калю алфлутоп. Зменаў асаблівых няма, і здаецца, тая ж праблема пачынаецца з другім каленным суставам. Што рабіць?***

— Вам трэба звярнуцца ў Магілёўскую абласную бальніцу да траўматолага. Ён прыме рашэнне адносна таго, чым можна вам дапамагчы. Хутчэй за ўсё, таблеткамі тут не абысціся, трэба прыбягаць да аператыўнага ўмяшання.

***— А накіраванне з Кіраўска браць?***

— Так, я думаю, вам без праблем яго дадуць.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

## Амерыканскія аўтобусы вымушаны адаптавацца пад таўстуноў

**З-за павелічэння колькасці поўных пасажыраў Федэральнае ўпраўленне гарадскога транспарту ЗША прапанавала перагледзець патрабаванні бяспекі ў аўтобусах.**

Сучасныя рэкамендацыі, заснаваныя на звестках аб вазе сярэдняга амерыканца, былі атрыманыя яшчэ ў пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя. Згодна з гэтымі звесткамі, сярэдняя вага дарослага амерыканца складае 68 кілаграмаў, аднак, па падліках Цэнтра кантролю і прафілактыкі захворванняў, на гэты момант сярэдні амерыканец ва ўзросце 20 гадоў і старэй важыць 88,3 кілаграма, а сярэдняя амерыканка — 74,7 кілаграма.

У сувязі з гэтым прапанавана павялічыць вагу ўмоўнага пасажыра да 79,4 кілаграма. Акрамя таго, плошчу падлогі аўтобуса, якую займае адзін чалавек, плануецца павялічыць да 929 квадратных сантыметраў. Кіраўнік Інстытута развіцця буйных гарадоў пры Універсітэце Дэпола ў Чыкага Джозэф Швітэрман заявіў, што «гэта будзе больш рэалістычна».

Паказчык сярэдняй вагі пасажыра выкарыстоўваецца пры выпрабаваннях аўтобусаў на бяспеку, а таксама пры разліках максімальна дапушчальнай колькасці пасажыраў у аўтобусе. Калі прапанаваныя паказчыкі будуць прынятыя, то ўмоўны пасажыр аўтобуса ўсё роўна будзе худзейшы за ўмоўных пасажыраў суднаў і самалётаў, вага якіх складае адпаведна 83,9 і 86,1 кілаграма ці 88,4 кілаграма (у залежнасці ад пары года).

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Меню для вельмі моцнага полу

Інфарм-укол

**Заходнія медыкі даўно высвятляюць, што менавіта павінна прысутнічаць у рацыёне мужчын. У выніку з'явіўся пералік прадуктаў, закліканы дапамагчы моцнаму полу адчуваць сябе на «5+». Паводле слоў валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ, мужчынам любога ўзросту неабходна звяртаць увагу на наступныя прадукты:**

### 1. Вустрыцы.

Яны ўтрымліваюць вельмі многа цынку, які адказвае за рэпрадуктыўную функцыю ў мужчын. Дэфіцыт гэтага мінералу можа прывесці да самых непажаданых наступстваў: затрымкі росту, парушэння функцыі прастаты, бясплоднасці і г.д. Дэфіцыт цынку не пагражае таму, хто будзе штодня ўжываць хоць бы некалькі вустрыц. Калі ж гэта не па кішэні, можна замяніць іх на насенне гарбуза, нятлустую ялавічыну, грэцкія і кедравыя арэхі, не настолькі багатыя на цынк.

### 2. Бананы.

Дзякуючы высокаму ўтрыманню жалеза, яны цудоўна дапамагаюць пры анеміі. Такое рэчыва, як трыптафан, спрыяе паляпшэнню стрававання, а калій — зніжэнню артэрыяльнага ціску. Лічыцца нават, што разумнае ўключэнне ў рацыён бананаў здольнае зменшыць рызыку ўзнікнення інсульту. Акрамя бананаў, падобныя праблемы вырашаюць апельсіны і таматы.

### 3. Тлустая рыба.

Ласось, тунец, сардзіны, макрэль, селядзец з'яўляюцца багацейшай крыніцай тлустых кіслот амега-3, якія ўмацоўваюць імунную сістэму, зніжаюць рызыку захворвання на рак прастаты, паляпшаюць работу сэрца.

### 4. Брокалі.

Гэты прадстаўнік крыжакветкавых вельмі папулярны апошнім часам. Вучоныя запэўніваюць, што 5 порцый крыжакветкавых прадуктаў на тыдні зніжаюць верагоднасць ўзнікнення раку мачавога пузыра, які ў мужчын сустракаецца часцей, чым у жанчын. Замест брокалі можна ўжываць хоць бы любыя віды капусты.

### 5. Бразільскі арэх.

Яго магутныя антыаксіданты — магній і селен — не толькі папярэджваюць сардэчныя хваробы, але і зніжаюць верагоднасць захворвання на рак. Дастаткова ўжываць 1-2 арэшкі ў дзень. На селен багатыя мяса індычкі, а таксама тунец і малюскі.

### 6. Цэльнае зерне.

Цэльнае зерне забяспечвае патрэбы ў клятчатцы, мінералах і вітамінах. Клятчатка дапамагае знізіць «дрэнны» халестэрын. 20-25 г растваральнай клятчаткі ў дзень можна атрымаць з талакна, яблык, груш, бабоў.

### 7. Ягады.

Акрамя вітаміну С, яны ўтрымліваюць незлічоную колькасць кампанентаў з антыаксідантымі вартасцямі. Дабаўленне ў рацыён ягад будзе запавольваць старэнне.

### 8. Агародніна.

Вітамін С і бэта-карацін — антыаксіданты, якія дапамагаюць захаваць здаровыя клеткі скуры, папярэдзіць працэсы акіслення. Спажыўныя элементы можна атрымаць з любой агародніны — напрыклад, перца, морквы ці бульбы. Ніколі не забывайцеся і на лісцевую гародніну ды зяленіва.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Карыснае — смачна

# КАРЫЧНЕВЫ ДЫЕТОЛАГ

**Дыетолагі настойліва рэкамендуюць замяняць прывычны гарнір з белага рысу на больш экзатычны і карысны карычневы рыс. Іх падтрымліваюць эндакрынолагі, якія сцвярджаюць, што менавіта цёмны рыс уратуе ад дыябету.**

Карычневы рыс — суцэльны рыс, гэта значыць пры яго апрацоўцы аддзяляецца толькі шалупіна. Вотруб'евая абалонка, якая надае зярнятам карычневае адценне, застаецца. Захоўваецца і зародкавы слой. Менавіта ў іх і сканцэнтраваныя ўсе натуральныя пажыўныя рэчывы, якімі прырода шчодра ўзнагародзіла рыс, — складаныя вугляводы, бялкі, вітаміны, мінералы.

А даведацца пра харчовую каштоўнасць яго суцэльных зерняў дапамагла хвароба пад назвай беры-беры, якая лютавала ў мінулыя стагоддзі. Першымі з ёй сутыкнуліся суднавыя ўрачы. У маракоў падчас далёкага плавання паступова знікаў апетыт, да поўнага адмаўлення ад ежы. Яны пакутавалі ад млоснасці, галавакружэння, ацёкаў, сардэчных і мускульных боляў, галюцынацый. Прычына хваробы заставалася невядомай да таго часу, пакуль дацкія ўрачы ў 1926 годзе не адкрылі тыямін — вітамін групы В. Высветлілася, менавіта яго дэфіцыт прымушаў так пакутаваць маракоў, якія харчаваліся выключна белым, гэта значыць ачышчаным, рысам.

Не палохайцеся, у цяперашні час белы рыс узбагачаецца ўсімі пажыўнымі рэчывамі, страчанымі пры шліфоўцы. Але, як вы разумееце, карычневаму рысу гэта не патрабуецца. Таму ён надзвычай карысны для арганізма чалавека. Напрыклад, возьмем адну з самых актуальных праблем жанчыны — залішняя вага. І паглядзім, як яна вырашаецца з дапамогай карычневага «дыетолага».

Страта стройнай фігуры часта прыгнятае жанчыну. Яна становіцца празмерна ранімай, набывае масу комплексаў. Дык вось, дыета з уключэннем карычневага рысу здольная вярнуць ёй душэўную раўнавагу. Дзякуючы таму, што ў рысе ёсць той самы тыямін і іншыя вітаміны групы В, якія «сочаць» за нервовай сістэмай і энергетычным балансам арганізма.

Лішняя вага заўсёды ідзе поплеч з залішнім халестэрынам, павышаным цукрам крыві, высокім артэрыяльным ціскам, вяласцю мышцаў. І тут карычневы рыс — незаменны памагаты. Пажыўныя рэчывы ўтрымліваюцца ў ім менавіта ў такой прапорцыі, якая неабходная арганізму.

Складаныя вугляводы папаўняюць патрэбу ў цукры. Яны ж сумесна з кальцыем і магніем, пры невялікай колькасці натрыю і пры поўнай адсутнасці тлушчаў, пазітыўна адбіваюцца на крывяным ціску. Такім чынам, змяншаецца рызыка сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Такое рэчыва, як гама-арызанол (экстракт рысавага ротруб'я), зніжае ўзровень халестэрыну ў крыві і спрыяе нармальнай рабоце каранарных сасудаў. Восем найважнейшых амінакіслот, што ўваходзяць у склад бялку, падтрымліваюць тонус мышцаў, захоўваюць іх пругкасць і моц. І пры гэтым, заўважце, у карычневым рысе няма глютэну — раслиннага бялку, які выклікае харчовую алергію. Гэта значыць, ён падыходзіць тым, хто схільны да алергічных рэакцый.

Неачышчаныя зярняткі цёмнага рысу таксама дапамагаюць прадухіліць парушэнні абмену рэчываў, з якіх найбольш распаўсюджаны цукровы дыябет II тыпу.

Клятчатка і крухмал нармалізуюць работу страўніка і кішэчніка, папярэджваюць развіццё запаленчых працэсаў у іх. Важна і тое, што рыс падчас гатавання ўбірае ў сябе ваду і павялічваецца ў аб'ёме, таму дастаткова невялікай порцыі, каб наступіла сыць і знікла адчуванне голаду, якое пастаянна суправаджае поўных людзей.

Як бачыце, карычневы рыс — ідэальны прадукт для паўнацэннай дыеты. Невыпадкова дыетолагі і прыхільнікі здаровага ладу жыцця аддаюць яму перавагу.

**ДАРЭЧЫ**

● Карычневы рыс па прычыне ўтрымання алеяў у вотруб'евай абалонцы захоўваецца каля паўгода. Каб падоўжыць гэты тэрмін, трымайце рыс у герметычнай ёмістасці ў халадзільніку.

● Стравы з адварным рысам зробяць разнастайнымі (да таго ж, павялічаць іх біялагічную каштоўнасць) наступныя натуральныя спецыі:

для надання мексіканскага водару — арэгана;

каб адчуць смак Італіі — часнок, базілік і цыбуля;

для смаку французскай кухні — размарын, базілік і цыбуля;

арыгінальны водар нададуць рысу таксама перац чылі, часнок і кінза.

**САЛОДКІ ПЛОЎ ПА-ІНДЫЙСКУ**

У казане распусціць 80 г алею або топленага масла, усыпаць 2 шклянкі рысу і злёгку абсмажыць. Пакласці сухафрукты — па 1/3 шклянкі курагі і чарнасліву. Дадаць спецыі (кардамон, гваздзіку, карыцу, шафран), а таксама соль і цукар на смак. Смажыць яшчэ 5—7 хвілін, памешваючы час ад часу. Заліць усё вадой так, каб яна перавышала ўзровень рысу на 2—3 см. Давесці да кіпення і варыць на моцным агні, пакуль узровень вады не зраўняецца з узроўнем рысу. Прыкрыць накрыўкай і трымаць на слабым агні да поўнай гатоўнасці. Выкласці плоў горкай на сподак. Зверху пасыпаць здробненымі арэхамі.

**РЫБА З РЫСАМ ПА-РУСКУ**

Філе марской рыбы нарэжце невялікімі скрылікамі таўшчынёй 2—3 см. Складзіце ў эмаліраваны посуд і раўнамерна засыпце дзвюма чайнымі лыжкамі сухой гарбаты, а затым перцам гарошкам, папярэдне здрабніўшы яго. Накрыйце накрыўкай і пакіньце на 15 хвілін. Затым дадайце шклянку малака і пастаўце на агонь. Калі малако закіпіць, уліце яшчэ адну шклянку малака, пакладзіце 200 г адварнога рысу і чайную лыжку сухой гарбаты. Дайце патаміцца сумесі на вельмі слабым агні пад накрыўкай да поўнай гатоўнасці рыбы.

Гарбата ў спалучэнні з карычневым рысам надае марской рыбе непаўторны водар. Есці гэтую страву можна і ў гарачым, і халодным выглядзе. Як гурманам, так і вегетарыянцам.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Организация:

## ОАО «Мостоотряд № 88»

Учетный номер плательщика: **УНП 100299744**
Вид деятельности: **Строительство**
Организационно-правовая форма: **ЧАСТНАЯ СОБСТВЕННОСТЬ**
Орган управления: **Департамент «Белавтодор»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220075, г. Минск, ул. Промышленная, 16**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 12358 | 13220 |
| амортизация | 102 | 8370 | 8480 |
| остаточная стоимость | 110 | 3988 | 4740 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 1 | 1 |
| амортизация | 112 | | 1 |
| остаточная стоимость | 120 | 1 | |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | | |
| амортизация | 122 | | |
| остаточная стоимость | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | | |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | | |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ I | 190 | 3989 | 4740 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 986 | 1358 |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 859 | 1312 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 97 | 10 |
| расходы на реализацию | 214 | | |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | | |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | 30 | 36 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 3 | 6 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | | |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 1828 | 1488 |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 1756 | 646 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 72 | 838 |
| по налогам и сборам | 243 | | |
| по расчетам с персоналом | 244 | | 4 |
| разных дебиторов | 245 | | |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями | 250 | | |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | |
| Денежные средства | 260 | 28 | 62 |
| В том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | | |
| Финансовые вложения | 270 | | |
| Прочие оборотные активы | 280 | | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 2845 | 2914 |
| БАЛАНС (190 + 290) | 300 | 6834 | 7654 |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 63 | 63 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | 372 | 447 |
| В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 372 | 447 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | 4310 | 5145 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | x | |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 610 | 444 |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 5355 | 6099 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | | |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | | |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 144 | 170 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 1335 | 1385 |
| В том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 972 | 356 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 27 | 674 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 143 | 154 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | 1 | 3 |
| по налогам и сборам | 625 | 142 | 139 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 44 | 52 |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 6 | 7 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | | |
| В том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 1479 | 1555 |
| БАЛАНС (490 + 590 + 690) | 700 | 6834 | 7654 |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | 17 | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 1318 | 1385 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | | |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | | |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | | 9 |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | | |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | 6 | 6 |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 1056 | 1078 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | | 1 |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | 6 | 6 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 11530 | 9048 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 1922 | 1415 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 9608 | 7633 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 9606 | 7348 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 2 | 285 |
| Управленческие расходы | 050 | | |
| Расходы на реализацию | 060 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | 2 | 285 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 462 | 405 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 68 | 54 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 394 | 35 |
| В том числе: проценты к получению | 091 | | |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активами | 093 | 394 | 351 |
| прочие операционные доходы | 099 | | |
| Операционные расходы | 100 | 150 | 241 |
| В том числе: проценты к уплате | 101 | | |
| расходы от операций с активами | 102 | 150 | 241 |
| прочие операционные расходы | 109 | | |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | 244 | 110 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 210 | 143 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 8 | 2 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 202 | 141 |
| Внереализационные расходы | 150 | 283 | 172 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -81 | -31 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ( +/-070+/-120+/-160) | 200 | 165 | 364 |

## Старшыня Петрыкаўскага райвыканкама Аляксандр ПІНЧУК:

# «НАШ ГАЛОЎНЫ АРЫЁНЦІР — ВЫКАНАННЕ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ»



**Угэты палескі раён мінулы раз наша звяздоўская брыгада прыязджала ў ліпені 2010 года, калі стаяла страшэнная спякота. Зараз жа мы наведаліся туды ў сярэдзіне сакавіка, калі закончыліся зімовыя сцюжы і набірала сваю сілу цёплае надвор'е. А ў выніку — інтэнсіўны пад'ём вады ў Прыпяці з яе прытокамі і дзе-нідзе — падтапленне асобных падворкаў некаторых вёсак.**

**І гэта — калі рэчкі яшчэ былі закаваныя лёдам. Небяспечным узроўнем пад'ёму вады лічыцца адзнака ў 780 сантыметраў, а тыдні два ці тры таму той узровень дасягаў 829 сантыметраў, што больш за леташні ўзровень роўна на адзін сантыметр. Праўда, маразы зноў пайшлі ў наступ, і ў тыя дні, калі мы наведаліся ў раён, узровень вады ўпаў да 807 сантыметраў. Але ж ён не знізіўся да бяспечнага ўзроўню.**

Старшыня райвыканкама Аляксандр ПІНЧУК.

## Водная сітуацыя — пад кантролем

Таму першае пытанне, якое мы задалі **старшыні райвыканкама Аляксандру ПІНЧУКУ**, якраз было пра блізкую вясновую паводку, пра падрыхтоўку да яе наступстваў.

— У нас на Палессі гавораць: вада — як госця: прыйшла і пайшла, — адзначае Аляксандр Васільевіч. — Вясновая паводка для мясцовых жыхароў — звыклая жыццёвая справа, і вакол яе ніякага ажыятажу няма, бо ўсім вядома: вось пацяплее, знікне паўсюдна снег, рэкі вызваляцца ад лёду, і пачнецца паводка. У раёне гатовы да розных сітуацый, у тым ліку і да няштатных. Адным словам, усё будзе знаходзіцца пад кантролем. Мы дзейнічаем і будзем дзейнічаць па дакладна распрацаваным плане, які ўжо неаднаразова апраўдваў сябе.

***— Што вы маеце на ўвазе?***

— Шэраг намечаных аргтэхмерапрыемстваў. Напрыклад, мяркуецца частку насельніцтва вёскі Мардвін і асабліва дзяцей часова перасяліць у райцэнтр, бо ў мінулым месяцы, калі паднялася вада ў Прыпяці, былі праблемы з дастаўкай дзяцей у Снядзінскую школу. У той жа самы час невялікая вёска Таргашы была адрэзана балоцістай нізінай ад «мацерыка». Лічым, што сітуацыя можа паўтарыцца яшчэ ў большай ступені.

Таму ў крамы зарэчных вёсак у дастатковай колькасці завезены прадукты харчавання, тэхніка заўсёды ў поўнай гатоўнасці, не будзе перабояў у рабоце сувязі, забеспячэння газам, падвозам дзяцей у школы і г. д. Сельсаветам дадзена ўказанне завезці піламатэрыялы, каб пры неабходнасці, калі вада пойдзе ў хаты вяскоўцаў, можна было рабіць насыпі для падняцця на іх мэблі. Пэўныя работы выкананы і на дамбах.

***— А дзе размесцяць жывёлу?***

— У грамадскім сектары тых населеных пунктаў, якія могуць быць падтоплены, жывёлы няма, а жывёла асабістых падворкаў будзе пераведзена ў больш высокія месцы. Адным словам, сітуацыя з паводкай будзе знаходзіцца пад кантролем.

***— Напэўна, адным з галоўных клопатаў зараз у раёне, Аляксандр Васільевіч, з'яўляецца і падрыхтоўка да веснавой сяўбы. У якой стадыі яна знаходзіцца?***

— Не будзе перабольшваннем сказаць, што гатоўнасць да яе ў нас нармальная. Забяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі вышэй за леташнюю: калійных закуплена ўжо 120 працэнтаў ад патрэбнага, арганікі на палі вывезена 295 тысяч тон пры плане 300 тысяч тон. Заканчваем рамонт тэхнікі. У дастатковай колькасці гаспадаркі маюць энерганасычаных трактароў, а ёсць і зусім новая тэхніка, гарантыйныя тэрміны якой яшчэ не скончыліся.

## Дзяржаўная праграма ў дзеянні

***— Усім вядома, што ваш раён з'яўляецца адным з тых, дзе ажыццяўляецца Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Што ў гэтым напрамку было зроблена летась?***

— Гэтая праграма прадугледжвае выкананне 86 мерапрыемстваў з агульным аб'ёмам фінансавання ў 377 654 мільёны рублёў, у тым ліку летась — 20 мерапрыемстваў з аб'ёмам фінансавання ў суме 30 080 мільёнаў рублёў. Усе яны, акрамя аднаго, якое будзе закончана ў бліжэйшы час, рэалізаваны. Так, створана вытворчасць па вырабе паліўных шчэпак, адкрыты тры аграсядзібы, пабудаваны ў гарадскім пасёлку Капаткевічы гандлёвы павільён тыпу «міні-магазін», арганізавана развіццё ўнутранага і ўязнога турызму ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» і заказніках рэспубліканскага і мясцовага значэння, распрацаваны туры выхаднога дня і экскурсій для ўсіх катэгорый насельніцтва. Зроблена тэхнічнае перааснашчэнне лесанарыхтоўчай тэхнікі ў Петрыкаўскім лясгасе, праведзена нарыхтоўка прадукцыі пабочнага лесакарыстання (бярозавага соку, жывіцы сасновай, мёду, чарнаплоднай рабіны) і г. д.

Намеснік райвыканкама Генадзь ПАНАМАРЭНКА.

***— Мяркуем, што ў гэтай новай справе былі пэўныя цяжкасці...***

— Асаблівых праблем з фінансаваннем не было, праўда, не па ўсіх аб'ектах была гатова праектна-каштарысная дакументацыя, і гэта выклікала пэўныя нязручнасці.

***— А як выглядае Дзяржаўная праграма на сёлета?***

У гутарку ўключаецца **намеснік старшыні райвыканкама Анатоль ФУРСА**:

— Аб'ёмы будаўніцтва і фінансавыя ўкладанні на 2011 год значна большыя. Трэба асвоіць 80 мільярдаў рублёў па мерапрыемствах Дзяржаўнай праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся. Асаблівы акцэнт у ёй зроблены на малочную галіну, у сувязі з чым запланавана пачаць будаўніцтва і рэканструкцыю дзесяці малочнатаварных фермаў. І на сённяшні дзень распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя, вызначаны падрадныя арганізацыі, пачалося адкрыццё фінансавання. Работы вядуцца ўжо на пяці аб'ектах, два з якіх пераходныя з мінулага года: у КСУПах «Запаветы Ільіча» і «Камаровічы».

Вялікі аб'ём работ трэба выканаць таксама ў сацыяльнай сферы: будаўніцтва бібліятэкі, рэканструкцыя стадыёна і цэнтра мастацтваў у Петрыкаве, будаўніцтва новай школы ў Грабаве і г. д.

## Радасць для навасельцаў

***— Нам вядома, Анатоль Уладзіміравіч, што летась была пабудавана новая школа ў Бабунічах, здадзены 50-кватэрны дом у райцэнтры і больш за трыццаць дамоў у сельскай мясцовасці. Што вы можаце дадаць да гэтага яшчэ?***

— Школа ў Бабунічах на 132 вучні пабудавана па найноўшым праекце і адрозніваецца ад падобных ёй кампаноўкай і насычанасцю неабходнага абсталявання. Адбылося добраўпарадкаванне чатырох аграгарадкоў. За кошт усіх крыніц фінансавання здадзена 14,5 тысячы квадратных метраў жылля.

Летась уступілі ў строй міні-цеплаэлектрацэнтраль, якая працуе на мясцовых відах паліва, і новыя ачышчальныя збудаванні, у якіх прыменена чэшская тэхналогія і аналагаў якім у Беларусі пакуль няма.

Асобна хачу сказаць, што ў Петрыкаве пачалася забудова новага жылога мікрараёна «Паўночны». Там апераджальнымі тэмпамі вядзецца пракладка камунікацый (каналізацыі, вода-, цепла- і энергазабеспячэння) і пачата ўжо будаўніцтва 40-кватэрнага дома, рыхтуецца закладка яшчэ аднаго. Жыллёва-будаўнічыя кааператывы ўжо сфарміраваныя. А наогул на чарзе на атрыманне жылля знаходзіцца зараз каля васьмісот чалавек. Мікрараён разлічаны на будаўніцтва 680 кватэр на працягу гэтай пяцігодкі. Прадугледжана тут і ўзвядзенне аб'ектаў сацыяльнай сферы. А ўсяго жылля ў горадзе і на сяле запланавана пабудаваць сёлета 15 тысяч квадратных метраў.

Ідзе загрузка лесаматэрыялаў.

## Зроблена нямала, але...

***— Аляксандр Васільевіч, якія напрамкі ў рабоце раённага выканаўчага камітэта былі прыярытэтнымі ў мінулым годзе, калі вы сталі яго кіраўніком?***

— Актывізацыя інвестыцыйнай дзейнасці, энерга- і рэсурсазберажэнне, нарошчванне экспартнага патэнцыялу, далейшае развіццё жыллёвага будаўніцтва, аграпрамысловага комплексу і сацыяльнай сферы, развіццё малых і сярэдніх гарадоў. Гэта зусім не азначае, што мы не займаліся іншымі пытаннямі. Асноўнае ж — гэта эканоміка, бо ад яе залежыць і раённы бюджэт, і жыццё людзей.

Так, за мінулы год з 16 прагнозных паказчыкаў у раёне выканана 9, у тым ліку па выпуску прамысловай прадукцыі (127,4 працэнта), вытворчасці спажывецкіх тавараў (122,2), экспарце паслуг (127,2), імпарце паслуг, сальда па паслугах (+500,7 тысячы долараў), капітал па падведамасных арганізацыях).

***— А што не ўдалося выканаць?***

Ніжэй узроўню 2009 года мы спрацавалі па двух паказчыках — валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі і экспарце тавараў. Летняя «афрыканская» гарачыня паставіла крыж на той вялікай падрыхтоўчай рабоце, якая была праведзена напярэдадні і ў час пасяўной кампаніі, і далейшым доглядзе раслін. Паказчыкі вытворчасці валавой прадукцыі не забяспечылі калектывы ўсіх 13 сельскагаспадарчых арганізацый.

У раслінаводстве недаатрымана прадукцыі ў супастаўных цэнах на 11,8 мільярда рублёў, а ў жывёлагадоўлі — на 3,2 мільярда. Мы прааналізавалі становішча спраў у сельскай гаспадарцы і канстатавалі, што, акрамя неадэкватных умоў надвор'я, негатыву дабавілі нізкая тэхналагічная дысцыпліна, адсутнасць сур'ёзных патрабаванняў да непасрэдных выканаўцаў з боку спецыялістаў і да т. п.

Галоўны бухгалтар філіяла Рэспубліканскага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Беларусьгандаль» у в. Муляраўка Наталля ДУРНАВО.

Для выхаду з крызіснай сітуацыі неабходна пачынаць з элементарнага — павышаць вытворчую і выканаўчую дысцыпліну ўсіх працаўнікоў, самым жорсткім чынам выкараняць негатыўныя з'явы, бо без гэтага немагчыма будзе забяспечыць павышэнне вытворчасці сёлета валавой прадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак на 10 працэнтаў. Адным словам, працы наперадзе шмат.

***— Калі вынікі дзейнасці прадпрыемстваў АПК вас засмуцілі, дык прамысловых прадпрыемстваў, напэўна, парадавалі?***

— Гэта сапраўды так. Росту аб'ёмаў прамысловай вытворчасці садзейнічала павышэнне работы на аснове мадэрнізацыі і тэхнічнага пераўзбраення іх, паляпшэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, умацаванне пазіцый на дзейных рынках збыту і асваенне новых рынкаў.

Напрыклад, летась у нас з'явілася новае экспартаарыентаванае прадпрыемства — філіял дзяржаўнага прадпрыемства «Беларусьгандаль», якое наладзіла выпуск паліўных гранул з пілавіння. На керамзітавым заводзе працягваюцца работы па мадэрнізацыі дзейнай вытворчасці: вядзецца рэканструкцыя вярчальных печаў абпалу, манціруюцца аспірацыйныя сістэмы, закончаны мантаж пласцінчатага транспарцёра. Пералік падобных мерапрыемстваў можна працягваць.

***— Няма сумнення ў тым, што райвыканкам падтрымлівае інтарэс інвестараў да прыярытэтных галін эканомікі раёна.***

Правільна. Так, напрыклад, з удзелам чэшскага капіталу (гандлёвае таварыства PLAZMA-CLASS s.r.o.) у выніку рэалізацыі раней дасягнутых перамоў летась на базе былога кормапрадпрыемства «Пціч» было створана сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Біясол», якое арганізоўвае вытворчасць паліўных гранул з саломы. У тым жа годзе па інвестыцыйным праекце было створана такое ж таварыства «Аквамінерал», якое плануе пабудаваць цэх па разліве мінеральнай вады.

А наогул летась аб'ём інвестыцый у асноўны капітал па раёне склаў 151,3 мільярда рублёў. Летась працягвалася работа і па развіцці прадпрымальніцтва, што атрымае працяг і сёлета.

Слова бярэ намеснік старшыні райвыканкама Генадзь Панамарэнка:

— У раёне на сёння зарэгістравана 327 індывідуальных прадпрымальнікаў і 72 камерцыйныя структуры, якія займаюцца рознымі відамі дзейнасці. Характэрна, што колькасць іх з года ў год узрастае, і гэта сведчыць пра тое, што стаўленне да іх у цэлым нармальнае, бо ў райвыканкаме яны атрымліваюць падтрымку ў рамках дзейнага заканадаўства.

У канцы лютага з прадпрымальнікамі адбылася сустрэча за «круглым сталом», дзе гутарка вялася з удзелам кіраўнікоў райвыканкама і яго структурных падраздзяленняў і службаў. Размова атрымалася адкрытая, канструктыўная і карысная для абодвух бакоў.

Пра тое, якую важную ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці раёна адыгрывае прадпрымальніцтва, якую стабільнасць надае яно эканоміцы, сведчыць хаця б вось гэтая лічба: уклад прыватнага бізнэсу ў бюджэт раёна складае каля 11 працэнтаў.

## Кадры вырашаюць усё

***— Аляксандр Васільевіч, згадзіцеся, што на эканамічны і сацыяльны патэнцыял кожнага рэгіёна ў значнай ступені ўплывае пытанне кадравай работы...***

— А я і не аспрэчваю гэта. Сёння кіраўніцкі корпус, аб'яднаны адным ёмкім словам «кадры», вызначае граматнасць рашэнняў праблем, якія ўзнікаюць у розных сферах жыцця раёна. Лічу, што ў райвыканкаме нармальная каманда, кожны намеснік старшыні і начальнікі аддзелаў на сваіх месцах і здольныя вырашаць тыя задачы, якія ім даручаны. У той жа час мы адчуваем вялікую падтрымку з боку абласнога выканаўчага камітэта па ўсіх пытаннях.

Хачу яшчэ сказаць, што дзякуючы кадрам мы шмат што зрабілі, дасягнулі пэўных поспехаў у розных галінах дзейнасці, выкананні сацыяльных стандартаў, і што яшчэ ёсць праблема няхваткі кадраў. Да нас летась прыбыло 187 маладых спецыялістаў, на якіх мы ўскладаем надзеі. Я сустракаўся з імі і пераканаўся, што яны здольныя на многае.

З мэтай іх замацавання адсочваем пытанні па стварэнні для гэтай катэгорыі работнікаў нармальных жыллёва-бытавых умоў. У той жа час разумеем, што патрабуе паляпшэння праца па ўдасканальванні практыкі пошуку, падрыхтоўкі і кантролю за прафесіянальным ростам і своечасовым вылучэннем кіраўніцкіх кадраў. У рэзерве павінны стаяць людзі, якія сапраўды хочуць ісці на павышэнне, і стаўку трэба рабіць на кіраўнікоў новага тыпу з сучасным мысленнем і інтэлектуальным багажом.

Начальнік аддзела па справах моладзі Вольга УСЦІНОВІЧ.

## Сустрэчы ў калектывах

Мы наведаліся ў некаторыя працоўныя калектывы і былі сведкамі таго, чым там заняты людзі, як яны спраўляюцца з даведзенымі заданнямі.

У ААТ «Аграсэрвіс», напрыклад, закончаны рамонт глебаапрацоўчай тэхнікі — дыскаў, пасяўных агрэгатаў — і ў майстэрні займаліся падрыхтоўкай збожжаўборачных і кормаўборачных камбайнаў. У другой майстэрні група рабочых завіхалася каля прэспадборшчыка, выраб якога наладжаны з фірмай «Ферабокс». Тут жа летась для гаспадарак раёна наладзілі выпуск прыстасаванняў для прыборкі снегу, якія навешваюцца на трактары, асвоілі выраб касілак для падкошвання травы на пашах.

У Муляраўцы аператар лясгаса Сяргей Марцынкевіч прадэманстраваў работу шчэпцыпліну ўсіх працаўнікоў, самым жорсткім чынам выкараняць негатыўныя з'явы, бо без гэтага немагчыма будзе забяспечыць павышэнне вытворчасці сёлета валавой прадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак на 10 працэнтаў. Адным словам, працы наперадзе шмат.

Аператар рубільна-драбільнай машыны лясгаса Сяргей МАРЦІНКЕВІЧ.

На фоне сучаснай лініі вытворчасці пялетнага біяпаліва галоўны інжынер Петрыкаўскага філіяла «Беларусьгандлю» Уладзімір СКАКОЎСКІ.

ці паліва на міні-ЦЭЦ і ў кацельнях раёна. Побач ішла загрузка двух вагонаў лесам.

Галоўны інжынер філіяла дзяржаўнага прадпрыемства «Беларусьгандаль» Уладзімір Скакоўскі пазнаёміў нас з вытворчасцю паліўных гранул (пялетаў), якія ў поўным аб'ёме экспартуюцца, а галоўны бухгалтар Наталля Дурнаво падкрэсліла, што прадукцыя экалагічна чыстая і што за два сёлетнія месяцы пялетаў адгружана ўжо 1800 тон — на 214 тысяч долараў.

Змястоўнымі былі гутаркі ў нас з дырэктарам Петрыкаўскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімірам Шостакам і сусаснавальнікам ААТ «Алангандаль» Анатолем Піскуном. А майстар Капаткевіцкай ПМК-4 «Гомельсаўгасбуда» Андрэй Якцо пазнаёміў нас са справамі на будаўніцтве 40-кватэрнага дома ў жылым мікрараёне «Паўночны». Работы тут ідуць у дзве змены, і брыгады плануюць закончыць аб'ект у сёлетнім ліставападзе.

Усюды мы бачылі старанне людзей, імкненне працаваць з поўнай аддачай...

**Алена ДАЎЖАНОК,**
**Віктар БОЙКА.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

*УНП 400065489*

Кіраўнікі ТАА «Алангандаль» Анатоль ПІСКУН і Аляксандр ГАНЧАРЭНКА.

Муляр Дзмітрый СТРАКАЧ.

Узводзіцца новы жылы мікрараён «Паўночны» у Петрыкаве.

Галоўны інжынер Петрыкаўскага «Аграсэрвіса» Канстанцін ЗУБАР *(справа)* і слесары Аляксандр БОЎСУН, Сяргей МАШУК, Уладзімір СІРАШ, якія сабралі ўжо некалькі новых прэс-падборшчыкаў.

# ПЯТНІЦА, 8 КРАСАВІКА

## ПЕРШЫ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00 (з сурдаперакладам), 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**6.05, 7.10, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.05, 8.10, 19.30** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.10, 19.50 Серыял «Маргоша».**
**10.10 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**11.00, 17.55 Серыял «Зацьменне».**
**12.10 Меладрама «Вораг № 1».**
**14.05** «Школа доктара Камароўскага».
**14.30** «Кухар дома».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50 Серыял «Ганначка».**
**16.50** Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё».
**19.25** «КЕНО».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00 Камедыя «Кікуджыра».**
**0.30** «Праверка чутак».
**1.00** «Неразгаданая гісторыя». «Забойства ў Дзілі Плаза».
**1.55** Дзень спорту.

## АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.20 Серыял «Мая жонка мяне прыварожыла».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Архіпелаг «Стройлаг».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольная закупка».
**13.45** «Модны прыгавор».
**14.50** «Зразумець. Дараваць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.05 Серыял «Слова жанчыне».**
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**22.25** «Фабрыка зорак. Вяртанне».
**0.45** «Наша Бераша».
**1.20** Начныя навіны.

## ЛАД

**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 21.15** Тэлебарометр.
**8.05** Час футбола.
**8.35, 17.50 Серыял «Ты маё жыццё».**
**9.35 Камедыя «12 крэслаў».**
**11.05** Кінапробы.
**11.25** Жывы гук.
**12.05** «Халі-галі». Скетч-шоу.
**12.25** «Ты — тое, што ты ясі».
**13.20** Гадзіна суда.
**14.20 Маст. фільм «Юрка — сын камандзіра».**
**15.45** М/с «Сямейка піратаў».
**16.10** Пазакласная гадзіна.
**16.25 Серыял «Анатомія Грэй-5».**
**17.20** Усё пра бяспеку.
**18.55** Хакей. Таварыскі матч. Беларусь — Чэхія. У перапынку: Калыханка.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**22.15** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.50** Хакей. КХЛ. Плэй-оф. Фінал.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.25 Серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Заключная серыя.**
**9.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40 Серыял «Трымай мяне мацней».**
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35 Серыял «Агонь каханння».**
**13.50 Серыял «Турысты».**
**14.40 Серыял «Рэдакцыя».**
**15.30 Серыял «Хірамант 2». Заключная серыя.**
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**18.30** Ток-шоу «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.20** «Добры вечар, малы».
**20.40 Камедыя «Вячэра з дурнем».**
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьма-нявідзьма».
**0.15 Маст. фільм «Жорсткая міласэрнасць».**
**1.55 Серыял «Спецназ».**

## МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05, 9.35** «Рэспубліка сёння».
**5.20, 15.20** «Даведнік».
**6.05** «Цік-так».
**6.20** «У гасцях у Вітамінкі».
**7.05** «Тут быў я».
**7.35 Серыял «33 квадратныя метры».**
**8.05** «Жывая гісторыя».
**9.05** «Смачны свет».
**10.05 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**11.05, 3.30 Маст. фільм «Напярэдадні прэм'еры».**
**13.05** М/с «Рыцары магіі».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.05** «Хіт-экспрэс».
**16.05, 0.05 Серыял «Вылечванне каханнем».**
**18.20** «Акцэнты».
**18.30, 3.00** «Нана на здароўе».
**19.00 Маст. фільм «Нічога асабістага».**
**21.20** «Неверагодная праўда пра зорак».
**22.20 Маст. фільм «Кінгсайз».**
**2.00** «Па хвалях маёй памяці».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 10.55, 19.40, 21.10, 0.00** «Надвор'е».
**7.05, 17.40 Серыял «Прытворшчык».**
**8.00, 18.35 Серыял «Урон».**
**9.00** «Мой любімы гадаванец».
**9.30, 16.00** Мультпарад.
**9.50, 16.20** Падагульняючы дзённік «Новай хвалі».
**10.00, 19.45 Серыял «Сага пра Фарсайтаў».**
**11.00 Фантастыка «Рэгенезіс».**
**12.45** «Кінаблакнот».
**13.05 Драма «Сланечнік».**
**15.00 Серыял «Нікіта».**
**16.30** Дак. фільм «Карэя. Сакрэт эканамічнага развіцця».
**17.00** «Адшукваецца адпачынак».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «К-відэа для ўсёй сям'і».
**21.15 Камедыя «Прафесіянал».**
**23.10** Покер дуэль.

## ВТБ

**6.00, 23.30** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Кадзэцтва».**
**11.00, 14.00 Серыял «Гром у раі».**
**12.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**16.00 Меладрама «Лепшы ўдар».**
**21.00 Камедыя «Лёгкія грошы».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой сярэбраны шар. Настасся Вярцінская».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 16.20 «Кулагін і партнёры».**
**12.00, 20.30 Серыял «Вапражба пры свечках».**
**13.50, 16.50, 19.50, 0.15** Навіны—Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «З новым домам!» Ток-шоу.
**17.35 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**18.45 Серыял «Ефрасіння».**
**20.30** «Юрмала».
**22.20 Маст. фільм «Пясочны дождж».**
**0.25 Маст. фільм «Залатая баба».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «НТБ раніцай».
**8.35** «Вочная стаўка».
**9.35, 15.30, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**10.20** «І зноў прывітанне!».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суда».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія — рэпарцёр».
**16.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.35** «Следства вялі...».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** «Ванга вяртаецца! Сакрэтны архіў прарочыцы».
**22.25** «НТБшнікі».
**23.35** «Дзіўны пол».
**0.45 Серыял «Тэрмінал».**

## ТНТ

**5.00** «Невытлумачальна, але факт».
**6.00, 11.10** «Нікеладэон на ТНТ».
**7.30 Серыял «Клас».**
**8.00, 1.00 «Бывае і горш». Серыял.**
**8.30, 17.00, 19.00 «Універ». Сітком.**
**9.30, 13.00, 18.30 Камедыя «Шчаслівыя разам».**
**10.40** «Маска». М/с.
**13.30, 22.00** «Дом-2».
**15.25 «Улётны транспарт». Камедыя.**
**17.30 «Рэальныя хлопцы». Серыял.**
**18.00 «Інтэрны». Сітком.**
**19.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**20.00** «Камедзі Клаб».
**21.00** «Наша Russia».
**23.30** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**0.00** «Камедзі Клаб».
**2.00 Камедыя «Не кажыце маме, што нянька здохла».**
**4.10** «Камедыянты».
**4.20 «Саша + Маша». Серыял.**

## ІНТЭР+

**6.30, 7.10, 7.35, 8.10, 8.35** З новай раніцай.
**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**9.10** Адзін у полі.
**10.00** Феерыя падарожжаў.
**10.20 Серыял «Простыя іскіны».**
**10.50 Серыял «Свая каманда».**
**11.15, 20.35 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**12.15 Маст. фільм «Што ў Сенькі было».**
**13.30** Пазаводчы.
**14.15 Маст. фільм «Пані Марыя».**
**15.35 Маст. фільм «Гоя, або Цяжкі шлях пазнання».**
**17.45** Формула кахання.
**18.30, 3.35 Серыял «Агонь кахання».**
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**21.20, 5.05** Разбор палётаў.
**22.05 Серыял «Юрыкі».**
**22.35** Вялікая палітыка.
**1.15** Д/п «Мая краіна».
**1.40** Дак. фільм «Вяршыня Візбара».
**5.50** Украінская топ-дваццатка.

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Ералаюс».
**9.00, 14.30, 18.30, 22.30** Навіны культуры.
**9.15** Галоўная роля.
**9.30, 1.50** Праграма перадач.
**9.40 «Тэма». Маст. фільм.**
**11.20** «Вайна Жозэфа Коцінa».
**11.45** «Чарадзейны Егіпет: хронікі вечнасці». Дак. фільм.
**12.35** «Пісьмы з правінцыі». Новачаркаск.
**13.05 «Карціна». Маст. фільм.**
**14.40** «У музей — без павадка».
**14.50** «Мураш-хвастунок». М/ф.
**15.10** «За сямю пячаткамі».
**15.40** «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
**16.05** «Хто мы?».
**16.35, 21.45** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.50** Білет у Вялікі.
**17.30** «Жыве аперэта!».
**18.50 «Стагоддзе Мапасана. Аповесці і аповеды XIX стагоддзя». Маст. фільм.**
**20.50** «Лінія жыцця».
**22.00** «Парадны партрэт улады».
**22.50** Прэс-клуб XXI.
**23.45** «Хто там...».
**0.10** «Ноч у музеі».
**0.55** Канцэрт Аляксея Іашчанкі і аркестра Сяргея Жыліна.
**1.45** «Поль Гаген». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Праграма «А». 1989 год.
**5.55** «Інстытут чалавека». 1992 год.
**6.25** Канцэрт Ігара Стравінскага. 1962 год.
**6.50, 12.40 «Бумбараш». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.05** «Я сама». 1995 год.
**11.00** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**11.15** «Адзін дзень савецкага салдата». Дак. фільм.
**11.40** «Эстрадны вернісаж». 1991 год.
**16.05** «Тэма». 1993 год.
**17.00** «Народны артыст СССР Васіль Мяркур'еў». 1979 год.
**18.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк».
**18.40 «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1981 год.**
**21.00** «Колба часу».
**22.05** «Кінапанарама». 1983 год.
**23.00** «Яловая субмарына».
**0.10** «Сляды застаюцца». Дак. фільм.
**0.40 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм.**
**4.05** «Ілья Рэзнік у тэатры і песні». 1991 год.

## MTV

**5.00, 1.35** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**7.30, 0.15** Шалёныя продкі.
**7.50, 15.50, 17.30** Вольны.
**8.25 «Усё лепшае ў табе». Серыял.**
**8.50, 0.40** Магія Крыса Энджэла.
**9.15** Немагчымае магчыма!
**10.00, 18.00 «Ранеткі». Серыял.**
**11.00** Шопаголікі.
**12.00** Трэндзі.
**12.30, 22.00** News блок.
**12.40 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
**13.35 «Два з паловай чалавекі». Серыял.**
**14.00, 22.10 «Дзённікі вампіра». Серыял.**
**14.50** Індустрыя моды.
**15.00** «Подыум».
**16.00 «Вялікія надзеі». Серыял.**
**16.30, 19.00** Каханне з першага позірку.
**20.00** Мама, хачу стаць зоркай.
**21.00** Буду нараджаць.
**23.00 «Клініка».**
**23.25** Наступны.
**23.50** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**1.05** Хто круцейшы.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Дэтэктыў «Доўгая, доўгая справа...».
**8.30, 14.30** Драма «Прывалаўскія мільёны».
**11.10, 17.10** Камедыя «Сон у руку, або Чамадан».
**18.30, 0.30** Драма «Апазнанне».
**20.05** Плюс кіно.
**20.35, 2.30** Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, або Любоўныя забавы сэра Джона Фальстафа».
**21.55, 3.50** Кінанавела «Рудольфіа».
**22.30, 4.30** Камедыя «Начальнік Чукоткі».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Пакой згубленых цацак».
**3.50** Меладрама «Пізанская вежа».
**5.30** Маст. фільм «Іванцоў, Пятроў, Сідараў...».
**7.00** Камедыя «Дарослыя дзеці».
**8.10** Маст. фільм «Выйгрыш адзінокага камерсанта».
**9.40** Маст. фільм «Бармэн з «Залатога якара».
**11.50** Меладрама «Смага над раўчуком».
**13.05** Маст. фільм «Чорная страла».
**14.35** Камедыя «Вакансія».
**15.45** Фантастыка. «Гіпербалоід інжынера Гарына».
**17.20** Трагікамедыя «Свабоднае плаванне».
**19.50** Трагікамедыя «Пеця па дарозе ў Царства Нябеснае».
**21.30** Меладрама «Не магу сказаць «бывай».
**22.55** Камедыя «Зялёны агеньчык».
**0.05** Дэтэктыў «У апошнюю чаргу».
**1.35** Маст. фільм «Песні мора».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Маст. фільм «Матрос Чыжык».
**6.25, 10.25, 14.25** «Чабурашка ідзе ў школу». М/ф: «Залатое кураня», «Чапля і журавель».
**7.00, 11.00** М/с «Чарапашкагерой». Казкі народаў свету. «Сабака і кот». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Шкатулка з сакрэтам».
**8.00, 12.00** «Урокі цётачкі савы»: «Дзіцячыя фантазіі». М/ф: «Паравозік з Рамашкава», «Жар-птушка», «Улюблівая варона».
**15.00** Фільм-казка «Пунсовая кветачка».
**16.05** М/с «Трое з Прастаквашына». М/ф: «Дазвольце пагуляць з вашым сабакам», «Самавар Іван Іваныч», «Пудзіла-мяўкала».
**17.00** М/с «Чарапашка-герой». Казкі народаў свету. «Валідуб». М/ф «Палкан і Шаўка».
**18.00** «Урокі цётачкі савы»: «Дзіцячыя фантазіі». М/ф: «Воўка ў трыдзявятым царстве». М/ф «Залатое кураня», «Чапля і журавель».
**20.00** Маст. фільм «Чужы-4: Уваскрэсенне».
**22.00** Серыял «Псі-фактар».
**23.00** Еўрапейскі покерны тур.
**0.00** Серыял «Вавілон-5».
**4.00** Серыял «Мёртвыя, як я».

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Чэліні. Злачыннае жыццё».
**10.30, 18.30, 2.30** Драма «Вячэрні звон».
**11.55, 19.55, 3.55** Камедыя «Кроў, якая запяклася».
**13.30, 21.30, 5.30** Меладрама «Кэндзі».
**15.25, 23.25, 7.25** Драма «Шпана».

## ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Аэрапорт-2».
**20.00, 2.00** «Завяшчанне Леніна».
**21.00, 3.00** Серыял «Целаахоўнік-2».
**22.00** Серыял «20 снежня».
**23.30** Серыял «Джэк Васьмёркін — «амерыканец». 1-я серыя.

## ТБ3

**5.00** М/ф.
**5.30** Серыял «Альф».
**6.00** Дзецям пра звераняты.
**6.30, 14.00** Дак. фільм «Гарадскія легенды».
**7.00, 13.00** Навучыце мяне жыць.
**8.00, 14.30** Дак. фільм «Загадкі гісторыі».
**8.30, 15.00** Дак. фільм «Рой».
**11.00** Серыял «Менталіст».
**12.00** Серыял «Гадзіны кахання».
**15.30** «Як гэта зроблена».
**16.00, 3.00** Серыял «Уздзеянне».
**17.00, 2.00** Дак. фільм «Каралі-забойцы».
**18.00** Маст. фільм «Эрагон».
**20.00** Маст. фільм «Чужы-4: Уваскрэсенне».
**22.00** Серыял «Псі-фактар».
**23.00** Еўрапейскі покерны тур.
**0.00** Серыял «Вавілон-5».
**4.00** Серыял «Мёртвыя, як я».

## 22.20 ФІЛЬМ ДНЯ

### «ПЯСОЧНЫ ДОЖДЖ» (РАСІЯ, 2008 г.)

Вядомы тэлевядучы Ігар знаходзіцца на піку сваёй кар'еры, а праз пару дзён стане мужам прыгажуні Алісы. Але ў адзін момант яго шчаслівае жыццё парушаецца: напярэдадні вяселля яго каханая гіне ў аўтакатастрофе.

**Рэжысёр** — Аляксандр Мохаў. **У ролях:** Дзмітрый Ісаеў, Марына Майко, Маргарыта Шубіна.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Апазнанне».
**8.30, 14.30** Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, або Любоўныя забавы сэра Джона Фальстафа».
**9.50, 15.50** Кінанавела «Рудольфіа».
**10.30, 16.30** Камедыя «Начальнік Чукоткі».
**18.30, 0.30** Маст. фільм «Салдаты».
**20.30, 2.30** Маст. фільм «Руанская дзева па мянушцы Пышка».
**22.30, 4.30** Маст. фільм «Узброены і вельмі небяспечны».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Пакой згубленых цацак».
**3.50** Трагікамедыя «Яды, або Сусветная гісторыя атручванняў».
**5.30** Драма «Урок жыцця».
**7.15** Камедыя «Жылі тры халасцякі».
**9.25** Меладрама «Масква, любоў мая».
**11.50** Маст. фільм «Сямейнае шчасце».
**13.15** Трагікамедыя «Белыя Росы».
**14.40** Маст. фільм «Люстэрка».
**16.25** Меладрама «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
**17.40** Маст. фільм «Залатая галава на пласе».
**19.55** Меладрама «Кука».
**21.40** Трылер «Сем крыкаў у акіяне».
**23.05** Меладрама «Шоу для адзінокага мужчыны».
**0.45** Камедыя «Адам ажэніцца з Евай».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Фільм-казка «Пунсовая кветачка».
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Трое з Прастаквашына». М/ф: «Дазвольце пагуляць з вашым сабакам», «Самавар Іван Іваныч», «Пудзіла-мяўкала».
**7.00, 11.00** М/с «Чарапашка-герой». Казкі народаў свету. «Валідуб». М/ф «Палкан і Шаўка».
**8.00, 12.00** «Урокі цётачкі савы»: «Дзіцячыя фантазіі». М/ф: «Воўка ў трыдзявятым царстве», «Вялікая эстафета».
**15.00** Маст. фільм «Філіп Траум». 1-я серыя.
**16.05** М/с «Канікулы ў Прастаквашыне». Казкі Пушкіна. «Казка пра Залатога пеўніка».
**17.00** Маст. фільм «Вершнік без галавы».
**18.35** Казкі народаў свету. «Цудоўная Пэры».

## ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Аэрапорт-2».
**20.00, 2.00** «Завяшчанне Леніна».
**21.00, 3.00** Серыял «Целаахоўнік-2».
**22.00, 23.30** Серыял «Джэк Васьмёркін — «амерыканец».

## ТБ3

**5.00** М/ф.
**6.00** М/ф «Кураж».
**6.30** М/ф «Сябры анёлаў».
**7.00** М/ф «Бакуган».
**7.30** М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
**8.00** Серыял «Зорныя войны».
**9.00** Маст. фільм «Эрагон».
**11.00** «Далёка і яшчэ далей».
**12.00** Сямейны прыгавор.
**13.00** Дак. фільм «Грэчаскія міфы».
**14.00** Маст. фільм «Асмосіс Джонс».
**16.00** Маст. фільм «Чужы-4: Уваскрэсенне».
**18.00** Маст. фільм «Падарожжа да цэнтра Зямлі».
**20.00** Маст. фільм «Пароль «Рыба-меч».
**22.15** Серыял «Псі-фактар».
**23.15** Маст. фільм «Хуткая дапамога».
**1.15** Маст. фільм «Крывавая малпа».
**3.15** Маст. фільм «Людаед».

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Браты-супернікі».
**10.50, 18.50, 2.50** Драма «Абрабаванне на Бэйкерстрыт».
**12.45, 20.45, 4.45** Меладрама «Год сабакі».

## 21.40 ФІЛЬМ ДНЯ

### «ЖЫЦЦЁ Ў РУЖОВЫМ КОЛЕРЫ» (ФРАНЦЫЯ, ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, ЧЭХІЯ, 2007 г.)

Жыццё Эдзіт Піяф было падобнае на бітву, кожны дзень ёй даводзілася змагацца за права жыць, спяваць і кахаць! З трушчобаў Парыжа яна падняласяна падмосткі Нью-Ёркскіх канцэртных залаў і завалодала сэрцамі ўсяго свету.

**Рэжысёр** — Аліўе Даан. **У ролях:** Марыён Кацілард, Сельві Тэсту, Жэрар Дэпардзье.

## НАША КІНО

**15.00** Фільм-казка «Пунсовая кветачка».
**16.05** М/с «Трое з Прастаквашына». М/ф: «Дазвольце пагуляць з вашым сабакам», «Самавар Іван Іваныч», «Пудзіла-мяўкала».
**17.30** «Жыве аперэта!».
**18.50 «Стагоддзе Мапасана. Аповесці і аповеды XIX стагоддзя». Маст. фільм.**
**20.50** «Лінія жыцця».
**22.00** «Парадны партрэт улады».
**22.50** Прэс-клуб XXI.
**23.45** «Хто там...».
**0.10** «Ноч у музеі».
**0.55** Канцэрт Аляксея Іашчанкі і аркестра Сяргея Жыліна.
**1.45** «Поль Гаген». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Праграма «А». 1989 год.
**5.55** «Інстытут чалавека». 1992 год.
**6.25** Канцэрт Ігара Стравінскага. 1962 год.
**6.50, 12.40 «Бумбараш». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.05** «Я сама». 1995 год.
**11.00** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**11.15** «Адзін дзень савецкага салдата». Дак. фільм.
**11.40** «Эстрадны вернісаж». 1991 год.
**16.05** «Тэма». 1993 год.
**17.00** «Народны артыст СССР Васіль Мяркур'еў». 1979 год.
**18.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк».
**18.40 «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1981 год.**
**21.00** «Колба часу».
**22.05** «Кінапанарама». 1983 год.
**23.00** «Яловая субмарына».
**0.10** «Сляды застаюцца». Дак. фільм.
**0.40 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм.**
**4.05** «Ілья Рэзнік у тэатры і песні». 1991 год.

## MTV

**5.00, 1.05** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца. The Best.
**8.45** «Губка Боб».
**10.00** «13 кіналаж».
**10.30** Нерэальныя гульні.
**11.00** Тэлепорт.
**11.30** Хто круцейшы.
**12.00** Гарачае кіно.
**12.30** News блок Weekly.
**13.00 «Ранеткі». Серыял.**
**15.00, 19.00** Шопаголікі.
**16.00 «Вялікія надзеі». Серыял.**
**17.00** Love машына.
**18.00** «Мама, хачу стаць зоркай».
**20.00** Папялушка 2.0.
**21.00** Ужо можна.
**21.50** Наступны.
**22.40** Тачка на пракачку.
**23.05** Руская дзясятка.
**0.05** World Stage.
**15.00, 23.00, 7.00** Драма «Чалавек, якога не было».

## ТБ1000

**3.00** Камедыя «Вызваляючы месца».
**5.00** Камедыя «Скотланд, Пенсільванія».
**7.00** Камедыя «Лёгкія павадзіны».
**9.00** Камедыя «Перамотка».
**11.00** Камедыя «Элі Паркер».
**13.00** Драма «Параноід парк».
**14.50** Камедыя «Каманда».
**17.00** Камедыя «Быць Стэнлі Кубрыкам».
**19.00** Трылер «Пакрыццё ўрону».
**21.00** Драма «Ціт — кіраўнік Рыма».
**0.40** Драма «Дзеці Хуанг Шы».

## DIVA UNIVERSAL

**5.00, 0.50** Серыял «Джордан расследуе».
**6.35** Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
**8.10** Серыял «Тры ракі».
**9.00** Серыял «Добрая жонка».
**9.50** Трылер «Разлад».
**11.20** Пытанне жыцця і спатканне.
**12.50** Гульні.
**14.30** Драма «Доктар Жывага».
**18.30** «Анёлы падаюць» Норы Робертс.
**20.00** Маст. фільм «Гутарка з прывідам».
**21.30** Драма «Прызнанні экзатычнай танцоўшчыцы».
**23.05** Ева.
**3.15** Драма «Калас назаўжды».

## РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40** «Кругасветнае падарожжа».
**7.55** «Ніколі не позна?».
**12.20, 17.50** «Смачнае захапленне».
**13.20** «Пражыць жыццё».
**19.35, 0.55** «Амазонія».
**21.30** «Усё, годзе!».
**22.25** «Святло ў лесе».
**0.00** «Жанчыны».
**2.40** «Сямейныя вузы».

## AXN-SciFi

**0.05, 5.45** 4400.
**0.40, 6.30** Мёртвая зона.
**1.30, 3.25** Зорны шлях.
**2.20** Бліч.
**2.40, 4.15, 9.15, 13.45** Чалавек-невідзімка.
**5.00, 7.15** Тайны Смалвіля.
**8.00, 17.35** Чорная лагуна.
**10.00, 15.15** Збіральнік душ.
**11.35, 23.40** Зорны крэйсер Галактыка.
**14.35, 20.00, 23.00** Звышнатуральнае.
**16.50, 22.10** Фактар страху.
**20.45** Дзённікі вампіра.

## EUROSPORT

**9.30** Экстрэмальныя віды спорту.
**10.00** Тэніс.
**10.30, 18.30, 20.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**11.30** Спартыўная гімнастыка. Мужчыны. Фінал.
**12.30** Спартыўная гімнастыка. Жанчыны. Фінал.
**15.00** Спартыўная гімнастыка. Фінал.
**17.30** Вось гэта дзіва!!!
**23.45** Кёрлінг. ЧС. Мужчыны.
**1.45** Байцоўскі клуб.

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Зямля.
**7.00** Небяспечныя сустрэчы.
**8.00** Ноч ільва.
**9.00** Некранутая прырода.
**10.00** Дзікая прырода Расіі.
**11.00** У пошуках акул.
**12.00** «Дзіўны свет з Nat Geo».
**13.00** Зграя.
**15.00, 21.00, 2.00** Мяжа.
**16.00** Авіяносец.
**17.00** «Марскі патруль».
**18.00** Паліцэйскія на Алясцы.
**19.00, 0.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 1.00** Уцёкі.
**22.00, 3.00** Забароны.
**23.00, 4.00** Паляўнічыя на нацыстаў.

## DISCOVERY

**7.00, 14.20** Заезды.
**7.55, 2.55** Выжыць удваіх.
**8.50, 1.00** «Экстрэмальная рыбалка».
**9.45** У пагоні за ўраганам.
**10.40, 19.00** Цуды, створаныя рукамі.
**11.35, 18.00** Экатэхналогіі.
**12.30, 20.00** Заводскія будні.
**13.25, 23.00** «Браты па зброі».
**15.15** «Пятая перадача».
**16.10, 22.00, 6.05** Амерыканскі чопер.
**17.05, 4.45** Патрабуецца зборка.

## TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 23.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 12.30** Цудоўныя падарожжы вачыма відавочцы з Варунам Шармай.
**7.00** Мегаполіс.
**8.00** Сафі Грыгсан едзе на Усход.
**8.30** Флойд каштуе віны.
**9.00, 22.00, 3.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**11.00** Падарожжы па месцах вінароблства.
**11.30, 16.30** Прагны вандроўнік.
**12.00, 4.00** Лепшыя падарожжы.
**13.30, 4.30** Свет Рудзі Максы.
**15.00** Едзем на Кубу.
**15.30** Планета ежы.
**19.00, 0.00** Падарожжы вакол свету.
**19.30, 0.30** Дзікія сэрцам.
**20.00, 1.00** Чацвёра мужчын і дама.
**20.30, 1.30** Падарожжы сёння.

## ANIMAL PLANET

**7.00** Вуліца лемураў.
**7.25, 16.00** «Самае дзікае шоў».
**7.50** Пандамоніум.
**8.40** Усё пра сабак.
**9.10, 6.10** Уводзіны ў сабакаэнаўства.
**10.05, 19.15** «Заатур Мікаэлы».
**11.00** Тэрыторыя жывёл.
**11.55** «SOS дзікай прыроды».
**12.50** Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
**13.45** «Аддзел па абароне жывёл: на пярэднім краі».
**14.10** «Ветэрынары на маршы».
**14.40, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**15.30** Планета дзікіх.
**16.30** Як стаць...
**17.25, 1.40** Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
**18.20** Паляўнічы на яд.
**21.05, 2.35** Прыгоды Осціна Сцівенса.
**22.00, 3.30** «У пячору льва».
**22.55, 4.25** Коста-рыканскія кракадзілы-забойцы.
**23.50, 5.20** Экстрэмалы.
**0.45** Дзікія і небяспечныя.

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Як не страціць здароўе.
**5.40, 20.40** Жаночы часопіс.
**6.20, 21.20** Колькі вам гадоў?
**6.50, 21.50** Я перамог гэты боль.
**7.30, 22.30** Дзіця нарадзілася.
**8.00, 14.40, 23.00** Набалелае пытанне.
**8.50, 23.50** Я расту.
**9.30, 0.30** Увага, ежа!
**9.55, 0.55** Зялёная аптэка.
**10.35, 1.35** Ты тое, што ты ясі.
**11.00, 2.00** Цяга да жыцця.
**11.50, 2.50** Цела чалавека.
**12.30, 3.30** Выдаткі вытворчасці.
**13.10, 4.10** Дыялогі пра харчаванне.
**14.00** Практыка здароўя.
**15.30** Энцыклапедыя памылак.
**15.45, 18.20** Азбука здароўя.
**15.50** Клінічны гіпноз.
**16.30** Панацэя.
**17.00** Пра дыеты і не толькі.
**17.40** Выкрыццё прадуктаў.
**18.25** Правілы здароўя.
**18.50** Школа розуму.
**19.30** Курс лячэння.

## ТДК

**6.00, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 13.00, 15.00, 22.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00** Ваш доктар.
**7.50** Сакрэты здароўя.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 23.45** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.30, 2.00** Нашы дзеці.
**14.30** Твой дом.
**19.00, 22.30, 4.00** Люстэрка жыцця.
**21.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**1.00** «Шлях поспеху».
**3.00** Гісторыя поспеху.

# СУБОТА, 9 КРАСАВІКА

## ПЕРШЫ

**7.00** М/ф.
**7.30** Існасць.
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** Здароўе.
**9.45** «Кухар дома».
**10.15** «Школа доктара Камароўскага».
**10.50 Серыял «Сваты-4».**
**12.10 Меладрама «Пачатак».**
**14.00** «Час Саюза».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** «Атлас «Дыскаверы». «Японія».
**17.40** «Зямля беларуская». «Таямніца зямлі Обраў».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «OFF STAGE LIFE».
**19.45 Серыял «Вясковая камедыя».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Драма «Жыццё ў ружовым колеры».**
**0.15** «Зорнае жыццё». «Тайны мужчын сэкс-знакаў XX стагоддзя».
**1.10** Дзень спорту.

## АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Мода часоў Леаніда Брэжнева».
**14.00** «Гарады-героі. Кіеў».
**15.00** Асяроддзе пражывання. «Сыр або не сыр».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20 Маст. фільм «Унук касманаўта».**
**17.55** «Адзін супраць усіх».
**18.40** «Я спяваю».
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.20** «Пражэктарперысхілтан».
**0.00** «Што? Дзе? Калі?».
**1.15 Драма «Каханне да тру

# НЯДЗЕЛЯ, 10 КРАСАВІКА

## ПЕРШЫ

**8.05** М/ф.
**8.45** «Зброя».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45 Серыял «Сваты-4».**
**12.10 Драма «Чыстае неба».**
**14.20** «OFF STAGE LIFE».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «У кругавароце алімпійскага руху».
**16.00 Меладрама «Грэйсі».**
**18.05** Суперлато.
**19.15 Серыял «Вясковая камедыя».**
**20.30** «Спортлато 5 з 36».
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30 Трылер «Фота за гадзіну».**

## АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная прапаведзь.
**9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**9.55** Пакуль усе дома.
**10.55** «Пара ў космас!».
**11.35** Новы «Ералаш».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25 Меладрама «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».**
**14.00** «Гарады-героі. Тула».
**15.00** «Брэйн-рынг».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай пажэнімся!».
**17.25** «Эстрадны кактэйль».
**18.45** «Вялікая розніца».
**20.00** Контуры.
**21.05 Трылер «Белы шум».**
**23.00** «Кухня».
**23.35 Закрыты паказ. Маст. фільм «Аднойчы ў правінцыі».**

## ЛАД

**7.25** Звон.
**7.50** Мір вашаму дому.
**8.05 Маст. фільм «Тайна воўчай пашчы».**
**10.00** Урачэбныя тайны.
**10.40** Урачэбныя тайны+.
**10.55** Школа рамонту.
**12.00** Тэлебарометр.
**12.05** Нашы тэсты.
**12.45** Кінапробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Гаспадар.
**13.55** Бухта капітанаў.
**14.35** Дак. фільм «Наталля і Георгій».
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Блэкпул — Арсенал.
**17.25** Хакей. КХЛ. Плэй-оф. Фінал.
**19.20** «Дзеці новага пакалення».
**20.25** «Навіны надвор'я».
**20.55** Смешная часінка.
**21.30 Трылер «Імітатар».**
**23.50** Культасвета.

## СТБ

**5.30 Маст. фільм «Міхайла Ламаносаў. Дзеля славы Айчыны». 1-я серыя.**
**7.00 Маст. фільм «Адплата».**
**9.00** «Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё Online.
**9.30, 19.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікае сняданне».
**11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».**
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55 Маст. фільм «Аса». Заключная серыя.**
**15.30** Ток-шоу «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат РБ па футболе: «Дынама» (Брэст) — ФК «Мінск».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Яркая зорка».**
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.45 Маст. фільм «Ідзі і гляджу».**
**2.15 Серыял «Спецназ».**

## МІР

**5.00, 12.50 Серыял «Камісар Мегрэ».**
**5.50** «Даведнік».
**6.20, 2.20** Дак. фільм «Луўр. Самы вялікі музей свету».
**7.30** М/с «Брыдкае качаня».
**7.55** «Берыляка вучыцца чытаць».
**8.20** «Давайце маляваць!».
**8.40** «Спытай ва Усёведа».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці.
**9.10** «Ведаем рускую».
**10.10** «Ахвота да змены месцаў».
**10.40** «Любімыя акцёры».
**11.00 Маст. фільм «Асаблівасці нацыянальнай падлёднай лоўлі, або адрыў па поўнай».**
**13.50, 0.00** «Доказы віны».
**14.30, 0.40** «Дыяспары».
**15.10 Серыял «Шпік без ліцэнзіі».**
**18.10, 3.20 Маст. фільм «Прыгажунчык».**
**20.00** «Разам».
**21.00** «Паўночнікі».
**21.30 Маст. фільм «Мядзведзь і лялька».**
**23.15** «Жывая гісторыя».
**1.10** «Навіны Садружнасці. Культура».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 14.15, 19.40, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**9.05, 18.15** Падагульняючы дзённік «Новай хвалі».
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00, 12.00** «Кінаблакнот».
**10.20** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00, 19.45 Серыял «Сага пра Фарсайтаў».**
**12.20 Камедыя «Рыбка па імені Ванда».**
**14.20 Серыял «Яна напісала забойства».**
**15.15** «К-відэа» для дзяцей.
**15.35 Фільм для дзяцей.**
**17.05** «Бульбокс».
**17.35** Дак. серыял «Сакрэтны палігон».
**18.40 Серыял «Думаць як злачынец».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.10 Камедыя «Авантурыстка».**
**23.30** «Тэлефабрыка».

## ВТБ

**6.00, 23.00** «PLAY».
**10.30 Серыял «Як сказаў Джым».**
**11.30, 22.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**13.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**15.00 Баявік «Містар і місіс Сміт».**
**17.30 Серыял «Татавы дочкі».**
**20.00 Камедыя «Як разабрацца са справамі».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 12.05** М/ф.
**7.20 Серыял «Сваты-4».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам себе рэжысёр».
**12.25 Маст. фільм «На чужым свяце».**
**14.15** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамансаў».
**15.35** «Гарады і Вёскі».
**16.35 Дэтэктыў «Начное здарэнне».**
**18.20** «Аншлаг і Кампанія».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «Танцы з Зоркамі».
**23.55** «Тры дні Юрыя Гагарына. І ўсё жыццё».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.40** М/ф «Кракадзіл Гена».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**8.45** «Іх норавы».
**9.20** «Ядзім дома!».
**10.20** «Першая перадача».
**10.50** «Банкет на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Таямнічая Расія»: Эльбрус. Гара багоў?».
**14.10** «Апошняе слова».
**15.10** «Сеанс з Кашпіроўскім. Знакі лёсу».
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага падману. Выхад ёсць!».
**17.20** «І зноў прывітанне!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.10 Серыял «Глухар».**
**0.50** «Нерэальная палітыка».
**1.20** «Футбольная ноч».

## ТНТ

**5.00** «Мішэ Хіл». М/с.
**5.25** «Бэбі Блюз». М/с.
**6.00** «Як кажа Джынджэр». М/с.
**6.55** «Бейблэйд: Гарачы метал». М/с.
**7.15, 8.00 Серыял «Сяброўкі».**
**7.55** «Лато Спорт Супер».
**8.50** Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
**9.00, 1.50, 2.50** «Школа рамонту».
**10.00** «СуперІнтуіцыя».
**11.00** «Школа гоблінаў». Дак. фільм.
**12.00 «Хор». Серыял.**
**13.55 «Інтэрны». Сітком.**
**16.00 «Браты Грым». Фэнтэзі.**
**18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**19.00 Фантастыка «Хронікі Рыдзіка».**
**21.15** «Камедзі Клаб».
**22.00, 0.50** «Дом-2».
**23.30** «Тайны падводнага свету». Дак. фільм.
**0.15** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**3.55** «Cosmopolitan». Відэаверсія.

## ІНТЭР+

**6.55** Скептык.
**7.25** Самы разумны.
**8.50, 12.45, 0.05** Тыдзень моды.
**9.15, 9.55, 11.00** Нядзеля з «Кварталам».
**9.30** Школа доктара Камароўскага.
**10.00** Ранішняя пошта.
**10.30, 0.35** Папялушка для Баскава.
**11.05** Смачная ліга.
**11.55, 1.05** Арол і Рэшка.
**13.10** Разбор палётаў.
**14.00, 3.45** Футбол. ПЛ Украіны. «Металург» (З) — «Дынама».
**15.50** Танцавальнае шоу «Майдан'с».
**17.25** Музыка з Украіны.
**17.45, 5.30** Утоеная рэальнасць.
**18.30** Вячэрні квартал.
**20.00, 3.00** Падрабязнасці тыдня.
**20.45, 1.45 Маст. фільм «З каханымі не расставайцеся».**
**22.00** Дзве конскія сілы.
**22.25** Гульні патрыётаў.

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 0.50, 1.50** Праграма перадач.
**9.10** «Звычайны канцэрт».
**9.40 «Чалавек нарадзіўся». Маст. фільм.**
**11.10** «Легенды сусветнага кіно».
**11.40 «Пецька ў космасе». Маст. фільм.**
**12.45** «Певень і фарбы». М/ф.
**13.00, 0.55** «Тайнае жыццё мышэй». Дак. фільм.
**13.55** «Што рабіць?».
**14.40** Зорныя партрэты. Юрый Гагарын.
**15.10** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра».
**17.15 «Іду на навальніцу». Маст. фільм.**
**19.40** Вольга Аросева. Творчы вечар.
**21.00** «Кантэкст».
**21.40 «Падарожжа на Месяц». Маст. фільм.**
**23.20** Канцэрт Стэнлі Джордана.
**0.25** «Казкі старога піяніна». «Дажджлівая гісторыя». «Дачка велікана». М/ф для дарослых.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Народны артыст СССР Васіль Мяркур'еў». 1979 год.
**6.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк».
**6.40 «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1981 год.**
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00** «Колба часу».
**10.05** «Кінапанарама». 1983 год.
**11.00** «Да і пасля...». Год 1973.
**12.20** «Шынок 13 крэслаў». 1973 год.
**13.40** «Айчына». Дак. фільм.
**15.00 «Настаўнік спеваў». Маст. фільм.**
**16.25** «Ранішняя пошта». 1988 год.
**17.00** «Акулы пяра».
**18.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**19.00** «Кваранцін».
**19.40** «Вялікія перамогі».
**20.00** «Вялікія пацалункі».
**21.00** «Вялікія ашуканцы».
**22.00** «Вялікія сэксуальныя скандалы».
**23.00** «Вялікія разводы».
**0.00** «Вялікія вяселлі».

## MTV

**5.00, 23.35** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца. The Best.
**8.45** «Губка Боб».
**10.00** «13 кіналаж».
**10.30** Нерэальныя гульні.
**11.00** Тэлепорт.
**11.30** Хто круцейшы.
**12.00** Гарачае кіно.
**12.30** News блок Weekly.
**13.00 «Ранеткі». Серыял.**
**15.00, 19.00** Шопаголікі.
**16.00** Вялікія надзеі.
**17.00** Love машына.
**18.00** «Буду нараджаць».
**20.00** «Папялушка 2.0».
**21.00** Ужо можна.
**21.50** Наступны.
**22.40** Тачка на пракачку.
**23.05** Трэндзі.

## НАША КІНО

**6.30, 12.30** Маст. фільм «Салдаты».
**8.30, 14.30** Маст. фільм «Руанская дзева па мянушцы Пышка».
**10.30, 16.30** Маст. фільм «Узброены і вельмі небяспечны».
**18.30, 0.30** Камедыя «Сабака на сене».
**20.30, 2.30** Меладрама «Ася».
**22.30, 4.30** Маст. фільм «Я вольны, я нічый».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Пакой згубленых цацак».
**3.50** Камедыя «Плюс адзін».
**5.30** Меладрама «Дарагі мой чалавек».
**7.15** Маст. фільм «Крах аперацыі «Тэрор».
**9.30** Камедыя «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
**11.50** Маст. фільм «Кепскі анекдот».
**13.30** Фантастыка. «Маўчанне доктара Івенса».
**14.50** Камедыя «Толькі ў мюзік-холе».
**15.55** Меладрама «Калі на поўдзень паляцяць жураўлі...». 1-я серыя.
**19.50** Меладрама «Манро».
**21.20** Маст. фільм «Карчма на Пятніцкай».
**22.50** Камедыя «Цэнтравы з паднябесся».
**0.20** Дэтэктыў «Па звестках крымінальнага вышуку...».
**1.35** Камедыя «Алёшкава каханне».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00, 15.00** Маст. фільм «Філіп Траум».
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Канікулы ў Прастаквашыне». Казкі Пушкіна. «Казка пра Залатога пеўніка».
**7.00, 11.00** Маст. фільм «Вершнік без галавы».
**8.35, 12.35** Казкі народаў свету. «Цудоўная Пэры». М/ф «Камарынская».
**16.10** М/с «Зіма ў Прастаквашыне». М/ф: «Калі запальваюцца ёлкі», «Раз — гарох, два — гарох...».
**17.00** М/ф «Ключ».
**17.55** Казкі народаў свету. «Залатая антылопа». М/ф «Кветка папараці».

## ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Аэрапорт-2».
**20.00, 2.00** «Завяшчанне Леніна».
**21.00, 3.00** Серыял «Целаахоўнік-2».
**22.00, 23.30** Серыял «Джэк Васьмёркін — «амерыканец».

## ТБ3

**5.00** М/ф.
**6.00** М/ф «Кураж».
**6.30** М/ф «Сябры анёлаў».
**7.00** М/ф «Бакуган».
**7.30** М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
**8.00** Серыял «Зорныя войны».
**9.00, 4.00** Серыял «Дзіўныя падарожжы Геракла».
**10.00** Маст. фільм «Асмосіс Джонс».
**12.00, 17.00** Дак. фільм «Апакаліпсіс».
**13.00** Маст. фільм «Падарожжа да цэнтра Зямлі».
**15.00** Маст. фільм «Пароль «Рыба-меч».
**18.00** Маст. фільм «А вось і Полі».
**20.00** Сямейны прыгавор.
**21.00** Маст. фільм «Забі мяне! Ну, калі ласка!».
**23.00** Дак. фільм «Альтэрнатыўная гісторыя».
**0.00** Маст. фільм «Замена».
**2.00** Маст. фільм «Хуткая дапамога».

## 20.40 ФІЛЬМ ДНЯ

### «ЯРКАЯ ЗОРКА»

**(ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, ФРАНЦЫЯ, ЗША, АЎСТРАЛІЯ, 2009 г.)**

Гісторыя англійскага паэта Джона Кітса, які памёр у 25-гадовым узросце ад сухот. Апошнія тры гады свайго жыцця Джон разумеў, што паступова згасае, і менавіта ў гэты час пачалася яго рамантычная сувязь з дзяўчынай Фэні Браун.

**Рэжысёр —** Джэйн Кэмпіён. **У ролях:** Эбі Корніш, Бэн Уішоу, Пол Шнайдэр.

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!*

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Герой сям'і».
**10.50, 18.50, 2.50** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**12.30, 20.30, 4.30** Камедыя «Мары аб Каліфорніі».
**15.10, 23.10, 7.10** Камедыя «Кампаньёны».

## ТБ1000

**3.00, 21.00** Драма «А (або Атэла)».
**5.00** Трылер «Пакрыццё ўрону».
**7.00** Драма «Параноід парк».
**9.50** Камедыя «Каманда».
**11.00** Камедыя «Быць Стэнлі Кубрыкам».
**13.00** Драма «Жак-бядняк».
**15.00** Драма «Асістэнтка».
**17.00** Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
**19.00** Камедыя «Пазбаўце нас ад Евы».
**23.00** Драма «Дзеці Хуанг Шы».
**1.10** Анімацыйны фільм «Начная бура».

## DIVA UNIVERSAL

**5.00, 0.50** Серыял «Джордан расследуе».
**7.20** Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
**9.50** Серыял «Пляткарка».
**13.50** Маст. фільм «Гутарка з прывідам».
**15.20** Пасланне ў бутэльцы.
**17.30** Серыял «Міласэрнасць».
**18.20** Серыял «Тры ракі».
**19.10** Серыял «Добрая жонка».
**20.00** Серыял «Быць Эрыкай».
**21.40** Пытанне жыцця і спатканне.
**23.10** Маст. фільм «Ідэал».
**3.20** Смяротная манія.

## РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40** «Кругасветнае падарожжа».
**7.55** «Тайна Лауры».
**12.20, 17.50** «Смачнае захапленне».
**13.20** «Стол на траіх».
**19.35, 0.55** «Амазонія».
**21.30** «Усё, годзе!».
**22.25** «Святло ў лесе».
**0.00** «Жанчыны».
**2.40** «Сальвадор — выратавальнік жанчын».

## AXN-SciFi

**0.25, 5.00, 11.35, 23.50** Зорны крэйсер Галактыка.
**1.55, 16.50, 22.15** Фактар страху.
**2.45** Каралеўскі шпіталь.
**4.15, 9.20, 13.45** Чалавек-невідзімка.
**7.15** Жнец.
**8.00, 17.35** Чорная лагуна.
**10.05, 15.20** Дзённікі вампіра.
**14.35, 20.05, 23.05** Звышнатуральнае.
**20.45** Мерлін.

## EUROSPORT

**9.30** Вось гэта дзіва!!!
**10.45** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**12.15, 20.00, 1.30** Тэніс. Турнір WTA.
**13.30, 23.00** Велагонкі. Парыж — Рубе.
**18.00, 0.15** Спартыўная гімнастыка. Фінал.
**21.45** Бокс. Цяжкая вага.

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 19.00, 4.00** Мегазаводы.
**6.00** Атака насякомых.
**7.00** Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
**8.00** Дзікая прырода Расіі.
**9.00** Малпы ў горадзе!
**10.00** Вялікія міграцыі.
**11.00** Жыццё сярод вялікіх котак.
**12.00** У пошуках акул.
**13.00** Даліна ваўкоў.
**14.00** Каралева гіен.
**15.00** Каралева тыграў.
**16.00** Апошні тыгр Суматры.
**17.00** Мяжа.
**18.00** «Дзіўны свет з Nat Geo».
**20.00, 23.00, 2.00** У пячоры крышталёў.
**22.00, 1.00** З пункту гледжання навукі.

## DISCOVERY

**7.00, 4.45** Патрабуецца зборка.
**7.25** Як гэта працуе.
**7.55, 14.20, 3.50** Лабараторыя выбуховых ідэй.
**8.50, 13.25, 21.00, 2.55** Разбуральнікі легендаў.
**9.45** «Маланкавыя катастрофы».
**10.40** «Экстрэмальная рыбалка».
**11.35** На кручку.
**12.30** Выжыць удваіх.
**15.15** Скрозь трусіную нару з Морганам Фрыменам.
**16.10** «У мяне атрымалася».
**22.00** Рос Кемп.
**23.00** «Звышлюдзі Сцена Лі».
**0.00** Папулярная навука.
**1.00** Сарвігаловы.
**2.00** Новы свет.
**5.10** Заводскія будні.
**6.05** Цуды, створаныя рукамі.

## TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 12.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**7.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.
**7.30** Аўстралійскія падарожжы.
**8.00** Мараплаўцы.
**9.00** Экзотыка ў жыцці.
**11.00** Індыйскі час.
**13.00, 15.00, 4.00** Падарожжы вакол свету.
**13.30** Дзікія сэрцам.
**16.00** Кулінарная Азія.
**18.00, 23.00** Чацвёра мужчын і дама.
**18.30, 23.30** Сафі Грыгсан у графствах Радзімы.
**19.00, 0.00** Падарожжы сёння.
**19.30, 0.30, 3.30** Пакаранне для абжоры.
**20.00, 1.00** Мегаполіс.
**22.00, 3.00** Неспакойная планета.
**22.30** Пра галоўнае.

## ANIMAL PLANET

**7.00** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25** Як стаць...
**8.15** «Самае дзікае шоу».
**8.40** «Прыроджаныя паляўнічыя».
**9.10** «Заатур Мікаэлы».
**10.05** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**11.00** «Тэрыторыя жывёл».
**11.55** «SOS дзікай прыроды».
**12.20** Ветэрынары-стажоры.
**12.50** Якія ваююць са шкоднікамі.
**13.45, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**14.40** «Незвычайныя сабакі».
**15.05** Коткі Кло-Хіл.
**15.35** «Прыроджаныя паляўнічыя».
**16.30, 1.40, 6.10** Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
**17.25** Паляўнічы на яд.
**18.20** Ветэрынар у дзікай прыродзе.
**19.15** Планета мутантаў.
**21.05, 2.35** Нябачнае жыццё.
**22.00, 3.30** Жыццё млекакормячых.
**22.55, 4.25** Як выжыць жывёлам?
**23.50, 5.20** Экстрэмалы.
**0.45** Дзікія і небяспечныя.

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Пра дыеты і не толькі.
**5.40, 20.40** Выкрыццё прадуктаў.
**6.20, 19.20, 21.20** Азбука здароўя.
**6.25, 21.25** Правілы здароўя.
**6.50, 21.50** Школа розуму.
**7.30, 22.30** Курс лячэння.
**8.00, 23.00** Як не страціць здароўе.
**8.40, 23.40** Жаночы часопіс.
**9.20, 0.20** Колькі вам гадоў?
**9.50, 0.50** Я перамог гэты боль.
**10.30, 1.30** Дзіця нарадзілася.
**11.00, 2.00** Набалелае пытанне.
**11.50, 2.50** Я расту.
**12.30, 3.30** Увага, ежа!
**12.55, 3.55** Зялёная аптэка.
**13.35, 18.20, 4.35** Ты тое, што ты ясі.
**14.00** Цяга да жыцця.
**14.50** Цела чалавека.
**15.30** Выдаткі вытворчасці.
**16.10** Дыялогі пра харчаванне.
**17.00** Пазнай сябе.
**17.40** Будзем здаровыя.
**19.25** Нетрадыцыйная медыцына.

## ТДК

**6.00, 7.50, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 13.00, 14.30, 22.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.45, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.30, 2.00** Нашы дзеці.
**15.30** Латарэя «Бінга».
**19.00, 22.30, 4.00** Люстэрка жыцця.
**21.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**1.00** «Шлях поспеху».

# АГОЛЕНАЯ ДУША Ў ГРАМАДСКІМ МЕСЦЫ,
## альбо Чаму б не пасадзіць на каня Міндоўга і Каліноўскага?

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

**Вы часта сустракаецеся з гэтым чалавекам. Калі ідзяце праз сквер Янкі Купалы ў Мінску, альбо праязджаеце па вуліцы Лазо, калі шпацыруеце па алеі, што вядзе да службовага ўваходу опернага тэатра, калі падарожнічаеце па Беларусі. І нават калі вандруеце па Расіі, Кітаі, Швейцарыі, Германіі, Італіі або Турцыі. Бо там жывуць скульптуры Уладзіміра Слабодчыкава.**

Скульптура, як і любы твор мастацтва, шчыльна звязана з унутраным светам мастака. Гэта нешта сакральнае для яго, амаль недатыкальнае. Але ён набіраецца мужнасці і выстаўляе сваю скульптуру ў грамадскае месца, каб кожны мог ацаніць яе: аблаяць альбо паспрабаваць зразумець. Скульптура — аголеная безабаронная душа мастака ў грамадскім месцы.

У некаторых скульптуры Уладзіміра Слабодчыкава захоўваюцца нават дома. І я маю на ўвазе не толькі прыватных калекцыянераў, але і ўладальнікаў прыза «Праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення», які штогод уручаецца на «Славянскім базары ў Віцебску». Менавіта мінскі скульптар кожны год зноў і зноў выбраўляе гэты невялічкі, але каштоўны прыз.

Скульптуры, зробленыя ім на трэцім курсе Акадэміі мастацтваў, знаходзяцца ў калекцыі Трацякоўскай галерэі. Адметна, што сярод іншых там знаходзяцца і наскрозь працятыя беларускасцю скульптуры «Даўгінаўскай серыі», якія мастак зрабіў на малой радзіме ў вёсцы Даўгінава: «Мой дзед», «Вербніца», «Мая спадчына», «Рэзгіны». Калі вы бачылі скульптуры Уладзіміра Слабодчыкава, то не здзівіцеся іх з іншымі: вытанчаныя, высакародныя, з нязменным лейтматывам лодкі-чоўна ў многіх кампазіцыях. Па просьбе сына народнай артысткі СССР Стэфаніі Станюты Уладзімір Слабодчыкаў зрабіў помнік, усталяваны на Усходніх могілках над магілай беларускай актрысы.

Ужо больш чым 20 гадоў Уладзімір Іванавіч узначальвае кафедру скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Ён ведае пра скульптуру ўсё і сам з'яўляецца вядомым майстрам. Уладзімір Слабодчыкаў распавёў «Звязде» пра тое, што найбольш цікавіць турыстаў у Мінску, якая галоўная праблема сучаснай беларускай скульптуры і чаму яго макет скульптуры княгіні Вользе ў Віцебску назвалі плагіятам.

### «Нашы чыноўнікі не вельмі разумеюць у мастацтве...»

***— Большасць вашых грамадскіх скульптур, што стаяць у беларускіх гарадах, вельмі адрозніваюцца ад скульптур, зробленых вамі як чыста творчыя праекты «для сябе». Ці не ёсць грамадскія заказы гвалтам з сябе?***

— Я назваў бы гэта не гвалтам, а трансфармацыяй, гібкасцю свядомасці. Я лічу, што ёсць стэрэатыпы, якія няма сэнсу ламаць. Напрыклад, нядаўна я рабіў бюст беларускай опернай спявачкі Ларысы Александроўскай. Гэта рэальная асоба канкрэтнага гістарычнага перыяду. І зрабі я яе ў сваім мадэрновым адметным стылі, яна проста была б не падобная на сябе. Тое, што скульптура будзе стаяць у грамадскім месцы, прымушае скарыстоўваць больш зразумелыя для грамадскасці формы. Манументальная рэч сама па сабе — не твая асабістая. Яна павінна жыць у нейкім асяродку для некага. Доўгі час я ад заказаў наогул уцякаў, рабіў свае рэчы і быў абсалютна шчаслівы. Але ў рэшце рэшт захацелася рабіць нейкія вялікія манументальныя скульптуры, якія б засталіся для нашчадкаў... Той жа помнік графу Зорычу ў Шклове. Калі б я зрабіў гэтую фігуратыўную скульптуру такой, як постаці ў «Раўнавазе сямейнага чоўна», мяне б не зразумелі...

***— Тым не менш, пабачыўшы «Раўнавагу сямейнага чоўна», глядач адразу пазнае аўтарскі стыль і назаве прозвішча скульптара. А пабачыўшы помнік Зорычу, ён будзе яшчэ думаць: хто ж аўтар...***

— Робячы манументальную рэч у сваім стылі, рызыкуеш сысці ад самой ідэі. Бо трэба не займацца фармальнымі пошукамі, а паказаць асобу канкрэтнага чалавека, напрыклад. Альбо тэму вайны зрабіць у такім стылі таксама досыць складана. Мастацкі савет не зразумее такога падыходу і не зацвердзіць эскіз... Праўда, аднойчы, я меў шанц рабіць тое, што хачу, калі ствараў скульптуру «Рыба ў промнях сонца» для музея экалогіі ў Полацку. Мне пашчасціла, таму што дырэктар музея даверыўся мне. Надмагілле Стэфаніі Станюты я таксама зрабіў даволі стылізаванае, але гэта была не самамэта. Я быў упэўнены, што такая пластыка больш раскрывае вобраз актрысы, і атрымаў бласлаўленне яе свякоўцы...

***— Значыць, мадэрновыя тэндэнцыі, папулярныя ў свеце, не зусім добра прыжываюцца ў нас на Беларусі?***

**«У лодцы», 2003. Інтэрнацыянальная паэзія. Беларуская скульптура на фоне кітайскага трыснягу.**

— Можна сказаць і так. Хочацца ўсё-ткі, каб у нас было шмат розных скульптур. Упершыню нейкі эксперымент у скульптуры мы паспрабавалі зрабіць у 1988 годзе. Тады я арганізаваў у Мінску скульптурны пленэр, і вынік нашай працы можна назіраць у скверы Янкі Купалы. Першая злева ад цырка — мая скульптура. Тады мы хацелі пазбавіцца ад бясконцай ваеннай тэматыкі, ад ботаў і аўтаматаў, бо савецкая беларуская скульптура ўяўляла з сябе выключна гэта. Так мы прыйшлі да сучаснай еўрапейскай скульптуры. І сёння нашы маладыя скульптары, студэнты акадэміі адчуваюць сябе абсалютна разняволена сярод прагрэсіўных еўрапейскіх мастакоў. У нашых гарадах дасюль мала мадэрновых скульптур. Сусветная скульптура сыходзіць ад фігуратыўнай скульптурнай выявы, часцей звяртаецца да стылізаванай. Мастацкая адукацыя ў Беларусі працягвае заставацца больш традыцыйнай, і таму мы не страцілі яшчэ сваю акадэмічную школу, як гэта адбылося і адбываецца ў большасці краін свету. Наша творчая моладзь гатовая дэманстраваць такія творы, якія адпавядаюць сучасным мадэрновым павевам. Але наш глядач да гэтага не зусім падрыхтаваны. Мы ўсё-ткі пазіцыяную сябе часткай Еўропы, таму павінны дапускаць і наватарскія падыходы. Я не адмаўляю таго, што ёсць, але няхай будзе яшчэ і нешта новае. Раней было складана ўявіць сабе авангардную скульптуру ў цэнтры Мінска, таму што архітэктура яго — так званы савецкі класіцызм. А скульптура — гэта ансамблевы аб'ект, яна не можа існаваць сама па сабе. Зараз мы бачым у нас новыя архітэктурныя формы, якія вымагаюць рабіць менавіта авангардныя рэчы, таму што традыцыйны падыход у іх кантэксце недарэчны. Дапусцім, гандлёвы цэнтр «Еўропа» альбо новыя мадэрновыя будынкі банкаў. Мы нават уявіць сабе не можам побач з імі «Бабку з семкамі»!

Мы з мінскімі скульптарамі шмат разоў прапаноўвалі гораду зрабіць тое ці гэтае, але нашы чыноўнікі не вельмі разумеюць у мастацтве. І вельмі рэдка даюць згоду на ўсталяванне помніка сучаснай формы ў горадзе. Ёсць у мяне скульптура «Прысвячэнне Шагалу». Яна была прынята горадабудаўнічым саветам. І я прапаноўваў зрабіць яе вялікай — шасціметровай. Але яе, як і кампазіцыю «У лодцы», якую планавалася размясціць на беразе Свіслачы, так дасюль і не ўсталявалі. Не знайшлі заказчыка, які пайшоў бы на эксперымент і рашыўся ўкласці грошы ў такую працу.

### Каго прываблівае помнік Леніну?

***— Некалькі гадоў таму Эрнст Неізвесны наведаў Беларусь і назваў скульптуры ў цэнтры Мінска «безобразием». Што вы можаце на гэта адказаць?***

— Я назваў бы гэта не «безобразием», а «малообразием». Таму што ў нашай скульптуры мала вобразаў іншых, адрозных. Магчыма, у гэтым і заключаецца наша асноўная праблема. Вядома, помнік Якубу Коласу — яшчэ неблагі. Але вось яго персанажы побач мне не зусім падабаюцца. Хоць сам асабіста ляпіў там хлопчыка па эскізах Заіра Азгура, калі быў студэнтам. Падзарабляў. Альбо, дапусцім, Ленін на плошчы Незалежнасці... Ён не жыве ў часе, ён жыве па-за кантэкстам сучаснасці нейкім сваім жыццём. І турысты з Еўропы прыязджаюць паглядзець на помнік Леніну... З'яўляецца інтарэс да наведвання прамысловых раёнаў. Турыстам цікава паглядзець на савецкія прынцыпы будовы рабочых раёнаў. Але, калі б у гэтым вінегрэце былі нейкія сучасныя рэчы, яны б вельмі цікава зрэзаніравалі. Сёння ў Беларусі скульптура ў нейкіх новых сучасных кірунках развіваецца выключна дзякуючы прыватнаму заказу.

Беларуская скульптурная школа вельмі маладая: кафедры скульптуры Акадэміі мастацтваў у 2013 годзе будзе 60 гадоў. Можна параўнаць з Пецярбургскай акадэміяй, якой будзе 250 год. Але мы патэнцыйна вельмі моцныя. Мы яшчэ пакажам, на што здольныя. Многія беларускія маладыя скульптары ўжо зараз вельмі каціруюцца на Захадзе: Віктар Копач, Андрэй Вераб'ёў, Сяргей Аганаў, Сяргей Бандарэнка, Андрэй Асташоў.

***— Скульптар — адказная прафесія?***

— Вядома! Праз дзесяцігоддзі будуць гаварыць пра вобразы, увасобленыя ў скульптуры менавіта ў гэты гістарычны перыяд. Зрабіла Святлана Гарбунова Сымона Буднага — і ў нас Будны цяпер асацыюецца выключна з гэтым вобразам. Альбо Алесь Дранец зрабіў Скарыну — і таксама менавіта гэты вобраз Скарыны застанецца ў свядомасці сённяшняй моладзі. Вялікая адказнасць ляжыць на скульптары, і хочацца, каб гэтая адказнасць дзялілася разам з дзяржавай. Вось у нас, напрыклад, мала помнікаў гістарычным дзеячам: няма ні Радзівілам, ніводнаму князю ВКЛ, у Мінску няма нават коннага помніка! Конны помнік звычайна ставіцца заснавальніку горада альбо дзяржавы. Чаму б нам не пасадзіць на каня Міндоўга альбо Каліноўскага?

Скульптура — гэта такі асветніцкі від мастацтва. Яна раскрывае гісторыю, культуру, выхоўвае павагу да культуры, да Радзімы. Па помніках судзяць пра культуру народа, культуру кіраўнікоў, па помніках судзяць наогул — што ёсць цікавага. Мы зараз імкнёмся развіваць турыстычныя маршруты. Але калі не будзе гістарычных помнікаў, незвычайных скульптур, то турыстам будзе не так цікава наведваць Беларусь.

### Пры чым тут «Звязда»?

— Першая сусветная вайна пакінула вельмі вялікі след у Беларусі. Увесь жах вайны прыйшоўся пераважна на беларускія землі. Мы з архітэктарам Ігарам Марозавым распрацавалі гэты помнік, хацелі ўсталяваць яго ў мясцовасці Нарачанскіх балот, дзе ў сакавіку 1916 года пачаліся вялікія наступленні расійскай арміі, каб адцягнуць нямецкія войскі ад Францыі. Пад Верд



## ЛІСА Ў ЛЕСЕ

У пятніцу атрымаў я запрашэнне пастраляць ваўкоў. На Беларусі яшчэ можна іх забіваць — па ўсёй Еўропе нельга, а ў нас дазваляецца. У суботу я мусіў трапіць на паляванне. З юначых гадоў я не хадзіў з ружжом, а таму і адмовіцца не змог, пагадзіўся адразу. Уявіў, як па глыбокім снезе будзе ляцець ваўчара, як гухне стрэл з майго ствала, як куля ўвойдзе ў воўчы голаў, у воўчы лоб, над самым носам... У юнацтве я марыў сустрэць у лесе вялікую вольную жывёлу. Хацелася пабачыць нашага лася ці нашага ваўка. Бачыў толькі нашых дзікоў, якія, вышнураваўшыся за важаком, ішлі ў начным тумане па іржышчы, праз шырокае поле. Страшна было, але жаданне пабачыць вялікага свабоднага звяра не прапала. Аднойчы я вочы ў вочы сустрэўся з лісой на лясной сцежцы. Рудая лісічка стаяла на невысокім пагорку паміж дзвюх елак. Я міргнуў, ліса прапала, як і не было. Ніводная галінка не варухнулася. Ліса была зусім блізка, здавалася: зрабі тры крокі, і яна — твая. Ды дзе там. Прапала, расплылася ў летнім паветры, як прывід. Нездарма людзі ў рудой лісе бачаць жанчыну-пярэваратня, ёсць відавочныя падставы. У ваўках нашы людзі таксама бачаць пярэваратняў, якіх называюць ваўкалакамі. Колькі казак у нас ёсць пра тое, што стрэліш у ваўка, а заб'еш чалавека. Застрэліць чалавека, перакінутага ў ваўка, я не баюся. Добры чалавек у ваўкалакі не пойдзе. Перакананы! Шкада, але на паляванне я не трапіў, бо з нядзелі на суботу перанесліся заняткі з маімі вучнямі. Сустрэча з вучнямі ў мастакоўскай студыі для мяне ўсё яшчэ важнейшая за сустрэчу з ваўкамі ў зімовым лесе.

## ЗМЕНЫ Ў НАВАКОЛЛІ

Сыход у нябыт твайго нават не самага блізкага сябра робіць увесь навакольны свет малацікавым. Ён цямнее і чарнее, колеры шарэюць і блякнуць, а гукі глухнуць. Нейкі час ты нават не ведаеш: як можна і ці можна вярнуць навакольлю звонкасць і каляровасць. Нудзішся. Нэндзішся. Маркоцішся. Нарэшце нейкае новае яркае ўражанне ледзь не слепіць цябе, і ты вяртаешся ў нармальную шматколернасць і шматгучнасць звычнага навакольля.

## КІПЛІНГ І КУПРЫН

Купрын у эсэ пра цудоўнага паэта сказаў: «...на выбітных творах Кіплінга няма двух самых дакладных адбіткаў генія — вечнасці і ўсёчалавецтва. У яго аповедах — асабліва калі прачытаеш усе, без перапынку, запар — адчуваецца не геній, радзіма якога свет, а Кіплінг-англічанін, толькі англічанін, і пры гэтым англічанін нашых дзён...» Варта дадаць, што ў творах Рэдзьярда Кіплінга ёсць той герой, пра якога спяваецца ў брытанскім гімне: «Ніколі, ніколі, ніколі/ Англічанін не будзе рабом!» Безумоўна, Купрын меў рацыю, разважаючы пра геніяльнасць, але і сам вялікі майстар слова Купрын са сваёю татарскай крывёю ды расійскім крыху плаксівым патрыятызмам быў далёкі ад усёчалавецтва.

## ЛАЯНКА Ў МЕТРО

«Вось, блях-мух, пакатаўся я ў метро!» — так сказала мужчынская галава, і слёзы паліліся з яе вачэй. Галава плакала ў вагоне, а яе цела тым часам заставалася на платформе стаяць... Пра заціснутага вагоннымі дзвярыма мужчыну распавядалася і распавядаецца шмат гісторый. Некалі здарылася дзіва — пад Мінскам пусцілі метро. Пра метро толькі ўсе і гаварылі. Ну а што за расповяды без ахвяры ды лаянкі са страшэннымі мацюкамі? Расказвалі: як мужчына ляцеў па станцыі Інстытут культуры, як замітусіўся каля адчыненых дзвярэй, як сунуўся ў вагон, і тут дзвярыма яму ледзь не адсекла неразумную галаву. Такога ж мужчыну бачылі і на Акадэміі навук. Каб ён рукамі дзверы не прытрымаў, яму б галаву і адрэзала! Казалі, што на плошчы Якуба Коласа мужчына з заціснутай дзвярыма шыяй бег па платформе... Усе гісторыі аб'ядноўвала адна выразная дэталь: мужчынская галава брудна аблайвала мінскі метрапалітэн. Можа, іншыя метрапалітэны так не аблайваліся і не абкладаліся шматпавярховымі мацюкамі, а наш і аблайваўся і абкладаўся з першага дня свайго існавання. Можа, таму нашае метро такое чыстае і дагледжанае?

## ЛІСТЫ ДА СЯБРОЎ

Дурань піша ліст да ворага. Разумны чалавек дасылае допісы сябрам ды таварышам. Ідыёты з ідыёткамі накіроўваюць слязлівыя пісьмы да ворага. Яны спадзяюцца, што вораг — дурыла, і, прачытаўшы іх ілжывыя пісьмы, ён зробіць нешта патрэбнае і карыснае не для сябе, а для іх. Свет поўніцца маразматычнымі спадзевамі на чужое глупства. Лісты варта пісаць толькі тым, хто цябе разумее і любіць. У самым крайнім выпадку можна напісаць адзін ліст да таго, каго любіш ты.

## КРАЯВІД І ЯГОНЫЯ ГУКІ

Каб намаляваць краявід, трэба ў яго ўслухоўвацца... Безумоўна, трэба, каб напачатку было ўражанне, каб ты спыніўся ў краявідзе. Зразумела, калі ты можаш спыніцца, бо шмат разоў мяне ўражвалі краявіды, убачаныя праз акно цягніка. Спыніцца я не мог і праз гэта нават перажываў. Такі краявід я маляваў па ўспамінах. Калі ж у цікавым краявідзе можна спыніцца, я абавязкова спыняюся і павольна разглядаю яго, я нібыта насычаюся навакольлем, а насыціўшыся, пачынаю маляванне. Хай гэта будзе маленечкі накід у тры рыскі, але такі накід мне моцна дапамагае ў студыі. Накід вяртае да першага ўражання, да азарэння. Зусім нядаўна, зноў наноў малюючы свой стары Мінск, я пачаў яшчэ і ўслухоўвацца ў краявід. Так, малюючы партрэт, я ўслухоўваўся ў голас мадэлі, я не столькі слухаў ці слухаўся, колькі ўслухоўваўся. Цяпер я пачаў услухоўвацца ў краявіды...

## КАЗІМІР І ПЕРАКАЗ

«Чорны квадрат» Казіміра Малевіча — гісторыя сусветнага мастацтва ў сціслым пераказе для тых, хто ў тэме.

## ФІКУС І МЯШЧАНСТВА

Цяжка сказаць, хто прыдумаў такое глупства — назваць фікус сімвалам мяшчанства. Але ж назвалі, дурнаватае вызначэнне прыжылося і людзі павыносілі і павыкідалі свае расліны. У часы майго маленства фікусаў у Мінску было шмат. Лакіраваналістыя, заўжды сакавіта-зялёныя, яны стаялі ў кватэрах і інтэрнатах, у кінатэатрах ды клубах, на прадпрыемствах і вакзалах... Фікусы былі паўсюль. Больш за ўсё ў тых фікусах я любіў залаты, скінуты долу лісток. Яго можна было ўзяць і вынесці на вуліцу і пусціць па вясновай ручаіне ў ваколсветнае плаванне. А тут пайшлі размовы пра гнілое мяшчанства, пра пыльныя маткаштоўнасці, пра ржавыя плямы мінуўшчыны. Фікус быў прызнаны знакавай раслінаю. Калі ў цябе фікус, ты — недальнабачны мешчанін, ты — нявера, якому няма месца ў райска-камуністычнай будучыні, ты — шкоднік. Тут і захацеў бы ты фікус пакінуць, ды не пакінеш. У мяккім варыянце здавалася, што фікус больш не модны. Так ці інакш, а фікусы не ўпісаліся ў новую архітэктурную кампазіцыю, што прыйшла на пачатку шасцідзесятых гадоў. Неакласіцызм замяніўся неаканструктывізмам, у інтэр'ерах стала шмат сонечнага святла, і цёмналістыя фікусы зніклі. Цяпер мяшчанства пакрыхы вяртаецца, яго цяперака называюць сярэднім класам, ягоныя каштоўнасці ўздымаюцца на глянец шматлікіх рэкламазборных часопісаў. Паглядзім, можа і фікус зноў прыйдзе ў чыёсьці дзяцінства, і нехта возьме ягоны залаты ліст і пусціць па вясновай ручаіне ў ваколсветную вандроўку.

**Адам ГЛОБУС.**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**РЭСПУБЛІКАНСКІ-22**

Конкурс праводзіўся намі сумесна з ГА «Беларуская федэрацыя шашак» і быў адкрытым. У ім удзельнічалі складальнікі камбінацыйных міні-праблем з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі. Яны прадставілі 92 задумкі на 64-клетачнай дошцы. Іх разгледзелі мінчане арбітр В. Шульга, каардынатар В. Грабенка, кансультанты Б. Іваноў і А. Гімбутас з Літвы. У выніку пераможцамі аб'яўлены П. Шклудаў з Наваполацка, С. Фурманаў у сааўтарстве з Д. Камчыцкім (Магілёў) і ўкраінец А. Ныч (катэгорыя А), А. Ныч, П. Шклудаў і мінчанін І. Наўроцкі (катэгорыя В), І. Наўроцкі, П. Шклудаў і расіянін Р. Шасцерыкаў (катэгорыя С). Ім будуць уручаны адпаведныя дыпломы.

У рамках нашага **бліца-60/1** пазнаёмімся з лепшым творам конкурсу — 8,25 ачка па змесце, які належыць майстру спорту Івану Наўроцкаму:



**Белыя:** a5, a7, b6, c7, f6, g5, g7, h6 (8). **Чорныя:** a3, b2, c3, c5, d4, d8, e7, h2, h4, h8 (10). Выйгрыш.

**АЎТАРСКІЯ-11 І 12**

Дапытлівыя аналітыкі ў аўтарскім конкурсе-11 У. Матуса знайшлі пабочныя развязкі: у заданні № 8 — 1. 12-8 2. 44-39/23-18х і № 11 — 1. 30-24/14-9х.

Іх жа заўвагі да заданняў аўтарскага конкурсу-12 П. Шклудава мы паведамілі 11 студзеня.

З улікам гэтага лаўрэатамі прызнаны 8 канкурсантаў: Іван Астроўскі (Мінск), Аляксандр Белы (Наваполацк), Аляксандра Камінская (Вілейка), Канстанцін Козел (Гродна), Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) і Аляксандр Шурпін (Клімавічы). Іх чакаюць сюрпрызы.

«Завяршыліся конкурсы і на душы стала крышачку сумна, — піша В. Талкачоў.— Канцоўкі У. Матуса і П. Шклудава давалі задавальненне. У іх закладзены глыбокі сэнс: камбінацыі, якая блізка падыходзіць да практычнай гульні. І на развітанне хочацца пажадаць: таленавітым аўтарам моцнага здароўя, асабістага шчасця, поспеху і творчага натхнення за 100 і 64-клетачнымі столікамі».

**У ІХ ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА**

Гэта тычыцца грасмайстра СССР з Гомеля Леаніда Вітошкіна і міжнароднага майстра з Мінска Віктара Шульгі, у чым вы маеце магчымасць пераканацца на прыкладах іх аўтарскіх конкурсаў. Сёння яны прапануюць новыя заданні:

№ 13/16 (Л. Вітошкін). **Белыя:** a7, b2, d4, d6, e5, f2, g1, h4, h6 (9). **Чорныя:** a5, c3, d2, d8, f6, f8, g7, h2 (8).



№ 14/10 (В. Шульга). **Белыя:** 6, 12, 20, 23, 25, 29, 30, 34, 49 (9). **Чорныя:** 1, 9, 15, 16, 22, 27, 38, 40, 44, 45 (10).

У абодвух заданнях белыя пачынаюць і перамагаюць.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**Аўтарскія: 13/11** (Л. Вітошкін). g7, e7, d8, g5 (f4A) g3, e3x. A(f6) g7, f2 (e7) e3 (d6/f6) d4/f4x і **13/12**. f6, a3, g5, d4, e7, g1 (g3) b8 (b6) a7 (g1) h2x, **14/5** (В. Шульга, І. Івацка). 33, 24, 21 (5**A**) 4 (27**B**) 36 (10) 41(15) 37 (20) 42 (25) 48x. **B**(17) 6x. **A**(3) 4 (17**C**) 6x. **C**(27) 36x і **14/6** (В. Шульга). 7, 2, 30-24 (19**A**) 20 (37) 47x. **A**(13) 36 (28) 47 (32) 42 (19**B**) 15 (37**C**), 10x. **C** (23) 20 (28**D**) 42x. **D**(37) 14x. **B**(20, 37) 47x. **Легальнасць:** (33-38) 21 (8) 18 (14).

Іх, а таксама папярэднія заданні выканалі: Ул. Сямашка (Брэст), А. Кіслы (Узда), У. Валчкоў (Маладзечна), І. Ананіч і М. Райдзюк (Гродна), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Нікіфараў (Мінск), М. Саўкін (п/а Суднікі Валожынскага раёна), М. Трухан (в. М. Пагост Салігорскага раёна), А. Белы, С. Нячаеў, У. Сапяжынскі, А. Шурпін, І. Астроўскі, А. Камінская, К. Козел, В. Талкачоў і інш.

## ПРАПУСЦІЦЕ «ХУТКУЮ ДАПАМОГУ»!

Не ўсе кіроўцы транспартных сродкаў гэта разумеюць, у чым пераканаліся супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі падчас прафілактычнай акцыі ў Гродне «Саступі «хуткай» дарогу». На шасцярых кіроўцаў, якія не прапусцілі машыну «хуткай дапамогі», склалі пратаколы — штраф да дзесяці базавых велічынь. Акрамя таго, яны могуць на год пазбавіцца права кіравання аўтамабілем.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



## БЛІЗНЯТЫ НЕ ПАВІННЫ РАЗМЕНЬВАЦЦА ПА ДРОБЯЗЯХ, А ШАЛЯМ ЛЕПШ ПАЗБЯГАЦЬ ВЫСВЯТЛЕННЯ АДНОСІН

**БАРАН.** Неабходна стратэгічна правільна пабудаваць свае адносіны з партнёрамі па бізнэсе або калегамі па працы, і тады шматлікія праблемы вырашацца самі сабой. Успрымайце без крыўдаў крытычныя заўвагі ў свой адрас, прыслухайцеся да іх. У іх цалкам рэальна знайсці канструктыўныя думкі, а яны могуць спатрэбіцца. У сераду можаце разлічваць на дапамогу сяброў. У пятніцу ўдала пройдуць дзелавыя сустрэчы, бо пачуццё такту і шчырасць дазволяць віртуозна справіцца з пастаўленымі задачамі. Часцей бывайце ў прыемных грамадстве, тым больш, што нефармальныя сустрэчы і кантакты могуць быць вельмі карыснымі.

**ЦЯЛЕЦ.** Не варта сябе перагружаць. Паспрабуйце скараціць аб'ём працы. Лепш лішні раз абдумайце свае словы і дзеянні — а на гэта трэба час. Хуткі прагрэс у справах практычна немагчымы, таму пажадана назапасіцца цярпеннем. У сярэдзіне тыдня магчымыя нечаканыя весткі. У пятніцу вас могуць уцягнуць у службовыя інтрыгі. Да канца тыдня атрымаецца прыцягнуць да сябе ўвагу кіраўніцтва і заручыцца падтрымкай уплывовых асоб. Ваша задача на тыдзень — з той жа энергіяй, з якой займаецеся домам, сям'ёй і працай, пачаць займацца сабой. Суботу можна прысвяціць рамонту кватэры, дачы або навядзенню парадку ў доме. У нядзелю адпачніце, працаваць у гэты дзень не варта.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вас чакае нейкая вяршыня, да якой вы ішлі доўгім і цяжкім шляхам. Добра было б не прапусціць знак, які пакажа кірунак руху на апошніх метрах, інакш вы можаце праскочыць міма. Майце на ўвазе: стане бачны праўдзівы ўзровень вашых дасягненняў у самых розных сферах — наўрад ці атрымаецца нешта схаваць. У панядзелак не разменьвайцеся па дробязях. Серада — спрыяльны дзень для самаўдасканалення і ператварэння. У чацвер важна не страціць кантролю над падзеямі, якія адбываюцца. Ні ў якім разе не верце чуткам і плёткам — толькі тады інтуіцыя акажа вам неацэнную паслугу.

**РАК.** Практычнасць і вытрымка — вось якасці, якія прывядуць да поспеху. Можаце пазнаёміцца з чалавекам, які паўплывае на вашу кар'еру. Паспрабуйце ўлавіць павевы змен, каб па максімуме скарыстацца спрыяльнымі магчымасцямі. Не турбуйцеся з нагоды дробных непрыемнасцяў на працы. Памятайце: калі ідэі перспектыўныя, а, хутчэй за ўсё, так яно і ёсць, то імгненнае іх непрыманне не павінна бянтэжыць. Паспрабуйце не загрувашчваць кватэру непатрэбнымі рэчамі, разбярыцеся і выкіньце ўсё непатрэбнае. Ваша схільнасць усё рабіць хутка пахвальная, аднак варта памятаць, што найбольш просты і хуткі спосаб вырашэння праблемы — далёка не заўсёды лепшы.

**ЛЕЎ.** Здолееце зрабіць многае, хоць і не ўсё з таго, што было запланавана. У панядзелак не выключаны сутыкненні з канкурэнтамі. Камандзіроўкі і асабістыя паездкі пройдуць удала. У сераду вас могуць уцягнуць у канфлікт. Паспрабуйце заняць незалежную пазіцыю, але даводзіць апанента да злосці, асабліва калі гэта ваша начальства, таксама не варта. Сярэдзіна тыдня ўдалая для роздумаў аб змене месца працы. У пятніцу магчыма паступленне памылковай інфармацыі, так што варта абдумаць пачутае, перш чым пачынаць дзейнічаць. У канцы тыдня могуць быць цяжкасці ў зносінах з дзецьмі.

**ДЗЕВА.** Давядзецца цярпліва і ўпарта прасоўвацца наперад па стромкай і вузкай сцяжынцы. Запатрабуецца нямала намаганняў і часу, каб вырашыць шматлікія дробныя праблемы. Бліжэй да выхадных нечакана можа прачнуцца жаданне даваць карысныя парады і ўсяляк вучыць навакольных жыць. Каб не нарвацца на сустрэчную просьбу дапамагчы матэрыяльна або яшчэ менш прыемныя наступствы, спачатку падумайце, ці сапраўды вашы павучанні запатрабаваныя. У пятніцу паспрабуйце пераадолець ляноту і актыўна ўключыцца ў працу — гэта зберажэ ад неабходнасці апраўдвацца. Справы, якія пачалі ў суботу, будуць, хутчэй за ўсё, мець паспяховае завяршэнне.

**ШАЛІ.** Адпачывайце, пакуль ёсць магчымасць. Такой магчымасці няма? Тады майце на ўвазе, што ў тых, каму давядзецца працаваць, можа кульгаць дысцыпліна. Вам вельмі цяжка будзе засяродзіцца на бягучых задачах, а ўжо аб новых справах і казаць няма чаго. У аўторак не варта зацыклівацца на сямейных праблемах: спроба высвятлення адносін не толькі не растлумачыць сітуацыю, але і забяспечыць скандал. Спроба пачаць што-небудзь новае ў другой палове тыдня зойме ўвесь час, але не прынясе вынікаў.

**СКАРПІЁН.** Можаце здзейсніць прарыў да новых вышынь. Дапамога сяброў або проста знаёмых будзе для вас вельмі важнай. Засяродзьцеся на працы, бо гэта неабходна, каб пазбегнуць крытычных заўваг і непрыемнасцяў. Паспрабуйце быць больш цярплівымі да малаважных недахопаў навакольных, інакш вашы прыдзіркі па дробязях могуць дастаць каго заўгодна. У панядзелак можа зацікавіць новая карысная інфармацыя, а ў найбліжэйшай будучыні яна можа прынесці нядрэнны прыбытак. У чацвер сябры дапамогуць справіцца з некаторымі праблемамі. Магчыма прапанова новай працы — пажадана такую інфармацыю не прапусціць.

**СТРАЛЕЦ.** Тыдзень удалы для падвядзення прамежкавых вынікаў, у тым ліку — і ў выглядзе справаздач аб праведзенай працы. Эксперыменты непажаданыя, лепш дзейнічаць праверанымі метадамі. У панядзелак не рэкамендуецца наладжваць дзелавыя адносіны з новымі партнёрамі. У аўторак таварыскасць і жыццеўстойлівасць знойдуць сабе годнае ўжыванне. У другой палове тыдня верагодныя некаторыя ўскладненні ў справах і непаразуменні з дзелавымі партнёрамі. Могуць быць складанасці і ў адносінах са сваякамі, таму неабходна прыкласці пэўныя намаганні для вырашэння гэтых праблем, пакуль яны яшчэ дробныя.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень можа быць занадта складаным і супярэчлівым, каб вы паспелі разабрацца ў сітуацыі, перш чым наступіць нядзеля. І не спрабуйце: усё вырашыцца само, толькі крыху пазней. У панядзелак давядзецца прабівацца скрозь перашкоды, каб дамагчыся жаданага выніку. У аўторак дзверы сваёй інтуіцыі, і яна не падвядзе. У сераду могуць актывізавацца ворагі і канкурэнты. У другой палове дня сітуацыю згладзіць дапамогуць сябры або высокія заступнікі, агульнымі намаганнямі вы дасягнеце жаданага кампрамісу.

**ВАДАЛЕЙ.** Любая праява арыгінальнасці з вашага боку будзе ўспрымацца навакольнымі парознаму, часам рэакцыі будуць процілеглыя. Не варта ўпадаць у крайнасці. Безнадзейныя, з пункта гледжання калегаў, праекты вы зможаце ажыццявіць у сярэдзіне тыдня, выклікаўшы вакол шэпт захапленія і здзіўлення. У сераду вы бліскуча прадэманструеце свой прафесіяналізм. У чацвер могуць вярнуцца бумерангам нявырашаныя раней праблемы, таксама будуць цягнуць назад старыя абавязкі. У выхадныя дні лепшы спосаб згладзіць хатнія непрыемнасці — заняцца добраўпарадкаваннем кватэры.

**РЫБЫ.** Можаце ажыццявіць свае творчыя парывы. Добрая сітуацыя для рэалізацыі лепшых рыс вашага характару і вашых здольнасцяў. Трымайцеся мацней за аднадумцаў: іх парады будуць мудрыя і рэалістычныя. Неабходна скандэнтраваць увагу на пастаўленых мэтах. У аўторак прыслухайцеся да голасу інтуіцыі — і поспех не выслізне з вашых рук. У панядзелак спрыяльныя паездкі і камандзіроўкі. У сераду, калі ёсць магчымасць, добра было б зрабіць для сябе дзень адпачынку, а яшчэ лепш паехаць за горад і атрымліваць асалоду ад прыроды. У суботу лепш не ўступаць у спрэчкі з роднымі — гэтым вы толькі ўскладніце адносіны. Дзеці пацешаць сваімі дасягненнямі.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Повторный открытый аукцион (далее – аукцион) по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества состоится 12 апреля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, конт. тел. (8017) 200 20 89, каб 227.**

**НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЮТСЯ:**

| № лота | лот № 1 | лот № 2 | лот № 3 | лот № 4 | лот № 5 | лот № 6 | лот № 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | Не завершенное строительством здание и сооружение блока доочистки «Минская станция аэрации, 3-я очередь» объекта «Канализационные очистные сооружения (расширение)» 1-я очередь и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Здание специализированное коммунального хозяйства (подземный общественный туалет) с инвентарным номером 500/С-30082 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Здание неустановленного назначения (подземный общественный туалет) с инвентарным номером 500/С-35019 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Здание неустановленного назначения (подземный общественный туалет) с инвентарным номером 500/С-43680 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Не завершенный строительством объект «Автоцентр скорой и неотложной медпомощи на 500 автомашин по ул. П. Бровки в г. Минске» и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения с инвентарным номером 500/С-23731 и имущество (контейнерная площадка, зеленые насаждения (клен остролистый 5 ед.), благоустройство (тротуар из сборных бетонных плит, бетонные бортовые камни), лифт, фидерный щит, распределительное устройство) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания | Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-48358 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| Место нахождения недвижимого имущества | г. Минск, промузел «Шабаны», ул. Инженерная, 3 | г. Минск, ул. Ольшевского, 63а | г. Минск, ул. Корженевского, 4а | г. Минск, ул. Ландера, 36г | г. Минск, ул. П. Бровки, 38А | г. Минск, ул. Харьковская, 70 | г. Минск, ул. Павловского, 58, военный городок № 220 «Сосны» |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 8 558 127 782 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 8 039 807 188 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 518 320 594 белорусских рубля) | 109 704 090 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 70 215 942 белорусских рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 39 488 148 белорусских рублей) | 93 059 375 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 80 847 451 белорусский рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 12 211 924 белорусских рубля) | 56 848 618 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 39 555 710 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 17 292 908 белорусских рублей) | 8 931 793 473 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 7 709 959 137 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 1 221 834 336 белорусских рублей) | 1 652 328 868 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 1 335 318 744 белорусских рубля, право заключения договора аренды земельного участка – 317 010 124 белорусских рубля) | 3 625 221 902 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 3 547 637 395 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 77 584 507 белорусских рублей) |
| Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 855 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 10 900 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 9 300 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 5 600 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 893 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 165 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 360 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе |
| Продавец недвижимого имущества | Государственное производственное объединение «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», 220037, г. Минск, ул. Червякова, 25, тел.: (8017) 233 26 64, 233 10 59 (осмотр) | Ремонтно-строительное коммунальное унитарное предприятие «МАФ» 220048, г. Минск, ул. Казинца, 7а, ком. 1, тел.: (8017) 278 81 63, 278 38 00, 207 05 54 (осмотр) | Ремонтно-строительное коммунальное унитарное предприятие «МАФ» 220048, г. Минск, ул. Казинца, 7а, ком. 1, тел.: (8017) 278 81 63, 278 38 00, 207 05 54 (осмотр) | Ремонтно-строительное коммунальное унитарное предприятие «МАФ» 220048, г. Минск, ул. Казинца, 7а, ком.1, тел.: (8017) 278 81 63, 278 38 00, 207 05 54 (осмотр) | КУП «УКС Мингорисполкома», г. Минск, ул. Советская, д. 17, тел. 328 58 48 | Унитарное предприятие «Киновидеопрокат», г. Минск, ул. Красноармейская, д. 26, тел.: (8017) 223 37 34, (8017) 227 08 78 | ГУ «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24, конт. тел. (8 017) 266 52 33 |
| Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества | Общая площадь – 2, 5432 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000002006709; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,0469 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000006004483; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,0161 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000004004430; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,0228 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000004003374; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 1,3760 га, с ограничениями в использовании земель – водоохранная зона водных объектов г. Минска, охранные зоны линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,3633 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000006001984; срок аренды – 5 лет | Общая площадь – 0,1478 га; кадастровый номер земельного участка – 500000000002005958; срок аренды – 5 лет |
| Арендодатель земельного участка | Минский городской исполнительный комитет | | | | | | |
| Характеристика недвижимого имущества | Начало строительства – 1988 год; размеры в осях – 162,5 м х 54 м; отдельностоящее, одноэтажное здание включающее в себя отделение барабанных сеток, отделение фильтров и галерею трубопроводов служащих для подачи, распределения и отвода сточных вод на дополнительную доочистку, насосную станцию, административно-бытовой корпус, помещения трансформаторной подстанции; степень готовности объекта – 75% | Общая площадь – 75 кв.м, год постройки – 1987. Здание бескаркасное; фундамент – монолитный железобетон; стены – железобетонные; перегородки – кирпичные; инженерные коммуникации находятся в аварийном состоянии; не используется с 1995 г. | Общая площадь – 120,6 кв.м, год постройки – 1983. Здание бескаркасное; фундамент – железобетонный; стены – кирпичные, железобетонные; перегородки – кирпичные; инженерные коммуникации находятся в аварийном состоянии; не используется с 1995 г. | Общая площадь – 84,8 кв.м, год постройки – 1978. Здание бескаркасное; фундамент – железобетонные блоки; стены – бетонные блоки; перегородки – кирпичные; инженерные коммуникации находятся в аварийном состоянии; не используется с 1995 г. | В состав объекта входят: гараж – стоянка на 500 автомашин (здание представляет собой круглый восьмиэтажный объем диаметром 56 м и высотой этажа 3,3м), административно-бытовая и производственная пристройка (двухэтажное здание с размерами в плане 24*30 м, высота первого этажа – 4,2 м, второго – 3,3 м; работы по внутренней отделке, внутренним инженерным сетям, благоустройству и монтажу технологического оборудования не производились; степень готовности объекта – 50 % | Общая площадь – 2183,0 кв.м, год постройки – 1971; фундамент – железобетонные блоки; стены – панели, стекло, кирпичные; перегородки – железобетонные плиты; техническое состояние здания удовлетворительное, пригодно к эксплуатации; капитальные ремонты, модернизация, реконструкция не проводились | Общая площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году; стены – железобетонные панели, кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; степень готовности объекта – 44% |
| Условия использования недвижимого имущества | Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией | Изменение функционального назначения при условии сохранения в составе нового объекта общественного туалета | Изменение функционального назначения при условии сохранения в составе нового объекта общественного туалета | Изменение функционального назначения при условии сохранения в составе нового объекта общественного туалета | 1. Освоение данной территории в соответствии с утвержденной градостроительной документацией;<br>2. Возмещение налога на добавленную стоимость проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ в бюджет г. Минска в течение 30 дней с момента подписания договора купли-продажи с уточнением УП «УКС Мингорисполкома» суммы налога на добавленную стоимость на момент перечисления;<br>3. Возмещение в течение 30 дней с момента подписания акта приема-передачи в бюджет г. Минска стоимости затрат на дополнительные проектно-изыскательские, строительно-монтажные и прочие работы, понесенных УП «УКС Мингорисполкома» на дату подписания акта приема-передачи;<br>4. Возмещение 8 655 995 рублей – стоимости работ по изготовлению ведомости технических характеристик объекта на р/с 3012016353515, отделение № 535 г. Минск ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, ОКПО 37558116, код банка 153001739, адрес банка: 220033, г. Минск, пр. Партизанский, 6а РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» | 1. Возместить в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска стоимость проектно-изыскательских работ по объекту «Реконструкция здания специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения» в сумме 99 931 264 рубля, назначение платежа 05520;<br>2. для дальнейшего использования объекта в целях физкультурно-оздоровительного, спортивного и культурно-развлекательного назначения с сохранением зрительного зала | |
| Условия использования земельного участка | Для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией. Беспрепятственный доступ к земельному участку победителю аукциона обеспечивает КУП «Минскводоканал». Победителю аукциона в установленном порядке получить разрешение на разработку (корректировку) проектно-сметной документации по завершению строительства объекта | Для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией с возможностью изменения его функционального назначения с обязательным условием сохранения в составе нового объекта помещений общественных туалетов | Для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией с возможностью изменения его функционального назначения с обязательным условием сохранения в составе нового объекта помещений общественных туалетов | Для его дальнейшего использования в соответствии с утвержденной градостроительной документацией с возможностью изменения его функционального назначения с обязательным условием сохранения в составе нового объекта помещений общественных туалетов | В соответствии с регламентами генерального плана г. Минска – для дальн

# ЗА МАЛАДЫХ!

Бяседныя песні

Мікалай Алешка нагадвае Дон Кіхота. Такі ж высокі, танклявы, з дапытлівым позіркам і затоенай усмешкай на вуснах. Маляўнічы выгляд ён атрымаў у спадчыну ад дзеда Фёдара Цімафеевіча — дбайнага вясковага працаўніка, які ў ваеннае ліхалецце дайшоў да Берліна.

Цяга да музыкі перадалася яму ад маці Раісы Пятроўны. Яна клапатліва ставілася да творчых задаткаў сына. Развіццё яго таленту разгортвалася ў роднай вёсцы Вясея, што на Случчыне. Тут Мікола нарадзіўся 15 ліпеня 1967 года, вучыўся ў сярэдняй школе. Сюды раз на тыдзень прыязджалі выкладчыкі з Грэскай музычнай школы і праводзілі заняткі з мясцовымі дзецьмі.

Увесь час Міколу шанцуе на настаўнікаў. У яго станаўленні як музыкі вялікая роля належыць Івану Чарапко, выхаванцу Магілёўскай музычнай школы, выпускніку Беларускага ўніверсітэта культуры. Ён уважліва займаўся з падлеткам, карпатліва рыхтаваў яго да конкурсаў.

Пасля перамогі на рэспубліканскім конкурсе баяністаў для Мікалая Алешкі выразна акрэсліўся далейшы шлях. Спачатку Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі, потым Беларуская акадэмія музыкі... Яго запрыкмеціў мастацкі кіраўнік ансамбля народнай музыкі «Бяседа» Леанід Захлеўны і запрасіў на працу. З 1991 года, пасля трэцяга курса, Мікалай у складзе «Бяседы». Гэта стала лёсавызначальнай з'явай для таленавітага юнака. Ён узначальвае аркестравую групу ансамбля, робіць аранжыроўкі для калектыву, паспяхова авалодаў народным інструментам — гармонікам.

У ансамблі выявіліся кампазітарскія здольнасці Мікалая Аляксандравіча. На вершы беларускіх паэтаў напісаў шмат песень: «За зялёным гаем», «Песенька шафёра», «Вечарніца», «Яблычак румяны», «Беларускае вяселле» і інш. А такія, як «Былі ў мяне сваты», «За маладых!», «Кума», «Бульба» і інш. увайшлі ў рэпертуар многіх калектываў мастацкай самадзейнасці. У выкананні «Бяседы» гучаць як песні, так і інструментальныя творы, напісаныя таленавітай асобаю — Мікалаем Алешкам.

## ЗА МАЛАДЫХ!

**Верш Уладзіміра Пецюкевіча**
**Музыка Мікалая Алешкі**

Гудзе вяселле і звініць:
Музыкі граюць — не спыніць!
Пяе застолле — не суняць!
Сват запрашае чарку ўзняць.

**ПРЫПЕЎ:**
*— Давай, браткі, нальём,*
*Давай, браткі, кульнём*
*Па чарцы беленькай,*
*Па чарцы светленькай.*
*За нашых маладых,*
*За шчасце-долю іх*
*Мы вып'ем, зноў нальём*
*За маладых!*

За маладых, за іх святло,
Што ў сэрцы любасцю ўзышло,
За іх каханне, за любоў,
Каб не згасала сто гадоў!

**ПРЫПЕЎ.**

За маладых, за іх красу,
Што так нагадвае вясну,
За бацяна, каб ён насіў
Штогод чароўных дзетак ім!

**ПРЫПЕЎ.**

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**




## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

### Нядзеля, 3 красавіка

Дзень абяцае атрымацца плаўным і мяккім, магчыма, нават залішне: не варта чакаць мэтанакіраванасці і баявога настрою, затое можна разлічваць на цалкам камфортны эмацыйны фон. Можна пры жаданні атрымаць максімум задавальнення ад выцця незалежна ад выгляду сённяшняй крывой практычных дасягненняў.

### Панядзелак, 4 красавіка

Жаліцца на недахоп дынамікі сёння не давядзецца. Ва ўсякім разе, першая палова дня абдзеленая ёю не будзе. У той жа час цяжкаватым будзе атрыманне практычных вынікаў і маральнага задавальнення ад дня ў цэлым.

### Аўторак, 5 красавіка

Дзень абяцае атрымацца даволі камфортным з эмацыйнага пункту гледжання і пры гэтым не пазбаўленым дзелавых і працоўных перспектыў. Зрэшты, апошняе ў большай ступені будзе залежаць ад канцэнтрацыі і ўмення ў патрэбны момант сабрацца, мабілізаваць рэсурсы і накіраваць усё гэта на рашэнне пэўнай задачы. Калі пастаянна змяняць «асноўны кірунак стральбы», распыляючыся і перескокваючы з тэмы на тэму, то і вынік атрымаецца адпаведны.

### Серада, 6 красавіка

Для адчувальнага руху наперад спатрэбяцца проста тытанічныя намаганні. Зрэшты, калі нават імі абзавесціся і накіраваць у жаданае рэчышча, няма ніякай гарантыі, што ўсё гэта не ўзнагародзяць вядомым штампам «з упартасцю, годным лепшага прымянення ...» Увогуле, сціплая дынаміка дня будзе трохі прыхарошана эмацыйнай лёгкасцю і ўспрымальнасцю, аднак чакаць вельмі многага не варта.

### Чацвер, 7 красавіка

Дзень абяцае як мінімум нядрэнны эмацыйны фон без перагібаў, гатоўнасць і ўменне працаваць галавой і масу цікавых стасункаў, але трохі падразае крылы новым ідэям і планам — працэсы будуць працякаць куды больш павольна, чым хацелася б. І ў гэтым плане важна знайсці сабе адпаведны занятак, а не проста чакаць, калі ўсё закруціцца весялей.

### Пятніца, 8 красавіка

Дзень вызначаецца прыемным эмацыйным фонам. Можна разлічваць калі не на паспяховае рашэнне практычных пытанняў, то хоць бы на павышаную колькасць цікавых, сустрэч і ўражанняў. Даволі роўны і збалансаваны дзень, які няхай і не збіраецца ставіць рэкордаў па насычанасці і дынамічнасці.

### Субота, 9 красавіка

Сёння не лепшы час не тое што для далёкіх паездак, сур'ёзных пакупак або лоўлі рыбы ў мутнай вадзе, а наогул для любых пачынанняў, звязаных са стварэннем і канструктывам. Затое варта засяродзіцца на навядзенні парадку, пазбаўленні ад баласту і ўсяго, што замінае і абцяжарвае. Праўда, заадно можна цалкам пазбавіцца і ад чагосьці патрэбнага і важнага, але тут ужо ўсё будзе залежаць ад разважнасці і асцярожнасці кожнага з нас.

## Усміхнемся

Двое сяброў.
— Ты робіш ранішнюю зарадку па радыё?
— Толькі першае практыкаванне.
— Якое?
— «Расчыніце фортачку».
☺

**Купіў таматны сок серыі «Фітнэс». Самы фітнэс быў першыя пяць хвілін, пакуль я яго спрабаваў адкаркаваць...**
☺

Дзеці — кветкі жыцця :-)
— Мама, купі мне гэту ляльку!
— Не цяпер: пачакаем да татавай зарплаты.
Дзяўчынка (летуценна):
— Калі я вырасту, у мяне будзе два мужы адразу...
— Навошта?!
— А каб дзве зарплаты.

☺

**Часам ствараецца такое ўражанне, быццам суседзі нават шпалеры лепяць перфаратарам...**
☺

— Мая жонка — прусак.
— ???
— Яна дала мне абяцанне пахудзець. І зараз есць толькі ўначы на кухні, калі я сплю. А калі ўключаеш святло — пачынае ў паніцы хавацца...
☺

**Дзявочыя назіранні.**
**Адчыняю халадзільнік — святло гарыць. Адкрываю сумачку — не гарыць. А ў сумачцы яно больш патрэбнае!**
☺

Экзамен.
— Слухай, а чаго гэты выкладчык усіх запар валіць?
— Ды разумееш, у яго зяць у ваенкамаце працуе, а ў іх недабор...
☺

**Вясна. Грамадзяне ў метро ўжо сталі больш кампактнымі, чым два месяцы таму, але яшчэ не настолькі пахкімі, як стануць праз два месяцы...**

## КРЫЖАВАНКА «Славутыя імёны жанчын»

Склаў Генадзь БАРКУН.



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Беларуская спартсменка, чэмпіёнка СССР і Еўропы 1969 г. па веславанні на байдарках. **6.** Салістка Беларускага тэатра оперы і балета, народная артыстка БССР. **9.** Партызанка Беларусі, Герой Савецкага Саюза. **11.** Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаная настаўніца БССР. **12.** Этнограф, доктар гістарычных навук, аўтар праца па матэрыяльнай культуры беларусаў. **15.** Польская спявачка, выканаўца савецкіх песень. **18.** Кіраўнік падпольнай групы ў пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна, пасмяротна ўзнагароджана медалём «За адвагу», яе імем названа адна з вуліц пасёлка. **19.** Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў Віцебскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. **20.** Руская савецкая паэтэса, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1943 г.) за паэму «Зоя». **21.** Гісторык, аўтар прац па праблемах Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі. **24.** Заслужаная артыстка БССР, актрыса Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. **26.** Удзельніца сацыял-дэмакратычнага руху на Беларусі, адзін з перакладчыкаў першага тома «Капітала» К. Маркса. **27.** Першая жанчына-геолаг у Расіі, ураджэнка Лепельскага павета. **31.** Народная артыстка БССР, працавала ў тэатрах ім. Я. Коласа і Я. Купалы. **33.** Імя Героя Савецкага Саюза, польскай патрыёткі Кжывань. Вызначылася ў баі восенню 1943 г. у Горацкім раёне. **34.** Беларускі архітэктар, аўтар праектаў будынкаў Мінскага абкома КПБ, галоўнага корпуса Беларускага політэхнічнага інстытута і інш. **35.** Заслужаная артыстка БССР, працавала ў тэатрах ім. Я. Коласа і Я. Купалы. **36.** Машыніст Гомельскага паравознага дэпо, Герой Сацыялістычнай Працы. У гады вайны забяспечвала дастаўку грузаў да лініі фронту.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Беларуская паэтэса, перакладчыца. **2.** Оперная спявачка, народная артыстка БССР. **3.** Актрыса кіно і тэатра, Народная артыстка СССР, галоўная гераіня кінафільма «Волга-Волга». **4.** Беларуская пісьменніца і грамадска-культурны дзеяч, у 30-я гг. XX ст. рэдагавала часопісы «Заранка» і «Беларуская борць». **7.** Беларуская пісьменніца, працавала рэдактарам мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь», з 1967 г. — у часопісе «Полымя». **8.** Беларуская пісьменніца, паэтэса, дзеяч беларускага адраджэння, з 1948 па 1956 гг. знаходзілася ў турмах і лагерах як палітычная зняволеная. **10.** Беларускі вучоны ў галіне меліярацыі, заслужаны меліяратар БССР. **13.** Беларуская пісьменніца, працавала ў часопісе «Работніца і сялянка», выдала некалькі кніжак для дзяцей. **14.** Беларуская спартсменка па спартыўнай гімнастыцы, чэмпіёнка свету і Еўропы (1971 г.). **16.** Беларускі геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук, даследавала геалогію крэйдавых, палеагенавых і антрапагенавых адкладаў Беларусі. **17.** Герой Сацыялістычнай Працы, звеннявая па вырошчванні льну ў Талачынскім раёне. **22.** Дзеяч міжнароднага рабочага і камуністычнага руху, удзельніца Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пахавана на Краснай плошчы ў Маскве. **23.** Беларускі вучоны ў галіне фізікі, хіміі і тэхналогіі шкла. **25.** Савецкі гісторык, доктар гістарычных навук, ураджэнка Клімавіцкага раёна, адна з рэдактараў першага тома «Гісторыі Беларусі» ў 5-ці тамах. **28.** Беларуская спартсменка па фехтаванні, двухразовая чэмпіёнка XIX Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнка свету (1969 г.). **29.** Дыктар беларускага радыё, заслужаны дзеяч культуры БССР. **30.** Імя народнай артысткі Расіі, сучаснай артысткі эстрады Новікавай. **32.** Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці Брэсцкага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы. Узнагароджана ордэнам Леніна, адзінаццаццю медалямі ВДНГ СССР.

**АДКАЗЫ:**
**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Бакуліна. **6.** Дуркер. **9.** Трапяк. **11.** Казелі. **12.** Мальчаўскага. **15.** Германн. **18.** Радзюк. **19.** Панкова. **20.** Ліпер. **21.** Гнуўко. **24.** Скарута. **26.** Гурбік. **27.** Міслуна. **31.** Бялінская. **33.** Анэлія. **34.** Усава. **35.** Арлова. **36.** Чухнюк.
**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Мацяш. **2.** Мордак. **3.** Арлова. **4.** Верас. **7.** Арабей. **8.** Гейшын. **10.** Шабе. **13.** Васілевіч. **14.** Глазкоўіч. **16.** Ланенка. **17.** Іваніота. **22.** Арка. **23.** Жуніна. **25.** Іларава. **28.** Мана. **29.** Бастун. **30.** Кнара. **32.** Асіюк.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

## Падарунак ад бярозы

Бяроза — дрэва ўнікальнае. Яе кару, лісце, пупышкі, сок і нават чагу — нарасты на ствале — выкарыстоўваюць для лячэння многіх хвароб. У красавіку — маі ў сухое надвор'е збіраюць бярозавы пылок, які валодае цудоўнымі ўласцівасцямі: рэгулюе работу страўніка, пазбаўляе ад запораў. Ды і па бярозавік лепш за ўсё адпраўляцца ў гэтую пару. Бярозавы сок — амаль універсальнае лякарства. Ён разбурае камяні, эфектыўны пры лячэнні язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, галаўнога болю, бранхіту, а таксама пры рэўматызме, радыкуліце, падагры і артрыце. Акрамя таго, ён ачышчае кроў і стымулюе абмен рэчываў. А нядаўна была выяўлена яшчэ адна ўнікальная асаблівасць бярозавага соку, якая парадуе мужчын. Аказваецца, гэта добры сродак ад імпатэнцыі.

Урачы сцвярджаюць, што калі выпіваць хоць бы па шклянцы бярозавіку ў дзень, то знікае санлівасць, адчуванне стомленасці і раздражняльнасці. Піць бярозавы сок лепш толькі свежым па 1 шклянцы тры разы на дзень за 20 — 30 хвілін да яды на працягу двух — трох тыдняў. Захоўваць яго ў халадзільніку можна не больш чым два дні.

УТУЛЬНЫ ДОМ

## Колеры і пахі

**Тыпавая архітэктура нашых кватэр не заўсёды дазваляе ўладкаваць сваю кухню па ўсіх правілах. Аднак недахопы можна схаваць такімі нязначнымі, на першы погляд, дробязямі, як колеравая гама і духмянае напаўненне.**

Для кухоннага інтэр'еру рэкамендуюцца пяшчотна-блакітны і бледна-зялёны колеры. Яны надаюць адчуванне свежасці і чысціні, а таксама зрокава расшыраюць прастору недастаткова вялікіх памяшканняў. Аднак, калі вы афармляеце кухню менавіта ў такіх тонах, не варта грэбаваць і цёплымі колерамі, якія таксама здольныя стварацьадчуванне ўтульнасці ў доме. Дапоўніце інтэр'ер, напрыклад, жоўтай свяцільняй ці некалькімі яркімі прадметамі, якія добра спалучаюцца.

Тым, хто хоча пахудзець, не рэкамендуецца выбіраць аранжавачырвоныя колеры для посуду і мэблі для кухні, таму што яны выклікаюць апетыт. Супрацьлеглымі ўласцівасцямі валодае фіялетавы: ён дае адчуванне сытасці, гармоніі душы і цела. А жоўты колер забяспечвае выдатную работу стрававальнай сістэмы, дадае цяпла і камфорту.

Колер посуду на кухні заслугоўвае асаблівай размовы. Адмоўцеся ад рознакаляровых талерак і кубачкаў з розных сервізаў, ад кожнага з якіх засталося па адным прадмеце. Купіце аднолькавыя адналонныя кубкі і талеркі, простыя гладкія лыжкі і відэльцы з нержавейкі. Гладкія — каб іх лягчэй было мыць, а аднатонныя — каб страката і разнастайнасць кветачак, ягадак і г. д. не надакучыла пасля тыдня выкарыстання такога посуду.

Што датычыцца паху, то памятайце першае і галоўнае правіла: ніколі на паліце на кухні. Пагадзіцеся, што чайныя цырымоніі, сямейныя бяседы і кулінарныя сакрэты ніяк не павінны асацыявацца з пахам цыгарэт.

Добра, калі на кухні заўсёды будзе пераважаць пах прыпраў, напрыклад, кардамону і базіліку, карыцы і імбіру.

А што рабіць, калі вы толькі што зварылі буракі ці пачысцілі селядзец, і з хвіліны на хвіліну да вас павінны завітаць госці? Лепш за ўсё здрабніць у кавамолцы жменю абсмажанага зерня кавы. Вытанчаны і высакародны яе пах хутка распаўсюдзіцца па кватэры і нейтралізуе астатнія пахі, палепшыць настрой. Або насыпце ваніль у разагрэтую лыжку. Гэты пах хутка створыць адчуванне хатняй утульнасці і камфорту. Але тады давядзецца хутка што-небудзь прыгатаваць да чаю, бо чым пахне, тым і частуюць гасцей.

**-2738-**

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

## Мыем цюль

**У гэтай справе таксама ёсць свае маленькія сакрэты.**

- Калі мяркуеце скарыстаць пральную машыну-аўтамат, выбірайце рэжым ручнога ці далікатнага мыцця. Адціскание рабіце на мінімальных абаротах. Арганзу і вельмі тонкі цюль лепш увогуле мыць без адціскання, а пасля мыцця дайце вадзе сцячы, развесіўшы фіранкі над ваннай ці тазікам.
- Для мыцця ў машыне актыватарнага тыпу пакладзіце цюлевыя фіранкі ў звычайную навалачку — гэта засцеражэ іх ад пашкоджання. А каб цюль не скручваўся пры мыцці ў вузел, прышыйце яго краі да навалачкі, у якой ён будзе мыцца.
- Калі вы хочаце крыху падсініць фіранкі, дадайце ў ваду раствор сінькі і малака — цюль будзе выглядаць, як новы.
- Каб выдаліць жаўцізну, замачыце цюль (перад мыццём) у падсоленай вадзе ці скарыстайце адбельвальнік (пасля мыцця). Толькі памятайце, што хлор не прыдатны для некаторых відаў тканіны.
- Пры мыцці ўручную палашчыце цюль у цёплай вадзе, бо ад гарачай ён і іншыя тонкія тканіны жаўцеюць і робяцца калянымі. Цюль не выкручвайце, а адціскайце.

КАРЫСНЫЯ ДРОБЯЗІ

## Прышчэпкі ў гаспадарцы

**Галоўнае іх прызначэнне — заціскаць і ўтрымліваць на вяроўцы бялізну. Аднак прышчэпкі здольныя на значна большае.**

- Тугую накрыўку на цюбіку можна лёгка адкруціць пры дапамозе прышчэпкі.
- Прымацуйце на сцяну ці дошку прышчэпкі — яны ператворацца ў трымальнікі малюнкаў, запісак, квітанцый.
- Каб прастрачыць на тоўстай тканіне роўнае шво, замацуйце тканіну не шпількамі, а прышчэпкамі. Гэта значна зручней.
- Пальцы застануцца цэлымі, калі, забіваючы цвік, вы будзе прытрымліваць яго прышчэпкай.
- Рамяні і гальштукі вельмі зручна захоўваць на вешалцы, а каб яны не звальваліся, замацуйце іх прышчэпкамі.
- Калі ў пакаёвай кветкі доўгая сцябліна, пастаўце апору (напрыклад, драўляную шпажку) і зафіксуйце сцябліну прышчэпкай.
- Упрыгожце дачнае акно занавескай са стужак, а каб яны віселі роўна, прымацуйце да канцоў рознакаляровыя пластмасавыя прышчэпкі.

**ДАРЭЧЫ:** драўляныя прышчэпкі ламаюцца радзей, чым пластмасавыя. А ў пластмасавых, як правіла, мацнейшы заціск.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

## Газіроўка — гэта бытавая хімія!

**Праверце самі.**

- Напой з колай выдатна змагаецца з іржой: намачыце пляму і крыху пачакайце, потым пратрыце анучкай.
- Выліце бутэльку ліманаду ва ўнітаз, праз гадзіну можаце чысціць: ўсе забруджванні лёгка адстануць.
- Пры дапамозе колы і фольгі можна адцерці храміраваны бампер машыны ад слядоў іржы. Гэтак жа чысцяць і заржавелыя балты.
- Замачыце ювелірныя ўпрыгажэнні на ноч у ліманадзе, а раніцай яны будуць проста зіхацець.
- Гэта таксама добры сродак ад накіпу ў чайніку: заліце колу, дайце пастаяць — накіп адстане.
- А яшчэ газіроўку можна выкарыстаць як плямавыводнік для адзення. Выліце бутэльку на бруднае адзенне, дадайце парашок і мыйце.

**-2739-**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.41 | 19.47 | 13.06 |
| Віцебск — | 6.29 | 19.38 | 13.09 |
| Магілёў — | 6.31 | 19.37 | 13.06 |
| Гомель — | 6.29 | 19.32 | 13.03 |
| Гродна — | 6.57 | 20.01 | 13.04 |
| Брэст — | 6.59 | 20.00 | 13.01 |

## Месяц

***Маладзік 3 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

## Імяніны

***Пр.*** *Аляксандры, Клаўдзіі, Матроны, Праскоўі, Ульяны, Фядоссі, Віктара, Івана, Мікіты, Севасцьяна, Сяргея.*

***К.*** *Мальвіны, Марыі, Уладзіслава, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## НАДВОР'Е на заўтра




## 2 красавіка

Дзве даты

**1530 год** — нарадзіўся Сымон Будны, беларускі мысліцель-гуманіст эпохі Адраджэння, рэфарматар, тэолаг, філолаг, гісторык, паэт, філосаф. З 1558 года — выкладчык і прапаведнік у кальвінісцкіх і пратэстанцкіх школах Вільні і Клецка. Разам з Л. Крышкоўскім і М. Кавячынскім заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ў 1562 годзе выдаў на беларускай мове «Катэхізіс» і «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам». Належаў да ўмеранага рэлігійна-рэфармацыйнага руху. У 1574 годзе выдаў у заснаванай ім Лоскай друкарні (каля Валожына) «Новы запавет», а таксама ўласныя сачыненні «Пра дзве існасці Хрыста», «Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры», «Аб свецкай уладзе». Асуджаў аўтарытарызм у мысленні, інтэлектуальную нецярпімасць і рэлігійны фанатызм. Быў прыхільнікам сацыяльнай гармоніі, мірнага суіснавання ўсіх саслоўяў грамадства. Быў таксама таленавітым літаратарам — пісаў на беларускай, польскай, лацінскай мовах, абгрунтаваў тэзіс аб пазнавальным значэнні мастацтва і яго маральна-выхаваўчай ролі. Памёр у 1593 годзе.

**1885 год** — нямецкі вынаходнік Готліб Даймлер атрымлівае патэнт на свой першы рухавік — у палову конскай сілы.

Цытата дня:

***«З жанчынамі спрачаюцца сэрцам, але не розумам».***

**Мэцью Арнолд (1822—1888), англійскі паэт.**

## Добрая гаспадыня цераз венік не пераступіць

**Венік — адна з рэчаў жаночага ўжытку. Таму, калі на парозе сустракалі кумоў з пахрышчаным дзіцем, а менавіта з дзяўчынкай, каля парога абавязкова ставілі венік. Венік, якім парылі нявесту, развязвалі і яго пруткамі высцілалі шлях ад лазні да хаты. Калі нявесту прывозілі ў хату да жаніха, свякроўка клала каля парога венік і назірала: падыме — добры знак, добрая гаспадыня прыехала; пераступіць і пойдзе далей — дрэнна. У некаторых рэгіёнах нявесту прасілі падмесці падлогу, а затым гэты венік упрыгожвалі стужкамі і грашыма ў знак далучэння нявесты да новай хаты. На Палессі нецнатлівай нявесце замест вясельнага дрэўца дарылі венік альбо ўтыкалі перад хатай яе бацькоў мятлу.**

- У шматлікіх зімовых варожбах выкарыстоўвалі «калядны» венік: кідалі яго на дарогу з надзеяй убачыць, адкуль прыйдзе суджаны; падкладвалі пад падушку, каб убачыць прароцкі сон, з пруткоў рабілі «калодзеж» і запрашалі суджанага выпіць вады і г.д.
- На Палессі «калядны» венік, якім мялі ў хаце ад Раства да Хрышчэння, абавязкова пасля свят замянялі на новы. Ён лічыўся небяспечным для наступных дзён. Дзяўчаты ці жанчыны рассякалі венік на парозе, прасілі даравання за ўсе грахі (звычайна, за работу, на выкананне якой была накладзена забарона падчас Каляд): «Што вязалася — развяжыся, што шылася — расшыйся, што секлася — рассячыся...». Рассечаны венік, на якім заставаліся ўсе грахі, выносілі разам са смеццем у сад да пладовых дрэў, раскідвалі па падворку альбо спальвалі.
- На Івана Купалу праводзілі абрад спальвання старых і нарыхтоўкі новых венікаў. Іх збіралі на працягу года, каб спаліць у купальскім вогнішчы.
- Венік выкарыстоўвалі і ў пахавальным абрадзе. Каб аблегчыць скон чалавеку, які памірае, венік закідвалі на дах. Усходняя славяне ў труну сцялілі галінкі і лісце ад бярозавага веніка, а таксама лісцем набівалі падушку для яго. Той венік, якім мялі падлогу адразу ж пасля вынасу труны, выкідалі разам са смеццем як мага далей ад хаты або спальвалі, а маглі аднесці на могілкі. Разам з тым, як і іншыя рэчы пахавальнага абраду, такі венік маглі выкарыстоўваць як для лячэння старых захворванняў ці сурокаў, так і для таго, каб нанесці людзям шкоду.
- «Пахавальны» венік выкарыстоўвалі на Радаўніцу ці Тройцу, калі абмятралі магілы памерлых.
- Венік у хаце заўсёды меў сваё пэўнае месца. Яго выносілі, калі ў хаце быў памерлы, і прыносілі толькі для таго, каб пасля вынасу труны ў апошні раз вымесці падлогу.

**Народная традыцыя вымагала трымаць падлогу і парог хаты чыстымі, прыбранымі. Казалі, што на ноч заўсёды неабходна падмесці хату — для таго, «каб анёлам было чыста хадзіць». Але і тут быў цэлы шэраг правілаў, якіх неабходна было прытрымлівацца.**

- Вымятаць смецце са сваёй хаты — азначае вымятаць поспех і дабрабыт са сваёй сям'і. Таму і сёння існуе звычай вымятаць смецце да парога, а потым збіраць яго і выносіць у вядры да захаду сонца.
- Ніколі не мялі падлогу, калі пяклі хлеб — хлеб не падымецца.
- Не мялі падлогу, калі з хаты хтосьці паехаў. Ва ўсходніх славян была распаўсюджана забарона месці ці мыць падлогу на працягу трох дзён з моманту ад'езду каго-небудзь з хаты (былі гэта член сям'і альбо госць).
- Не мялі падлогу на працягу таго часу, пакуль труна з нябожчыкам знаходзілася ў хаце (звычайна, на працягу трох дзён).
- Не мялі падлогу і не выносілі смецце ў вялікія царкоўныя святы і пасля захаду сонца — шчасце і поспех «змяцеш» з хаты.
- Існавала строгая забарона месці падлогу на Фядору (8 чэрвеня): той, хто будзе месці падлогу ў гэты дзень пасля захаду сонца, вымесце з хаты дамавіка і «намяце» ў сям'ю бяду.
- Калі дзяўчына неакуратна мяце падлогу, ёй наканавана будзе «выйсці замуж за работа».
- Калі мяцеш падлогу, трэба ісці следам за смеццем, інакш «вымяцеш» сябе з хаты.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1545. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12